Валерый Янковіч

# Гісторыя Пагоста

Валерый Янковіч

# Гісторыя Пагоста

Минск
"Колорград"
2018

УДК 94(476.1-22Пагост)
ББК 63.3(4Беи)
Я62

ISBN 978-985-596-141-4

© Янковіч В. А., 2018
© Афармленне. ТАА "Колорград", 2018

# Змест

Рэцэнзія ..... 4
Уступ ..... 7
1. Прадгісторыя Пагоста ..... 9
2. Беларускае мора ..... 21
3. Дарога, шлях, гасцінец ..... 39
4. Айканіміка пра сёлы Пагосчыны ..... 54
5. Радзівілы і Пагост ..... 81
6. Пагост, Пагосчына …і не толькі ..... 87
6.1. Лунін ..... 87
6.2. Сошна ..... 88
6.3. Дубнавічы ..... 92
6.4. Сташаны. ..... 94
6.5. Новы Двор. ..... 98
6.6. Пагост (Зарэчны) ..... 113
6.7. Пагост (Загародскі) ..... 121
7. Наша родная мова ..... 155
Літаратура ..... 172

# Рэцэнзія

Кніга Валерыя Янковіча прысвечана цікаваму і недастаткова даследаванаму мікрарэгіёну Беларускага Палесся – Пагосту Загародскаму і размешчаным вакол яго вёскам. Гэтыя тэрыторыі гістарычна месціліся на памежжы Новагародскага і Пінскага паветаў Вялікага Княства Літоўскага, а зараз уваходзяць у склад Пінскага раёна Брэсцкай вобласці Рэспублікі Беларусь.

Увага аўтара засяроджана, перш за ўсё, на перыядзе канца XV – XVIII стст., калі адбывалася фарміраванне сеткі населеных пунктаў у дадзеным рэгіёне. В. Янковіч падрабязна спыняецца на першых згадках і ранняй гісторыі паселішчаў мікрарэгіёну, у кнізе прадстаўлены зместава багаты матэрыял аб уладальніках гэтых вёсак, а таксама аб іх насельніцтве. Пры гэтым напачатку кнігі аўтар робіць спробу прасачыць фарміраванне мясцовага ландшафту ў далёкі пасляледавіковы перыяд. Гэта вельмі важная і безумоўна патрэбная частка даследавання, бо менавіта сфарміраваныя ў тыя старажытныя часы рэльеф і прыродныя ўмовы шмат у чым абумовілі будучыя працэсы асваення людзьмі тэрыторыі рэгіёну, пра якія ідзе гаворка ў кнізе.

Несумненным станоўчым бокам даследавання з'яўляецца шырокі абсяг вывучаных крыніц – аўтар выкарыстаў не толькі апублікаваныя звесткі пра мінулае Пагоста, Чухава, Ботава і іншых вёсак, але таксама звярнуўся да неапублікаваных

матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Асобна неабходна адзначыць, што В. Янковіч грунтоўна прапрацаваў метрычную кнігу Пагосцкай царквы за другую палову XVIII ст. Гэта самая старажытная з захаваных на цяперашні час метрычных кніг Пагосцкага прыходу. Зварот да яе дазволіў аўтару скласці пералік прозвішчаў, якія былі распаўсюджаны ў мікрарэгіёне ў той час, параўнаць іх з наяўнымі зараз. Аднак недастаткова абгрунтаванымі выглядаюць спробы аўтара вывесці большасць сялянскіх прозвішчаў жыхароў Пагосту і суседніх вёсак ад наменклатуры шляхецкіх прозвішчаў Вялікага Княства Літоўскага. Простае падабенства або нават дакладнае супадзенне прозвішчаў не з'яўляюцца доказам шляхецкага паходжання. Для дакладнага высвятлення сацыяльнага статусу пэўных мясцовых родаў патрабуюцца спецыяльныя генеалагічныя даследаванні. Можна спадзявацца, што аўтар у наступных працах падрабязней і грунтоўней акрэсліць гэтую праблематыку.

Асобны раздзел кнігі прысвечаны фарміраванню Пагоста Загародскага як населенага пункту. В. Янковіч з дапамогай шматлікіх (зрэшты, рознай ступені пераканаўчасці) доказаў абгрунтоўвае ўласную (аўтарскую) гіпотэзу часу ўзнікнення Пагосту, а таксама абставіны яго ператварэння ў мікрарэгіянальны цэнтр. Пры разглядзе дадзенага сюжэту даследчык падрабязна спыняецца на падзеях канца XVI – XVII стст., якія дазваляюць раскрыць раннюю гісторыю Пагосту, удакладніць многія дагэтуль малавядомыя яе моманты.

Неабходна адзначыць, што В. Янковіч не задавольваецца апісаннем толькі гісторыі Пагосту і бліжэйшых да яго вёсак. Ён актыўна звяртаецца да гісторыі больш аддаленых населеных пунктаў (у тым ліку Пагосту Зарэчнага, зараз размешчанага на тэрыторыі Украіны), што дазваляе істотна пашырыць гістарычна-геаграфічны кантэкст даследавання.

Яшчэ адным наяўным у кнізе тэматычным блокам з'яўляецца вывучэнне праблематыкі паходжання назваў населеных пунктаў. У некаторых выпадках (этымалогія назваў Пагост, Ботава) аўтарскія гіпотэзы выглядаюць арыгінальна і вельмі цікава, у іншых – патрабуюць большых доказаў. Тым не менш сама пастаноўка дадзенай праблемы, спробы выхаду за межы традыцыйных этымалагічных клішэ з'яўляюцца вартымі ўхвалення.

Нягледзячы на адзначаныя вышэй невялікія хібы, а таксама часам занадта рамантычны спосаб выкладання матэрыялу, кніга В. Янковіча, напісаная з вялікай любоўю і веданнем родных мясцін, з'яўляецца вельмі цікавым краязнаўчым даследаваннем, якое па-новаму раскрывае многія бакі мінулага Пагосту Загародскага і размешчаных побач населеных пунктаў.

Вядучы навуковы супрацоўнік
аддзела публікацыі дакументаў
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі,
магістр гістарычных навук
Я. С. Глінскі 04.07.2018

# Уступ

Старажытнае лацінскае выслоўе гаворыць: «Historia est magistravitae», што ў перакладзе азначае: «Гісторыя ёсць настаўніца жыцця». Асноўная задача гісторыі заключаецца ў вывучэнні мінулага, але гісторыя гэта не толькі «памяць пра тое, што было». Гісторыя – гэта спадчына, падмурак і вопыт, абапіраючыся на якія, будуецца жыццё. Агульнавядома, што які падмурак, такі і будынак. Кожны народ павінен ведаць сваю гісторыю. На вялікі жаль, мы, беларусы, на працягу доўгага часу не мелі магчымасці пісаць і вывучаць гісторыю Беларусі так, як яе бачылі і адчувалі самі жыхары нашай краіны. Доўгі час нават адсутнічала паняцце «беларуская гістарыяграфія гісторыі Беларусі». Пра нас пісалі нашыя суседзі – палякі, літоўцы = літувісы, рускія, з якімі мы па тых ці іншых прычынах пэўны час жылі ў супольных дзяржавах.

У свеце з'яўляецца натуральным, што кожны чалавек можа ацэньваць любую падзею так, як ён яе бачыць, з уласнага пункту погляду. Так і ў гісторыі – кожны народ мае права ацэньваць тое, што было раней, з пункту погляду карыснасці ці шкоднасці гэтых падзей для яго самога і яго дзяржавы.

Але менавіта па той прычыне, што наша гісторыя ўжо напісана, і не намі, яна вельмі супярэчная. Яна супярэчыць нашай гісторыі, якая толькі пішацца, і яе не кожны можа адрозніць ад ужо існуючай, не нашай гісторыі пра нас.

Над нашай гісторыяй Беларусі працуе шмат навуковых супрацоўнікаў на чале з Акадэміяй навук Беларусі, і яна паступова становіцца больш дакладнай, больш сапраўднай, больш нашай беларускай гісторыяй. А вось у гісторыі Пагоста вельмі шмат белых плямаў, шмат блытаніны і вельмі мала пісьмовых звестак, па якіх можна распазнаць і скласці сапраўдную гісторыю Пагоста. Я паспрабаваў гэта зрабіць у кніжцы. Навошта мне гэта спатрэбілася? Мы з братам Мікалаем доўга займаліся нашым радаводам і ўрэшце знайшлі свайго прашчура Мацея, ягоную жонку Ганну і іх дзяцей Івана і Агаф'ю, якія жылі ў Пагосце амаль 300 гадоў таму назад. Гэты факт пабудзіў несцярпімае жаданне пазнаць і адчуць той старажытны час, у якім жылі нашыя продкі разам з продкамі нашых сённяшніх пагасчан. Для гэтага напачатку важна было пазнаёміцца з многімі, раней невядомымі навукамі, прачытаць шмат гістарычнай навуковай літаратуры. Вялікую дапамогу ў гэтым аказалі Брэсцкая абласная бібліятэка і бібліятэка Брэсцкага Дзяржаўнага універсітэта. Неабходную кансультатыўную дапамогу, якую цяжка пераацаніць, аказаў вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, магістр гістарычных навук Глінскі Яўген Станіслававіч. У выніку нічога не заставалася, як напісаць кніжку пра гісторыю Пагоста, пра тую гісторыю, якую я адчуваю і ўяўляю. Мне падалося, што гэткая гісторыя Пагоста найбольш верагодная.

# 1. Прадгісторыя Пагоста

Больш за паўмільярда гадоў таму назад на месцы Пагоста Загародскага, Вяза, Каменя, Борак, Ботава, Чухава, Новага Двара, ды і наогул на месцы ўсёй нашай краіны Беларусі былі горы, вяршыні іх дасягалі некалькіх кіламетраў. Асвятляліся тыя вяршыні вогненнымі вулканамі, а горы скалаваліся ад пастаянных землятрусаў. Мільёнамі міналі гады. Вада і вецер рабілі сваю разрушальную справу. Горы паступова ператварыліся ў безжыццёвую пустэльню. Недзе 500 мільёнаў гадоў назад амаль уся тэрыторыя будучай Беларусі разам з Пагосцкім краем аказалася на дне мора, у якім і пачало існаваць прымітыўнае жыццё. Гэты перыяд навукоўцы назвалі **палеазойскай эрай,** ці **эрай "старажытнага жыцця"**.

Каля 225 мільёнаў гадоў таму наступіў перыяд, які называецца **мезазойскай эрай,** або **эрай "сярэдняга жыцця"**. Мора то адступала, то зноў наступала. Пагост стаў часткай трапічных лясоў, у якія засяліліся першыя жыхары: яшчары і дыназаўры, а таксама першыя птушкі і млекакормячыя – сысуны, якія нараджалі сваіх дзіцянят жывымі. На жаль, па прычыне нейкай касмічнай катастрофы, а можа, яшчэ чаго, клімат у Пагосце, ды і наогул на ўсёй нашай планеце рэзка змяніўся, і амаль усе яшчары, тагачасныя дзівосныя жывёлы і расліны беззваротна зніклі. Здарылася гэта 70 мільёнаў гадоў таму назад. Да Пагосцкага краю прыйшла **кайназойская эра,** што ў перакладзе са старажытнагрэцкай мовы

гучыць, як **эра "новага жыцця"**. Дарэчы, прыйшла гэтая эра на ўсю нашу планету Зямля і доўжыцца па цяперашні дзень. Прыкладна 45 мільёнаў гадоў таму назад мора пакінула Беларусь, клімат на нашай тэрыторыі стаў больш халодны, а мільён год таму прыйшла эпоха вялікіх зледзяненняў. Са Скандынавіі пачалі паступова насоўвацца ледавікі таўшчынёй у многія сотні метраў. (2, с. 6-7)

Прынята лічыць, што прарадзімай чалавека з'яўляецца Усходняя Афрыка і, магчыма, Паўднёвая Азія, дзе прыкладна тры мільёны гадоў таму людзі вылучыліся з жывёльнага свету. У Еўропе людзі з'явіліся значна пазней, каля аднаго мільёна гадоў назад. (3, с. 24)

На той час ледавікі пакрывалі тэрыторыю сучаснай Беларусі. Магчыма, што першыя насельнікі з'явіліся тут пасля адыходу буйнага валдайскага абледзянення ў прамежку каля 100–40 тысяч гадоў да н. э. Гэта былі так званыя *неандэртальцы*. Аднак яны ўжо маглі вырабляць з крэмню прылады працы, валодалі членападзельнай мовай, пастаянна карысталіся агнём, будавалі сховы-жытлы. Менавіта яны і рабілі спробы асвоіць абшары на ўзбярэжжы Дняпра, Сожа і Прыпяці. Пра гэта сведчаць грубаабабітыя каменныя прылады працы, знойдзеныя археолагамі каля вёсак *Абідавічы* Быхаўскага раёна і *Свяцілавічы* Веткаўскага раёна. Як лічаць вучоныя, крамянёвыя скрэблы, востраканечнікі і ручныя рубілы маглі быць зроблены менавіта *неандэртальцамі*. (4, с. 7) Але прыблізна 40 тысяч гадоў назад не-

андэртальцы з невядомай дагэтуль прычыны цалкам зніклі.

Каля 25 тысяч гадоў таму на поўдзень Беларусі прыйшлі краманьёнцы, якія сваім абліччам ужо амаль не адрозніваліся ад сучаснага чалавека. Яны пакінулі нам у якасці ўспаміну аб сваім прысутніцтве рэшткі паселішчаў-стаянак у Калінкавіцкім і Чачэрскім раёнах. Але і другая спроба першабытных людзей засяліць абшар нашай краіны завяршылася няўдачай. З поўначы працягваў няўхільна насоўвацца ледавік. 19-18 тысяч гадоў таму суцэльныя льды панавалі там, дзе цяпер стаяць гарады Гродна, Ворша. Стаянкі краманьёнцаў апусцелі, яны пакінулі свае селішчы і адышлі на поўдзень. (2, с. 10) На думку большасці даследчыкаў, зледзяненні не меней 5 разоў пакрывалі часткова або поўнасцю тэрыторыю Беларусі. У выніку дзейнасці ледавікоў фармаваўся рэльеф за кошт матэрыялаў з разбуранных горных парод, якія ён нёс з сабою і адкладваў на сваім шляху. Адначасова ўтвараліся глыбокія варонкі і пустэчы ў целе ледавіка ці ў мёрзлым грунце ў выніку раставанне лёду ў часы пацяпленняў, што прывяло да з'яўлення тысяч азёраў. Амаль да дзесяці тысяч гадоў таму назад на тэрыторыі нашай краіны быў сухі, рэзка кантынентальны, вельмі суровы клімат. Тундра-стэпавыя ландшафты, арктычныя пустыні на перадполлі ледавіка, магутная вечная мерзлата, экстрэмальная тэмпература паветра, рэзкае агульнапланетарнае зрушанне прыродных зон, паніжэнне ўзроўню Міравога акіяна на 85 метраў

ніжэй за сучасны – вось такой, безазёрнай, зусім без лесу сустракала фазу фінальнага палеаліту Беларусь, якую ўжо пакінуў ледавік, але ён быў яшчэ зусім недалёка – паўночная частка Эстоніі і Балтыйскага мора была ў яго кіпцюрах. Нягледзячы на тое, што фінальны палеаліт распачаўся 13 900-13 000 гадоў назад з нязначнага пацяплення, і на Палессі пачалі расці хваёвыя лясы, тым часам раптоўна прыйшло караткачасовае, але інтэнсіўнае пахаладанне (12 300-11 800 гадоў назад), якое прывяло да аднаўлення субарктычных умоў на поўначы Беларусі. Зноў з'явіліся бязлесыя прасторы. (6, с. 15-16) Менавіта ў гэты фінальнапалеалітычны час, каля 15 тысячагоддзяў назад, на тэрыторыі Беларусі з'явіліся качавыя плямёны паляўнічых. Прыйшлі яны з поўдня і паўднёвага захаду, нягледзячы на тое, што клімат яшчэ заставаўся суровым, і сярэднегадавыя тэмпературы былі на 2-4 градусы ніжэйшыя за сучасныя. Гэта была трэцяя і нарэшце паспяховая спроба чалавека зясяліць нашую зямлю. Для сваіх стаянак людзі таго часу выбіралі сухія месцы на карэнным беразе буйнейшых рэк – Дняпра, Нёмана, Прыпяці. У вярхоўі рэк і на водападзелы чалавек яшчэ не трапляў. Археолагамі знойдзена каля 20 паселішчаў. Такая невялікая іх колькасць тлумачыцца надзвычай слабым засяленнем тэрыторыі краіны. Гэта быў час, калі пасля доўгага перапынку чалавек толькі пачаў зноў засяляць нашыя землі, дзе існавалі яшчэ даволі суровыя прыродныя ўмовы. Адсутнасць на стаянках тоўстых культурных

напластаванняў, рэшткаў збудаванняў і невялікая колькасць знаходак сведчыць, што чалавечыя калектывы былі не толькі малалікімі, але і часта перамяшчаліся з месца на месца. Таму стаянкі былі пераважна месцамі іх кароткачасовага знаходжання. (3, с. 26, 28-29) Старажытныя людзі таго старажытнага часу адносіліся да супольнасці паляўнічых-збіральнікаў, якія на адным месцы доўга не затрымліваліся і вымушаныя былі часта перамяшчацца ўслед за міграцыямі паўночных аленяў. Асноўнымі заняткамі людзей у перыяд палеаліту і мезаліту былі паляванне і рыбалоўства. Яны нічога не выраблялі самі, а ўжывалі ў ежу тое, што давала ім прырода. Першыя госці спусташалі наваколле, і ім даводзілася пастаянна асвойваць новыя месцы жытла. Таму і жытло ў іх было прымітыўнае.

Пачынаючы з 11 800-10 800 гадоў назад прыйшоў самы цёплы час ў позналедавіковы перыяд, мезаліт, калі край ледавіка адступіў да Фінляндыі, і на нашай тэрыторыі ўсталяваўся клімат, блізкі да цяперашняга. Прыйшло пацяпленне, якое прывяло да шырокага распаўсюджання на нашай тэрыторыі лясоў. На адкрытых прасторах з'явіліся лугі са злакаў і разнатраўя. Аналіз палеанталагічных рэшткаў сведчыць пра тое, што тэмпература ліпеня была толькі на 2 градусы ніжэй за сучасную. Улетку тэмпература даходзіла да +10, а зімой дасягала –25 градусаў. Пачынаючы з 10 300-9200 гадоў назад лясное покрыва больш ніколі не знікала з нашай тэрыторыі, а паверхня Беларусі пачала набываць сучасны вы-

гляд. У мезалітычны час адбылося спусканне вады Прыпяці праз "перапілаваную" Мазырскую граду, і Прыпяць пацякла на поўдзень – поўдзень – усход да Дняпра. (6, с. 16, 17)

Нарэшце першыя людзі прыйшлі і да будучага Пагосцкага краю. Да ліку буйнейшых помнікаў мезаліту не толькі Палесся, але і ўсёй лесапаласы Усходняй Еўропы можа быць прылічана паселішча Новы Двор-I. Чаму менавіта да Новага Двара завіталі першыя прышэльцы? Верагодней усяго, справа ўся ў крэмені, які ў вялікай колькасці і патрэбнай якасці быў знойдзены тут. На месцы паселішча знаходзілася майстэрня па вырабу тагачасных прылад з мноствам нарыхтовак. (1, с. 27-28)

У перыяд мезаліту, то бок 9-5 тыс. гадоў да н. э., чалавек прыручыў сабаку. Галоўным вынаходніцтвам у гэты час становіцца першае механічнае прыстасаванне – лук і стрэлы. У час мезаліту людзі пачалі вырабляць так званыя *мікраліты* – дробныя дэталі састаўных прылад працы, зробленыя з крэменю. Мікраліты звычайна ўстаўляліся ў пазы касцяных ці рагавых апраў, у дрэўкі стрэл і наканечнікі дзідаў, складалі лёзы кінжалаў, шыпы гарпуноў. (4, с. 11) Для рыбнай лоўлі выкарыстоўваецца тагачаснае вынаходніцтва – кручок. Мужчыны хадзілі на паляванне, лавілі рыбу, выраблялі асноўныя прылады. Жаночымі заняткамі былі выраб посуду, прыгатаванне ежы і догляд дзяцей. Калі мужчына браў шлюб, ён пераходзіў у жончыну супольню. Шлюбныя адносіны на той час былі, мякка кажучы, не зусім упарад-

каваныя, і роднасць можна было вызначыць толькі па жаночай лініі. Жанчыны захоўвалі звычаі і традыцыі роду і таму лічыліся ў родзе галоўнымі. Гэткі перыяд гісторыі чалавецтва называецца матрыярхатам. (2, с. 11)

Каля шасці тысячагоддзяў назад у Беларусі пачаўся заключны этап каменнага веку – неаліт, новы каменны век, ён настаў ва ўмовах надзвычайна спрыяльнага клімату. Сярэднегадавая тэмпература была на 1,5-2 градусы вышэй за сучасную, ды і ападкаў выпадала значна больш. Цяпло і вільгаць спрыялі бурнаму развіццю расліннасці. Цяплей за ўсё было на Палессі. Тут амаль паўсюдна раслі грабавыя лясы і дубровы. Прырода давала жыхарам Пагосцкага краю дастатковую колькасць дзічыны, рыбы і дзікарослай раслінай ежы, і каля Каменя стварыўся так называемы племянны цэнтр з некалькіх родавых паселішчаў – Камень-II. Таўшчыня напластаванняў з рэшткамі жызнядзейнасці старажытных людзей тут дасягала 0,5 м і больш, знойдзены шматлікія крамянёвыя вырабы і больш за 1000 адзінак фрагментаў керамікі. Побач з гэтым базавым асяродкам жыхарства знаходзіліся невялікія стаянкі-выселкі. Камень-II на той час выконваў ролю сталіцы пагосцкага краю. Важным вынаходніцтвам чалавека ў перыяд неаліту стаў выраб глінянага посуду, у якім захоўваліся зерне, арэхі, ягады, мёд. Стала магчымым гатаваць ежу на вогнішчы. Стабільнасць харчавання спрыяла павелічэнню працягласці жыцця людзей і росту насельніцтва. Усё гэта дало вучоным падста-

вы характарызаваць гэты перыяд як "неалітычную рэвалюцыю". Напрыканцы неаліта старажытныя продкі Палесся пачалі займацца земляробствам і жывёлагадоўляй. (3, с. 34-41)

Пра ўсё гэта навукоўцы даведаліся пры паступовым асвойванні новых метадаў вывучэння матэрыяльнай культуры розных эпох, запазычаных у дакладных і прыродазнаўчых навук (радыёвугляродны аналіз, хімічны і спектральны аналіз металу, дэндрахраналагічнае датаванне і інш.). Выкарыстоўваліся і вынікі даследаванняў у такіх спецыяльных навуках, як астэалогія, палеагеаграфія, палеабатаніка і палеазаалогія, гідраніміка і тапаніміка, антрапалогія. (6, с. 5) Рэчавы матэрыял помнікаў старажытнага часу набываўся і назапашваўся непасрэдна раскопкамі. У некаторых раскопках прымалі ўдзел і мы, яшчэ падлеткі сямідзесятых. Для нас гэта было не проста цікава, тут мы атрымлівалі свой першы заробак памерам 2 рублі і 20 капеек штодзень. Знойдзенныя артэфакты пацвярджаюць факт таго, што ў наваколлі Пагоста, Каменя, Вяза, Ботава, Чухава і Новага Двара жылі першыя людзі ў розныя перыяды каменнага веку. На жаль, на месцы Пагоста ў той час панавала Пагосцкае возера, бераг якога і даходзіў да тых паселішчаў-стаянак. А гэта месцамі тры-чатыры кіламетры ад берага возера тых жа сямідзесятых гадоў. На час заканчэння каменнага веку, то бок тры-чатыры тысячы гадоў таму назад, Пагост мог вітаць нашых продкаў толькі гойданнем галінамі дрэў, што маглі расці на тым месцы, дзе стаіць сёння царква. Сведчаннем таму, што

гэта магло быць менавіта так, даследаванні археолага В. Ф. Ісаенкі, які быў кіраўніком праводзімых раскопак помнікаў каменнага веку ў нашым наваколлі. Дарэчы, ён заўважыў, што ў трэцім, завяршальным перыядзе каменнага веку – неаліце – артэфакты яго *пачатку* знаходзіліся на глыбіні да паўметра ніжэй артэфактаў *канца* неаліту, а паміж імі быў слой пяску з ракавінамі уніа. Помнікі ж *сярэдняга* часу неаліта знаходзіліся значна далей і на ўзгорках вышынёй да пяці метраў. Акрамя таго, яны, сярэдненеалітычныя помнікі, не змешваліся з помнікамі ранняга і позняга часу завяршальнага перыяду каменнага веку, то бок неаліту. Гэта сведчыць аб тым, што **каля чатырох тысяч год таму,** менавіта ў *сярэдні* час неаліту, узровень вады ў Пагосцкім возеры павышаўся да двух і болей метраў і заставаўся такім больш тысячы гадоў, "паглынуўшы" тым самым першыя паселішчы нашых продкаў на доўгі час. Вярнуўся бераг да бліжэйшай стаянкі, гэта значыць да двух кіламетраў ад Пагоста, недзе за 1700 гадоў да ражства Хрыстова. (1, с. 19-20) Менавіта ў гэты ***сярэдненеалітычны*** час **Пагосцкае возера** ў другі раз аб'ядналася з рэчкай Бобрык і з усімі азёрамі і рэкамі Палесся на чале з Прыпяццю, і тым самым усе разам яны **ператварыліся ў вялікае возера.** Першае такое аб'яднанне адбылося ў час мезаліту, то бок 9 тысяч гадоў таму назад. Менавіта тады гэткае аб'яднанне дапамагло Прыпяці "перапілаваць" Мазырскую граду, што каля Юравіч, і назаўсёды злучыцца з Дняпром, каб усю ваду з Палесся перапраўляць у Чорнае мора і падвы-

шаць тым самым узровень Міравога акіяну да сучаснага. Пагосцкае возера змагло аб'яднацца і ў трэці раз з Прыпяццю разам з усімі яе прытокамі і іншымі вадаёмамі. Яно зноўку ператварылася ў вялікае возера: ад Пінску да Мозыру. Адбылося гэта 2500 гадоў назад. (6, с. 20) Якраз у той час, калі жыў Герадот, які і напісаў у сваёй кніжцы "Мельпамена" пра Беларусь, пра нашых тагачасных жыхароў будзінаў і неўраў і пра наша вялізнае возера, якое назавуць потым морам Герадота.

За чатыры тысячы гадоў да нашага часу жыхары Беларусі навучыліся выплаўляць медзь і бронзу. Гэта азначала канец каменнага веку. Але меднай руды ў нетрах нашай зямлі не было, і таму металёвых вырабаў таго часу археолагі сустракаюць няшмат. З медзі і бронзы рабілі пераважна ўпрыгожванні, зрэзні дзідаў, нажы, сярпы. Тагачаснае земляробства, якім займаліся напачатку і нашыя продкі, называюць лядным. Каб падрыхтаваць зямлю для сяўбы, рабілі ляда: абсякалі кару з дрэў пэўнага кавалка лесу, давалі дрэвам высахнуць, а потым іх спальвалі.

Агонь знішчаў пустазелле, попел угнойваў зямлю, зямля некалькі гадоў давала досыць вялікі ўраджай. Цяпер галоўная доля ў родавай суполцы перайшла да мужчын. Яны выконвалі самую цяжкую працу. Па мужской лініі пачалі весці радавод. Матрыярхат саступіў месца патрыярхату.

Шэсцьсот-семсот гадоў да нараджэння Хрыстова плямёны, што насялялі нашую зямлю, навучыліся здабываць і апрацоўваць жалеза. Для жыхароў

тагачаснай Беларусі наступіў жалезны век. З дапамогаю жалеза лягчэй было апрацоўваць дрэва, рэзаць па косці, рабіць ліцейныя формы і ганчарны круг, калаўрот і ткацкі станок. Ад ляднага земляробства людзі пераходзілі да ворнага. Яны сеялі жыта, пшаніцу, ячмень, проса, лён, боб і гарох. А вось смаку бульбы не ведалі. Бульба з'явіцца ў Беларусі яшчэ вельмі няскора – толькі ў першай палове XVIII стагоддзя. (2, с. 13)

На вялікі жаль, на тэрыторыі Пагоста Загародскага не знойдзена ніводнага археалагічнага помніка перыяда ад бронзавага веку да позняга сярэднявечча. Адсутнічаюць таксама і пісьмовыя звесткі пра існаванне на гэтым месцы якога-небудзь жытла, акрамя Новага Двара. У геаграфічным нарысе зямлі крывічаў і дрыгавічаў М. В. Даўнар-Запольскі ("бацька" Беларускай гісторыяграфіі) адзначае: "Вялізныя залежы торфа нам уласна ўдалося бачыць на ўсёй прасторы паўночнай часткі Пінскага ўезду: у Целеханскай воласці, каля возера Выганашча, у Пагосцкай, каля возера Пагоста, сяла Парахонска; у Дабраслаўскай воласці…" (20, с. 12).

Торф – гэта гаручы карысны выкапень. Утвараецца ў працэсе натуральнага адмірання і няпоўнага распаду раслін ва ўмовах недахопу кісларoду і залішняга ўвільгатнення. Торф назапашваецца ў балоце вельмі павольна. Тарфяныя залежы павялічваюць сваю таўшчыню на 0,5-1 мм у год. *Балота* – гэта непамерна ўвільгатнённыя ўчасткі зямной паверхні. Вада ў іх не цячэ, а застойваецца. Торф – тоўшча на-

палову разлажыўшыхся астанкаў вільгацелюбівых раслін.

Балоты ўзнікаюць пры зарастанні азёр. Спачатку на дно берагоў возера абсоўваюцца пясок, гліна, глей, прынесеныя рэкамі і ручаямі. Паступова яны запаўняюць азёрныя катлавіны. Возера мялее, і яго памеры памяншаюцца. На водмелях вырастаюць трыснёг, асака. Пасля расліны распаўсюджваюцца амаль на ўсё возера. Калі яны адміраюць, іх рэшткі адкладаюцца на дне. З часам яны назапашваюцца, ушчыльняюцца і ператвараюцца ў торф. Так на месцы возера з›яўляецца балота. Улічваючы наяўнасць такіх фактаў як:

- месцазнаходжанне берага возера ва ўсе перыяды неаліта далёка за межамі Пагоста, што надоўга рабіла яго востравам сярод воднай гладзі возера, затым сярод балота;
- вялікія залежы торфу вакол возера;
- поўная адсутнасць артэфактаў існавання жыцця да позняга сярэднявечча;

можна зрабіць вывад: ад бронзавага веку да сярэдзіны другога тысячагоддзя ад ражства Хрыстова вакол месца, дзе знаходзіцца цяперашні Пагост Загародскі, панавала пагосцкае возера, якое некалі ўваходзіла ў склад Беларускага мора, ці мора Герадота, і затым Сармацкага возера. А калі вада сышла, то будучы Пагост з усіх бакоў, акрамя паўночнага, абступалі балоты на доўгія часы.

## 2. Беларускае мора

*Ад рэчкі Вісліцы да Пагосцкага возера,*
*ад Пагосцкага возера да мора Геродота…*

Няма такой мапы нашай краіны Беларусі, на якой бы мы змаглі адшукаць гэткае мора. Аднак яно сапраўды было, і ўпершыню напісаў пра яго старажытны грэчаскі вучоны Геродот, прызваны бацькам гісторыі. Ён жыў амаль 2500 гадоў таму і напісаў дзевяць кніг пра тагачасныя краіны. Чацвёртая, пад назвай "Мельпамена", з'яўляецца самай ранняй пісьмовай крыніцай ведаў пра гісторыю і геаграфію Беларусі. У пачатку кніжкі, апісваючы землі скіфаў (сучасныя украінскія і расійскія тэрыторыі), Геродот адзначыў, што сам ён не быў у тых краінах, што знаходзяцца далей, на поўначы, і ўпэўнены, што там не быў ні адзін з яго сучаснікаў, распавядаўшых яму пра іх. Тым не менш ён бярэцца апісаць паўночныя землі як мага больш дакладна і грунтоўна, перадаць пра ўсё тое, што было яму вядома па чутках пра тыя далёкія і незнаёмыя краіны. (9, п. 16)

У кніжцы Геродот распавёў пра прыроду і людзей, якія жылі тады, і адзначыў, што на той тэрыторыі, дзе цяпер Пінскае Палессе, знаходзілася на той час вялікае возера, і жылі там плямёны неўраў і будзінаў, а далей на поўнач – андрафагаў.

Неўры – гэта скіфскае племя, якое было выгнана са сваіх зямель варожымі прышэльцамі (у кніжцы – змяіным нашэсцем). Неўры былі вымушаныя

пакінуць сваі землі і пасяліцца сярод будзінаў. Пра неўраў хадзілі чуткі, што яны нібыта чарадзеі. Кожны чалавек з іх племені штогод на некалькі дзён ператвараецца ў ваўка, а затым зноўку прымае чалавечае аблічча. (9, п. 105)

Абарыгены Палесся – будзіны. Гэта вялікае і шматлікае племя качэўнікаў, якія маюць блакітныя вочы, а валасы ў іх рыжыя, і ўсе яны ў вяснушках. На зямлі будзінаў ёсць драўляны горад, а імя гораду Гелон. Кожны бок высокай драўлянай сцяны таго гораду меў даўжыню болей шасці кіламетраў. З дрэва пабудаваныя таксама хаты і свяцілішчы элінскіх багоў са статуямі і алтарамі. Зямля ў будзінаў уся зарошчана лясамі. У самай галоўнай пушчы знаходзіцца вялікае і шматводнае возера, а вакол яго сток вод, парослых трыснягом. (9, п.108-109) Гісторыкі ўмоўна называюць гэтае возера морам Геродота, Сармацкім возерам, або Беларускім морам. А вучоны Эдуард Іванавіч Эйхвальд сцвярджаў, што значная частка басейна Прыпяці была некалі пакрыта вялізным возерам, і па многім наяўным прызнакам злучалася яно з Балтыйскім і Чорным марамі. Нездарма паміж жыхарамі Пінскага наваколля захавалася аж да XIX стагоддзя паданне аб існаванні на Палессі мора, і што на яго былым дне знаходзілі якары і астанкі караблёў. Пра гэта ў 1864 годзе пісаў у кніжцы "Материалы для географии и статистики России..." падпалкоўнік генеральнага штабу І. Зеленскій. (35, с. 165) Так што нашыя продкі палешукі, якія ў сваю чаргу былі продкамі старажытных будзінаў і

неўраў, як сапраўдныя паморы, здзяйснялі рачныя падарожжы ў Данцыг, Кёнігсберг і Крамянчуг.

Упершыню мора Геродота размясціў на мапе арабскі географ Аль-Ідрысі ў 1154 годзе. Мапа Ідрысі вельмі недакладная і не адпавядае прапорцыям геаграфічных аб'ектаў, але даследчыкі лічаць, што возера Тэрмі (на мапе "buhaire termi") менавіта і ёсць тое знакамітае мора Геродота, пасярэдзіне якога абазначана Мазырскае ўзвышша. (49)

На мапах французскага манаха Себасцяна Мюнстэра ад 1544 года (7, с. 160-161), венецыянца Джакома Гастальдзі ад 1568 года (7, с. 170) і фламандскага картографа Герарда Меркатара ад 1572 года (7, с. 188) рысавалася вялізнае возера, і называлася тады яно Сармацкім. На поўначы ад гэтага вадаёма знаходзіўся Ваўкавыск, на поўдні Пінск, на ўсходзе Слуцк, а на захадзе Шэрэшова.

На мапе 1613 года Мікалая-Крыштафа Радзівіла (Сіроткі), якая стала буйнейшым дасягненнем айчыннай навукі і лічыцца адным з самых значных беларускіх гістарычных і культурных помнікаў позняга сярэднявечча, мы бачым ужо падковападобнае балота, а ў сярэдзіне – мястэчка Бяроза, Лагішын, Лунін, Кажан-Гарадок, Моталь і горад Пінск. Пагост, што стаіць на рацэ Стыр, на мапе таксама ёсць, а месца, дзе павінен быць маёнтак Пагост (цяпер Пагост Загародскі) разам з Каменем і іншымі сёламі, заняла вялікая балотная пляма. (2, с. 120-121) На час выдання мапы Пагост ужо існаваў, але па прычыне таго, што ён не належыў роду заказчыка і фундата-

ра мапы, а можа, па прычыне яшчэ недастатковай значымасці гэтага маёнтка на мапе ён не абазначаны. Прычына магла быць яшчэ такая, што маёнткі Пагост, Бобрык, Лунін і Хатынічы ў 1613 годзе аспрэчваліся ў судзе Зоф'яй і Кацярынай, роднымі сёстрамі памерлага Юрыя Мікалаевіча Радзівіла, які, не маючы нашчадкаў, запісаў усю маёмасць стрыечным братам Янушу і Крыштафу, а не сваім родным сёстрам. Сёстры не пагадзіліся з тым і падалі скаргу ў суд. З выраку суда Кацярына Гарайская атрымала маенткі на карысць сваіх сыноў Пятра і Крыштафа. (30, с. 338, 339) Менавіта гэты факт мог стаць прычынай таго, што маёнтак Пагост і возера Пагосцкае не абазначаны на мапе Сіроткі, сына Радзівіла Чорнага. Планы Радзівілаў па стварэнню самага кароткага гандлёвага шляху Новагарадок – Мозыр праз землі і маёнткі Радзівілаў засталіся не здзейсненымі ў выніку страты маёнткаў Пагост і Лунін, дзеля чаго, магчыма і было створана ў 1539 годзе сяло Пагост, а затым быў набыты Лунін, якія ляжалі на шляху Дабраслаўка – Камень – Лунін праз Багданаўку.

Факт наяўнасці мора ў Беларусі, няхай сабе даўно ўжо і зніклага, інтрыгуе ўсіх беларусаў. Вельмі хочацца зазірнуць у той час ці хаця б у тую мапу, каб уявіць былыя яго памеры. Сучасныя даследчыкі рэканструявалі выгляд Герадотава мора з дапамогай спадарожнікавых тапаграфічных здымкаў Зямлі. Такую рэканструкцыю прапанаваў мазыранін Дзяніс Бабаеў, які на тапаграфічным здымку Палесся за-

поўніў нізіны віртуальнай вадою да адзнакі 135 метраў над узроўнем мора. У выніку атрымаўся вадаём ад Пінску да Мозыру і Бабаеў, назваў яго Палескім морам. (21) Узроўні вышынь паказалі межы гэтага возера з мноствам вастравоў вакол яго, на адным з якіх размясціўся і будучы Пагост Загародскі. Але ўзнікае пытанне, чаму старажытны Тураў, які ўпершыню ўзгаданы ў 980 годзе, "патануў" у гэтым вадаёме? Прычын таму можа быць дзве – мора рэканструявана тэхналагічна памылкова, і другая прычына – першапачаткова Тураў мог быць заснаваны ў другім, больш высокім месцы, а пасля землятрусу ў 1230 годзе быў нанова пабудаваны ў цяперашнім месцы.

Каб больш дакладна ўявіць працэс утварэння, існавання і знікнення Беларускага мора, аднаго з буйнейшых азёр Еўропы, звернемся да даследаванняў навукоўцаў. Яны лічаць, што 13 тысяч гадоў таму назад, у час фінальнага палеаліту быў яшчэ сухі, рэзка кантынентальны клімат. Вакол Палесся, як і па ўсёй тагачаснай Беларусі панавалі тундра-стэпавыя ландшафты, арктычныя пустыні, экстрэмальныя тэмпературы паветра і паніжэнне ўзроўню Сусветнага акіяна на 85 м ніжэй за сучасны, поўная адсутнасць азёр. Толькі пасля пачаўшагася нязначнага пацяплення на тэрыторыі Беларусі пачаў раставаць ледавік. Але менш чым праз тысячу гадоў зноўку прыйшло пахаладанне, і ледавік "вярнуўся". Толькі з прыходам мезаліту, то бок 11 тысяч гадоў таму назад, на ўсёй будучай Беларусі паступова пачаў адбы-

вацца пераход ад арктычных і субарктычных умоў да ўмеранага цёплага клімату, што ў выніку прывяло да інтэнсіўнага раставання ледавіка, які напоўніў рэкі і створаныя тым жа ледавіком азёры вадою. (6, с. 15, 16) Рака Прыпяць на той час яшчэ не была ракою, яна была вялізнаю катлавінаю, якая пачыналася ад Пінску і доўжылася да Мазыру, маючы ўхіл да 60 метраў. (5, с. 61) На ўсходзе Прыпяцкая катлавіна заканчвалася Мазырскай градою. Менавіта ў гэтую катлавіну і панеслі ледавіковую ваду рэкі і рачулкі будучага Палесся. Сярод тых рэк была і рака Бобрык, у якую ўпадала рэчка Вісліца. Пагосцкага возера тады таксама яшчэ не было. Тым часам вада ўсё прыбывала і напаўняла катлавіну будучай ракі Прыпяці. Паўночныя, паўднёвыя і заходнія берагі катлавіны ўжо разліліся, паглынуўшы лясы, азёры, рэкі – усё тое, што мела ўзровень менш 135 метраў. Менавіта такі мінімальны ўзровень мае Мазырская града, якой нарэшце дасягнула вада Палесся і "перапілавала" яе, каб адбылося спусканне той вады ў Дняпро, а затым у Чорнае мора. (6, с. 16, 17) У гэты час створанае ледавіком Беларускае мора было самым вялікім і глыбокім за час свайго існавання. Яго глыбіня каля Мазыра дасягала 50 метраў. Менавіта тады ўзровень паверхні вады быў аднолькавы як каля Пінску, так і каля Мазыра, што бывае ў сапраўднага возера ці мора. З таго часу, калі вада Беларускага мора пайшла ў Дняпро, ўтварылася рака Прыпяць, а Беларускае, Сармацкае, Палескае возера, ці мора Герадота, як яго цяпер называюць, стала

паступова зменшвацца і больш ніколі ўжо не змагло дасягнуць тых памераў. Напрыканцы мезаліту, то бок 8 тысяч гадоў таму назад, ледавіковая вада праз Прыпяць і Дняпро была перапраўлена ў Чорнае мора. Тым самым адбылося значнае паніжэнне ўзроўню ўсіх вадаёмаў і ўсталяваўся даволі сухі клімат, што вельмі спрыяла ўтварэнню і фарміраванню тарфянікаў, паколькі вялікія тэрыторыі Палесся і ў тым ліку будучай Пагосчыны каля пяці тысяч гадоў знаходзіліся пад вадою разлітых рэк і створаных азёр. (6, с. 17) Такім чынам, новы каменны век, неаліт, які прыйшоў у Беларусь у канцы 5-га тысячагоддзя да н. э., распачаўся са значнага паніжэння ўзроўню вады ў вадаёмах і надзвычай спрыяльнага клімату для развіцця расліннасці. Бясконцыя лясы з разнастайным відавым складам дрэў, балоты і незлічоныя вадаёмы давалі тагачаснаму насельніцтву дастатковую колькасць дзічыны і рыбы, тым самым не было падстаў адыходзіць ад высокарэнтабельнай прысвойвальнай гаспадаркі. (6, с. 124) Але ўжо напачатку 4-га тысячагоддзя да н. э. у час сярэдняга неаліту значны ўздым узроўню вады прымусіў насельніцтва ўладкоўваць свае паселішчы на больш высокіх месцах. Вярнуліся людзі на ранейшыя стаянкі-паселішчы толькі ў час позняга неаліту, то бок у другой палове 3-га тысячагоддзя да н. э. А за гэты час паміж помнікамі ранняга і позняга неаліту ўтварылася праслойка пяску з ракавінамі уніа. (1, с. 19, 20) На гэты факт звярнуў увагу археолаг В. Ф. Ісаенка, праводзячы раскопкі вакол Пагосцкага возе-

ра, у прыватнасці пры даследаванні самай вялікай старажытнай стаянкі Камень-2 і сярэдненеалітычнай стаянкі Камень-3, якая знаходзілася ад першай на адлегласці 200 метраў і на ўзвышшы 5-7 метраў. Менавіта мяжа тых старажытных стаянак-пасяленняў і з'яўлялася берагам Пагосцкага возера таго часу. Слой пяску ўперамешку з ракавінамі уніа мог з'явіцца над помнікамі ранняга неаліту толькі на дне возера-мора ў час сярэдняга неаліту, калі бераг возера паглынуў усе ранненеалітычныя стаянкі разам з суседнімі рэкамі. Некалькі больш, чым праз тысячу гадоў, ужо ў познім неаліце, то бок прыкладна чатыры тысячы гадоў таму, бераг мора зноўку вярнуўся на сваё колішняе месца, і новыя пакаленні тых жа плямён прыйшлі на месцы былых стаянак у наваколле Пагоста. У нашым выпадку да стаянкі Камень-2. Менавіта гэты гістарычны факт другога вялікага ўздыму ўзроўня вады стаў адраджэннем Беларускага мора. Заходняя частка гэтага мора нічым не адрознівалася як памерам, так і глыбінёй ад мора мезалітычнага часу, то бок ад мора, якое было 10-11 тысяч гадоў таму назад. Але ўсходняя яго частка была ўжо зусім іншай. Яна адрознівалася як памерам, так і глыбінёй. Справа ў тым, што цяпер гэта быў ужо вадаём на аснове вялікай ракі Прыпяці, якая праз Дняпро мела выхад у акіян, а значыць, узровень вышынь паверхні вады прыблізна ад 135 метраў, што каля Пінску зменшваўся да нуля, які меў Дняпро пры ўпаданні ў Чорнае мора. Амаль гэткую ж вышыню ўзроўню вады, як і Прыпяць,

каля Пінску мела і Пагосцкае возера, бо яно было часткаю Беларускага мора разам з рэчкамі Вісліца і Бобрык, таксама з Прыпяццю. А адбывалася тое другое вялікае ўзвадненне амаль шэсць тысяч гадоў таму назад і доўжылася больш за тысячу гадоў.

Ну а цяпер самы час паразважаць пра старажытны Тураў і Беларускае мора.

Мазыранін Дзяніс Бабаеў прапанаваў сваю рэканструкцыю Палескага мора. Ён на тапаграфічным здымку Палесся запоўніў нізіны віртуальнай вадою да адзнакі 135 метраў над узроўнем мора і ў выніку атрымаў вадаём ад Пінску да Мозыру. (50) Атрыманы вадаём – нішто іншае, як старажытнае Беларускае мора мезалітычнага часу, калі ракі Прыпяць яшчэ не было, а замест яе была Прыпяцкая катлавіна. Тую рэканструкцыю Палескага мора ўмоўна можна назваць мапай старажытнага Палесся, і вельмі цікавая яна тым, што прыблізна адлюстроўвае вынік першага вялікага ўзваднення на Беларусі, якое адбылося амаль адзінаццаць тысяч гадоў таму назад. Усяго ў каменным веку было тры вялікіх узвадненні. Другое адбылося ў сярэдненеалітычны час (каля шасці тысяч гадоў таму назад) і трэццяе ў час позняга неаліту, то бок 2500 гадоў таму. Мапу Палесся пасля другога і трэццяга ўзвадненняў зрабіць сёння наўрад ці магчыма, але для паўночна-заходняй яе часткі карыстацца можна прапанаванай. Справа ў тым, што яшчэ ў час першагага ўзваднення на тэрыторыі Палесся сфармаваліся тарфяныя балоты, а ў іх, як вядома, вада не бяжыць, а стаіць. У выніку

ўзровень вышынь у такіх мясцовасцях затрымліваецца даволі надоўга, калі тым часам адбываецца сезоннае папаўненне вады. Дык вось, згодна мапы Бабаева, месца, дзе павінен быць Тураў, займае Палескае мора. Так і павінна быць, таму што ўзровень вышынь мясцовасці, дзе зараз стаіць Тураў, 120-125 м, а ўзровень паверхні Палескага мора пасля першага ўзваднення быў 135 м. Выходзіць, што над Туравам у той час аказалася глыбіня ў 10 метраў. Пасля другога і трэццяга ўзвадненняў усё адбывалася інакш. Рака Прыпяць ужо сфармавала сваё русла, і ўзроўні вышынь паверхні вады ў рацэ па меры прыбліжэння да Дняпра зменшваліся, і які быў узровень вады каля Турава, невядома, але Тураў мае вельмі вялікі шанец апынуцца ў моры Геродота на пачатку свайго існавання. Узровень вады ў Прыпяці каля Турава ў момант заснавання, то бок у 980 годзе, павінен быць на метры тры больш, чым цяпер. Доказ таму той факт, што ў сярэдзіне XIX стагоддзя ўзровень вады ў Прыпяці каля Пінску быў 132,83 м. (35, с. 110) У канцы таго ж стагоддзя гэтая лічба была 132,6 м (20, с. 8), а цяпер – 132 метры. (36) Узровень вады прыблізна за 200 гадоў панізіўся на метр. Умоўны падлік паказвае, што за 1000 гадоў узровень вады ў Прыпяці каля Пінску мог быць на 5 метраў вышэй сягонняшняга, а гэта азначае, што каля Турава гэтая лічба магла быць не менш трох метраў. Адсюль можна зрабіць дапушчэнне, што у 980 годзе на месцы, дзе зараз знаходзіцца Тураў, павінна быць вада. Самае высокае месца ў Тураве – 128 метраў –

толькі там, дзе знойдзены каменны крыж і іконкі святых. Самая нізкая – 120 метраў – знаходзіцца акурат пасярэдзіне. У дзесяці кіламетрах ад Турава на узвышшы ў 133-134 м над узроўнем мора знаходзіцца сяло Чарцянка. (36) Археолагамі знойдзена два старажытных гарадзішча ў двух кіламетрах ад гэтага сяла ў Тураўскім напрамку. Менавіта гэтыя гарадзішчы і маглі быць тым старажытным горадам да 1230 года, у якім і мог адбыцца землятрус, дарэчы, тое ўзвышша ад Чарцянкі цягнецца ў бок Мікашэвіч, і месцамі яно значна вышэйшае, і верагоднасць адбыцця там землятрусу значна большая, чым у такім нізкім месцы, дзе зараз стаіць Тураў. Пасля землятрусу напалоханыя тураўцы маглі назаўсёды пакінуць зруйнаваны горад і прыйсці бліжэй да ракі на цяперашняе месца. Дарэчы, менавіта тыя гарадзішчы маглі быць старажытным драўляным горадам Гелон, аб якім пісаў Герадот.

Трэцяе адраджэнне Беларускага мора было ў апошні субатлантычны перыяд, які пачаўся прыкладна 2500 гадоў назад, і характарызуецца зніжэннем тэмпературы і павелічэннем вільготнасці, што пацягнула за сабой павышэнне ўзроўню вадаёмаў. (6, с. 19) Адам Кіркор у трэцім томе “Живописной России” (1882 г.) адзначыў: “Тысячелетия отделяют нас от той эпохи, когда вся долина Припяти, или так называемое Пинское Полесье, было тоже залито водою, – морем Геродота, страною вод и туманов, как её называет Дарий Гистасп в своём походе на скифов.

(Дарий I был царём Персии в 522-486 гг. до н. э. Поход в земли скифов (в северное Причерноморье и выше по Днепру) он совершил в 514 году до н. э. Вот когда наши земли были «страною вод и туманов».) (5, с. 62)

А пачыналася ўсё 11 тысяч гадоў таму назад з нязначнага пацяплення, якое змагло растапіць ледавік таўшчынёй у сотні метраў, што пакрываў Беларусь, і пачаў адбывацца пераход ад арктычных і субарктычных умоў да ўмераннага цёплага клімату. Ад інтэнсіўнага раставання ледавіка рэкі сталі напоўняцца яго вадою. Напоўнілася і Вісліца, што ўпадае ў раку Бобрык, якая ў сваю чаргу ўпадае ў Прыпяць. Але Бобрык не змог прыняць усю ваду Вісліцы, і яна выйшла са сваіх барагоў і разлілася. У выніку атрымалася Пагосцкае возера, якое хутка паглынула раку Бобрык і пайшло ўшыр да Прыпяці, якая таксама разлілася і ў сваю чаргу пачала паглынаць рачулкі, рэчкі, што ўпадалі ў яе, азёры , лясы – усе, што ніжэй за ўзровень яе воднай гладзі…

Гіпатэтычна можна сказаць, што **ўсё пачалося з рэчкі Вісліцы і Пагосцкага возера…**

Напачатку Вісліца стварыла Пагосцкае возера, якое бліжэй усяго знаходзілася да ледавіка, і менавіта з яго пачало стварацца Беларускае мора. Паўночныя берагі Пагосцкага берага – нішто іншае, як паўночны бераг таго старажытнага Беларускага мора. Пагосцкае возера не паспела ўтварыцца, як адразу ператварылася ў Беларускае мора, пражыўшае тры ўзвадненні, і больш як шэсць тысяч гадоў

гэтае мора чакала свайго Герадота. І ён "прыйшоў", здзяйсняючы свае віртуальныя вандроўкі на поўнач ад Скіфіі, антычнай дзяржавы, што існавала на тэрыторыі сучаснай Украіны і поўдня Расіі, "прыйшоў" па Дняпру (тагачаснаму Барысфену), а потым па моры, у якое ператварылася Пагосцкае возера, "прыйшоў" у нашу тагачасную Беларусь, каб напісаць сваю чацвёртую кніжку "Мельпамена". І распавесці ў кніжцы пра пра нас і нашае вялікае возера, якое потым назавуць морам Герадота.

Мора нашае ўнікальна тым, што ўтварылася яно ад раставання ледавіка. Шкада, але мора ўзнікла дзеля таго, каб знікнуць. Сапраўдныя вадаёмы існуюць за кошт рэк, якія іх стварылі і ў іх упадаюць. А наша возера-мора ледавіковае, то бок вялікая лужа, якая "часова" затрымалася пасля раставання ледавіка. Самым паўнаводным і глыбокім мора было ў час мезаліту, у момант стварэння. Ад той пары Беларускае мора паступова знікала. Аб гэтым сведчаць мапы ад Мюнстэра, які назваў Беларускае мора Сармацкім возерам, да Радзівіла (Сіроткі), дзе замест мора мы ўжо бачым вялікае балота з мноствам вастравоў. Здзіўляе толькі тое, што яшчэ ў 1544, 1568 і ў 1572 гадах на еўрапейскіх мапах існавала Сармацкае возера памерам ад Ваўкавыску да Пінску і ад Слуцку да Шэрэшова. І раптам у 1613 годзе на мапе Радзівіла замест возера сістэма балот. Чаму так хутка знікла мора? Анатоль Тарас адказвае на гэтае пытанне так: "А потому, что XVII век был очень жарким и сухим, частые засухи вызывали повсюду в Ев-

ропе голод и лесные пожары. …озеро постепенно мелело. В обмелённых частях оно превращалось в болота, а затем высыхали и болота. Налицо явная тенденция исчезновения болот без всякой мелиорации.” (5, с. 63)

Можна з высокай верагоднасцю дапусціць, што Панцілееўскае балота, якое ляжала на захадзе Новага Двара, Вязкае балота, якое цягнулася ад Вяза да Дубнавіч (8, с. 70, 71), яшчэ ў XVI стогоддзі былі часткай Пагосцкага возера, якое ў сваю чаргу і было тым Сармацкім возерам, што абазначана на мапах Мюнстэра, Гастальдзі і Меркатора. За дванаццаць з паловай тысяч гадоў, ад мезаліту да позняга сярэднявечча, Беларускае мора ад мора Герадота (Тэрмі, Сармацкага) паступова зменшылася да Пагосцкага возера, тым самым вярнулася да свайго першапачатковага выгляду. Цяжка паверыць, але Пагосцкае возера некалі было памерам ад Пінску да Мозыра, і яно памятае нашых продкаў з каменнага веку, памятае цара Персіі Дарыя I, які, будучы ў нашай краіне, назваў яе “краінай вод і туманаў”. Пагосцкае возера добра памятае многіх грэчаскіх і іншых вандроўнікаў, якія распавялі Герадоту пра нас, пра нашу дзівосную краіну і пра нашае возера – вялікае, як мора, і неверагодна прыгожае, з балотамі і лясамі, з незвычайнымі звярамі с чатырохвугольнай мордай, якіх мы называем ласямі, з выдрамі і бабрамі (9, п. 109) і яшчэ з многім такім, чаго няма нідзе.

Пры ўважлівым разгляданні возера на мапе 1970 года нельга не заўважыць, што Пагосцкае возера

гэта насамрэч разлітая рэчка Вісліца, якая праз сваю пратоку ўпадае ў рэчку Бобрык. У час фінальнага палеаліту, гадоў, можа, тысяч 12 таму, нашага возера не было. Не было і балот. Была толькі маленькая рэчка Вісліца, што проста ўпадала ў рэчку Бобрык. І хто ведае, калі б возера не ператварылі ў вадасховішча, направіўшы праз яго раку Бобрык, то на месцы вадасховішча была б цяпер рэчка Вісліца з балоцістымі берагамі, а яшчэ праз нейкі час балоты высахлі б, і Вісліца стала б, як раней у старажытнасці, проста мелкаводнай рэчкай… Так здарылася з Прыпяццю, Пінай, Ясельдай і іншымі рэкамі, якія некалі разліліся, аб'ядналіся і сталі вялікім Беларускім возерам-морам. Цяпер яны проста беларускія рэкі.

Адгалоскі з'явы вяртання мора Герадота назіралі многія пакаленні пагасчан. Добра памятаем гэтую з'яву і мы, пагастчане шасцідзесятых і сямідзесятых. Штогод мы з захапленнем назіралі, як веснавыя разлівы рабілі Пагост маленькім востравам. У час крыгаходу ўсе, хто мог, ішлі да маленькага маста. Сюды, як і на вялікі мост, вада цягнула з возера крыгі ільда рознага памеру, каб скінуць іх у раку Бобрык. Напачатку вельмі павольна крыгі набліжаліся, чапляліся адна за адну, за берагі. Усе жадалі, каб якая-небудзь крыга хутчэй трапіла ў плынь і панеслася да назіральнікаў, потым з трэскам і шумам вады ламалася аб слупы маленькага мосціка, хутка выскоквала з-пад яго, а потым зноўку павольна рухалася ў бок рэчкі Бобрык, то бок Качанухі. Пры гэтым проста

назіральнікаў амаль не было. Тут усе станавіліся "балельшчыкымі захапляльнага матча", назва якому – крыгаход. Усім хацелася падпіхнуць крыгу, хто махаў рукамі, а хто нагамі, і кожны што-небудзь крычаў. Абавязкова з'яўляліся адважныя, каторыя бралі ў рукі жэрдкі і з берагу падпіхвалі, накіроўвалі крыгі ў плынь. Былі такія, хто падплываў на лодцы і рэгуляваў сплавам пад супярэчлівыя парады "сходу назіральнікаў". А былі і надта адважныя, каторыя залазілі на вялікую крыгу і разам з ёй ад возера, здалёк, сплаўляліся да мосціка. Вось тут накал даходзіў да кульмінацыі. Хто раіў хутчэй сыходзіць, каб не трапіць з крыгай пад мост, а хто крычаў пачакаць, падплысці бліжэй. У выніку бывала ўсякае. Хто-небудзь абавязкова трапляў у ваду, і для яго прыгожы спектакль заканчваўся.

Пасля крыгаходу, на наступны дзень, вакол Пагоста мы бачылі востраў Свірнішчы, востраў "могілкі» ды вёску Камень. Слупы варот на футбольным полі напалову стаялі ў вадзе. Сенакосных лугоў не было зусім, а на іх месцы – вада, якая неўзабаве пакрывалася зялёным дываном, а яшчэ праз некаторы час, у красавіку, з зялёнага ён паступова ператвараўся ў жоўты. Так цвіла лотаць. І не заўжды ў Барэцкі і Пінскі накірункі магчыма было выехаць з Пагоста ў першыя два-тры тыдні пасля бурнага прыходу вясны. Калі павадак здараўся не па календары, то заняткі ў школе спыняліся. Гэта ўжо напрыканцы сямідзесятых з'явіўся ў Пагосце дарожны ўчастак, які ўзначальваў Багатка «Вялікі». Ён і пабудаваў нам насып-

ныя дарогі, замашчоныя брукам, якія вытрымлівалі веснавыя разлівы. Потым возера ператварылі ў вадасховішча, у якое праз канал направілі раку Бобрык і такім чынам канчаткова ліквідавалі наступствы веснавога павадка. Так што калі адматаць назад гадоў 500, то рэшткі мора тут былі ў самым разгары, вось толькі ці былі Пагост, Чухава, Ботава, Вяз?

Першыя людзі, якія жылі вакол Пагосцкага возера, пакінулі нам помнікі таго часу, ад мезаліту да позняга неаліту і нават бронзавага веку. Але помнікі не былі непасрэдна на тым месцы, дзе зараз знаходзяцца сёлы, за выключэннем Каменя. Толькі ў Камені на ўскрайку сяла знойдзены артэфакты стаянкі каменнага веку. Што тычыццца Пагоста і іншых сёл, то ў лепшым выпадку ў той старажытны час яны маглі быць вастравамі ці наогул пакрытымі вадою. Першым пасяленнем на ўзбярэжжы возера стаў Новы Двор, у якім ад мезалітычнай стаянкі Новы Двор-1 да цяперашняга часу ў тым жа сяле Новы Двор жывуць людзі. Доказам таму грамата каралевы Боны (25, с. 273), у якой гаворыцца пра чатыры дворышчы ў Новым Двары, якія атрымаў баярын Анцушко ад Вітаўта ў годы яго княжання з 1392 па 1430. Сяло Камень таксама магло існаваць ад неалітычнай пары каменнага веку нават толькі па той прычыне, што ў тыя старажытныя часы каля Каменя існаваў нібыта племянны цэнтр з некалькіх родавых паселішчаў, дзе ў спрыяльных тапаграфічных умовах пражывала вялікая колькасць жыхароў. (3, с. 41)

А вось Чухава, Ботава, Пагост з'явіліся толькі ў 1539 годзе, а затым значна пазней Боркі і Вяз.

Тое, што на Палессі і на тэрыторыі летапіснай Літвы, то бок Літвы Міндоўга, пастаянна жылі людзі на працягу апошніх 12 тысяч гадоў, ні ў кога сумневу не вызывае. Вось толькі трэба памірыцца з тым, што Ботава, Чухава і Пагост узніклі не раней першай паловы шаснаццатага стагодзя. Зрабіць такія вывады дапаможа паразуменне ўсіх абставін таго часу, якія спрыялі ўзнікненню гэтых сёл менавіта ў той момант, а не раней. А для гэтага трэба ўважліва пазнаёміцца з усімі, нават выпадковымі пісьмовымі крыніцамі таго гістарычнага перыяду.

## 3. Дарога, шлях, гасцінец

**Дарога** – гэта *паласа зямлі, прыстасаваная для язды і хадзьбы.* (13, с. 308) Дарога – вельмі старажытнае геаграфічнае паняцце, а існавала яна яшчэ задоўга да з'яўлення чалавека на зямлі. Звярыныя сцежкі і былі напачатку першабытнымі дарогамі.

Нашыя продкі з далёкага палеаліту прыйшлі да Беларусі амаль 15 тысяч гадоў таму. Прыйшлі ўслед за паўночнымі аленямі, па іх сцежках-дарогах. Магчыма, праходзілі яны і праз наш Палескі край, але не затрымаліся, бо клімат тут быў, мягка кажучы, суровым. Яшчэ толькі пачалося адступанне апошняга ледавіка з тэрыторыі Беларусі. (3, с. 26) Навукоўцы лічаць першых прышэльцаў паляўнічымі і збіральнікамі, а гэта значыць, што яны павінны былі знішчаць наваколле сваёй стаянкі, а затым ісці ўслед за паўночнымі аленямі на поўнач, да самага Валдая. І толькі каля адзінаццаці тысячагоддзяў назад (3, с. 29) да Пагосцкага возера прыйшлі людзі, каб пасяліцца надоўга, а можа, і назаўжды, заснаваўшы пры гэтым мезалітычную стаянку Новы Двор-1, якую потым яны, навукоўцы, прылічаць да ліку буйнейшых помнікаў мезаліту не толькі Палесся, але і ўсёй лесапаласы Усходняй Еўропы. (1, с. 27-28) І толькі 6 тысячагоддзяў назад, калі да Пагосцкага края прыйшла неалітычная рэвалюцыя, застаўшыяся плямёны прыстасаваліся да нашага края. Яны сяліліся на ўзгорках, недалёка ад будучых вёсак Новы Двор, Вяз, Чухава, Ботава, Пагоста і асабліва Каменя, вакол

якога знойдзена шэсць тагачасных стаянак, якія падпарадкоўваліся галоўнай – Камень-2, – сталіцы тагачаснай Пагосчыны, на працягу не аднаго тысячагоддзя, нягледзячы на тое, што стаянка Новы Двор-1 узнікла самай першай на нашай зямлі. У гаспадарчым жыцці галоўная роля на той час належала мужчыне-паляўнічаму, але на чале роду першапачаткова стаяла жанчына, паколькі пры тых неўпарадкаваных шлюбных адносінах роднасць можна было вызначыць толькі па жаночай лініі. Гэты перыяд у развіцці грамадства атрымаў назву *матрыярхат*. Унутры роду існавала *экзагамія* – жорсткая забарона шлюбных сувязяў паміж членамі роду. (4., с. 10) Адсочвалі гэткія традыцыі старэйшыя жанчыны, ахоўніцы роду. Вось і даводзілася маладым юнакам пракладваць сцежкі ў суседнія суполкі, каб спадабацца там якой-небудзь дзяўчыне, якая потым магла пабрацца з хлапцом шлюбам, забраўшы яго ў сваё "сяло". А куды дзенешся – матрыярхат. Гэтыя сцежкі ад адной стаянкі да другой з часам ператвараліся ў дарогі. Дарогамі станавіліся не толькі сцежкі для стасункаў з суседзямі, але і ўваходы ў лес, куды людзі пастаянна хадзілі за галлём і дрэвамі для вогнішча, за ягадамі і грыбамі, арэхамі і мёдам. Дарогі неўзабаве з'яўляліся ўздоўж берага возера да месц, дзе было зручна лавіць рыбу і рваць трыснёг як для будавання страхі жытла, так і для ўсталявання матрацаў для ложкаў. Усе гэтыя дарогі ніхто не рабіў наўмысна. Дарогі з'яўляліся быццам самі па сабе. Пратаптываліся яны ў тым накірунку, куды людзі

хадзілі часцей усяго, і былі кароткімі як па даўжыні, так і па часу існавання. Калі па іх пераставалі хадзіць, то яны знікалі. Чатыры тысячы год таму чалавек прыручыў каня, і патрэба ў дарогах стала такая, што іх пачалі патроху абсталёўваць, асабліва пасля таго, як было вынайдзена кола, услед за якім з'явіўся і першы воз. Але ўсё роўна дарогі пракладваліся па найлягчэйшаму накірунку, усе перашкоды абыходзіліся. Такія дарогі існавалі ад каменнага веку да ранняга сярэднявечча, то бок да першай паловы IX стагоддзя, калі пачалі ўтварацца княствы. (4, с. 30) З гэтага часу будаваліся гарады, і тады ўжо пачалі будаваць мясцовыя дарогі. Але дарогі па даўжыні былі ў той перыяд яшчэ вельмі кароткімі, а на вялікую адлегласць яны нават не пракладваліся, і гаварыць аб нейкіх уладкаваных пастаянных дарогах нельга. Тым не менш першыя старажытныя летапісы распавядаюць аб сухапутных перамяшчэннях: "уцекача Святаполка Уладзіміравіча з Кіева ў Брэст, з Брэста да Пінску на Слуцк у 1116 годзе ішлі войскі менскага князя Глеба, на Ізяслаўль у 1128 годзе войскі Вячаслава з Турава і Вячаслава з Клецку, у 1158 г., 1160 г. – кааліцыі князёў на Тураў і Пінск. Напрамкі гэтых паходаў сведчаць аб тым, што на тэрыторыі Тураўскага княства сухапутныя дарогі дазвалялі перамяшчэнні як у напрамку з захаду на ўсход, так і з поўдня на поўнач". (10, с. 85)

Прырода не дала чалавеку дарог, яна наадварот стварыла многа перашкод для перамяшчэння па сушы. Але яна дала чалавеку водныя прасторы.

Моры і рэчкі, з аднаго боку, таксама з'яўляліся сур'ёзнымі перашкодамі для перамяшчэння, але гэта адначасова і цудоўныя прыродныя дарогі-шляхі. Па такіх водных дарогах можна было здзяйсняць межканты-нентальныя падарожжы. Першыя сухапутныя шляхі ствараліся па берагах рэк альбо на пераходах ад адной рэчкі да другой, тым самым абміналіся перашкоды на рэках, напрыклад, парогі. Такія пераходы называліся волакамі, бо даводзілася перацягваць па сушы як лодкі, так і ўсё, што ў іх было. (11, с. 6) Выкарыстоўванне рэк разам з сухапутнымі пераходамі-волакамі паспрыяла стварэнню вялікіх гандлёвых шляхоў, якія адыгралі рашаючую ролю ў стварэнні нашых першых гарадоў, удзельных княстваў, а таксама ў фарміраванні Вялікага княства Літоўскага, і далі моцны штуршок эканамічнаму развіццю нашай маладой еўрапейскай дзяржавы. Дарэчы, не толькі вялікія гарады ствараліся і станавіліся дзяржаваўтваральнымі дзякуючы гандлёвым шляхам, такія як Полацк, Новагародак, але і многія сёлы абавязаны сваім з'яўленнем і нават назвамі менавіта дарогам. Прыкладам можа быць сяло, якое потым стала мястэчкам Падарозск (па дарозе).

**Шлях** – гэта *прастора, на якой адбываецца перамяшчэнне некага, нечага.* (15, с. 349)

Першы, самы старажытны гандлёвы шлях, па якім у антычнасці з Прыбалтыкі ў Міжземнамор'е пастаўляўся бурштын, быў бурштынавы шлях. Упершыню яго ўзгадвае ўжо добра вядомы нам Герадот. Дзейнічаў жа шлях значна раней, яшчэ ў часы

праўлення фараона Тутанхамона, аб чым сведчаць вырабы з балтыйскага бурштыну, якія былі знойдзены ў яго грабніцы. Вядома, што ў раннім сярэднявеччы, то бок VI–IX стагоддзі, гэты шлях праходзіў па цэнтральнаеўрапейскім землям. Ён пачынаўся ад Пруссіі, па плыні Вісты перасякаў Дунай, праходзіў па тэрыторыі цяперашняй Чэхіі, Славакіі, Аўстрыі і Славеніі, а канчаўся ў Аквілеі.

Вядомы таксама старажытны вялікі шаўковы шлях. Ён узнік у другім стагоддзі да н. э. па ініцыятыве кітайцаў, якія шукалі пародзістых коней для свайго войска. З Кітая шоўк, фарфор і іншы тавар караваннай дарогай пастаўляўся ў краіны Пярэдняй і Сярэдняй Азіі. Ён адыграў значную ролю ў развіцці эканамічных і культурных сувязей народаў Блізкага Ўсходу і Кітая.

З археалагічных даследаванняў вядома, што тэрыторыя нашай краіны яшчэ з II стагоддзя была цэнтрам гандлёвых шляхоў, доказам таму рымскія срэбраныя манеты, знойдзеныя супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАНБ. Праз старажытную Беларусь праходзіў вялікі гандлёвы шлях "з варагаў у грэкі". Рэкі Заходняя Дзвіна і Дняпро злучалі паміж сабой Балтыйскае мора і Чорнае. На берагах Балтыйскага мора жылі продкі сучасных шведаў, нарвежцаў, датчан – варагі, ці інакш – вікінгі. Іх ужо ў VIII-IX стагоддзях добра ведалі народы Еўропы па знакамітым бурштынавым шляху. Менавіта яны, варагі, пабудавалі апорны пункт (град) недалёка ад старажытнага пасялення, якое існавала яшчэ з

V стагоддзя на правым беразе ракі Палаты. Такім чынам варажскі Полацк стаў цэнтрам збору даніны. (5, с.74) Займаючы на гэтай важнай воднай магістралі фактычна цэнтральнае месца, Полацк з умацаванага паселішча хутка ператварыўся ў моцны транзітны і гандлёвы цэнтр. Заходняя Дзвіна ў той час уваходзіла ў Полацкае княства і з'яўлялася часткай шляху, па якім ішоў міжнародны гандаль Візантыі і Арабскага халіфата з усходнеславянскімі княствамі і скандынаўскімі краінамі. Шлях праходзіў праз Няву, Волхаў, Ловаць, Заходнюю Дзвіну да Дняпра. (4, с. 30) Полацкае княства знаходзілася паміж двума іншымі дзяржаўнымі ўтварэннямі ўсходніх славян – Кіеўскім і Наўгародскім княствамі. Кожнае з гэтых княстваў імкнулася заключыць саюз з Полацкам, каб разам мець эканамічную і ваенную перавагу ў рэгіёне. Вядома, што ў 907 г. Полацк быў саюзнікам Кіева, а полацкая дружына прымала ўдзел у паходзе кіеўскага князя Алега на сталіцу Візантыі – Канстанцінопаль (Царград). Паход скончыўся перамогай Кіева, а Канстанцінопаль вымушаны быў плаціць даніну і Полацку. (4, с. 30)

У канцы XII ст. на ўсходнеславянскіх землях рэзка зменшылася эканамічнае значэнне гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі». Нізоўі Дняпра апанавалі качэўнікі, і гандаль паміж краінамі Балтыйскага і Міжземнага мораў пачаў ажыццяўляцца вакол Еўропы, што атрымлівалася хутчэй і танней, чым з выкарыстаннем шляху «з варагаў у грэкі» з яго маруднай і складанай працэдурай волакаў, і ён саступіў месца

Прыпяцка-Бужскаму і Заходне-Двінскаму накірункам. (12, с. 37) У той жа час па шэрагу прычын страчвае сваю былую магутнасць Полацкае княства. Гэта заняпад гандлёвага шляху і страта на карысць крыжакоў выхаду ў Балтыйскае мора.

Ёсць навукоўцы, якія мяркуюць, што вялікі гандлёвы шлях наогул быў і сухапутны. У першым томе Вялікага гістарычнага атласа Беларусі такі шлях абазначаны. Са Стамбула праз княства Малдова да Камянца, Кіева, затым Мазыр, Новагародак і Вільня. Потым Рыга і праз Балтыйскае мора Стакгольм, а з Вільні праз Полацк, ці Пскоў – Вялікі Ноўгарад. (7, с. 79) На Расійскай мапе Беларусі другой паловы XIX стагоддзя гэты шлях прасочваецца праз паштовыя, а месцамі шашэйныя дарогі, якія праходзілі праз Мазыр, Новагародак і Вільню. Толькі ў тую мапу закраліся дзьве памылкі. Так, з Луніна дарога нібыта ідзе на Хатынічы, уздоўж усходняга берага ракі Бобрык. З таго боку ракі наогул ніколі не было такой дарогі, і няма яе нават цяпер. Акрамя таго, на мапе рэчка Бобрык праходзіць праз Пагост, які стаіць на беразе возера, быццам рэчка сутыкаецца з возерам, што не адпавядае сапраўднасці. З Луніна на Хатынічы можна было трапіць у тыя часы толькі праз Багданаўку, Камень, Пагост, Чухава, Дабраслаўку і Бобрык. Такая грунтовая дарога II разраду, то бок шырынёй ад 5,5 да 11 метраў, існавала на стан 1857 года. Па ёй праходзіў паштовы маршрут (ямская гоньба) ад м. Петрыкава ўздоўж р. Прыпяці, праз Ленін, м. Пагост да станцыі Лышча. (35, с. 300)

А гэта менавіта і магла быць частка таго гандлёвага шляху, які абазначаны на мапе ў Вялікім гістарычным атласе Беларусі. Дарэчы, пра частку гэтай дарогі пішацца ў пісцовай кнізе ад 1561-1566 гг., як пра "...идущую из Пинска через это село *(Каўняцін)* на Литву..." (22, с. 307) Пра гэтую ж дарогу пішацца ў прывілеі, дадзеным Хведару Крывіцкаму на сяло Масевічы, дзе ўстанаўліваюцца яму і ягоным людзям ўваходы ў пушчу: "...черезъ госцинец Виленский, за Логишиномъ и по село Ковнятинское". (25, с. 115) Дарога з Пінска праз Лагішын, Дабраслаўку, Хатынічы, Новагародак і Ліду на Вільню – нішто іншае, як гасцінец Віленскі на Літву.

Сухапутны гандлёвы шлях мог існаваць ужо з канца X – першай паловы XI стагоддзя. Менавіта з гэтага часу і ўзнікла пасяленне, як сведчыць першы Сафійскі летапіс пра "Новогородок". (16, с. 6) Напачатку гэта быў пасад, дзе жылі рамеснікі і таргоўцы. Рамеснікі выплаўлялі і апрацоўвалі жалеза, медзь, каштоўныя металы. Яны займаліся таксама ганчарствам, разьбой па дрэву і косці. У горадзе жылі свае ювеліры. Купцы актыўна гандлявалі з суседзямі – Польшчай, Галіцка-Валынскім і Кіяўскім княствамі, таксама з Рыгай, Швецыяй, гарадамі Нямеччыны, далёкай Візантыяй, Блізкім Усходам. На падставе высокага ўзроўню развіцця зямляробства, рамёстваў і гандлю багацелі мясцовыя феадалы, аб чым сведчаць раскопкі іх пахаванняў. У 1044 годзе пасад захапілі ваяры кіеўскага князя Яраслава Мудрага, сына Рагнеды Рагвалодаўны і Уладзіміра Святаславі-

ча. Яны пабудавалі дзядзінец (умацаванне), які і стаў Наваградкам – так на мясцовым дыялекце называлі горад нашыя продкі. У летапісах ён вядомы, як " Новогород, Новгородок, Новый городок". (18, с. 357) У XII-XIII стст. адбыўся хуткі эканамічны росквіт Новагародка. Асновай эканамічнай магутнасці Новагародчыны сталі развітое земляробства і рамяство, а таксама актыўны гандаль. Па Нёмане новагародскія купцы траплялі ў Балтыйскае мора і далей – у гарады Паўночнай і Заходняй Еўропы. Праз развітую сістэму волакаў можна было трапіць у Днепр і Заходнюю Дзвіну, а адтуль адпаведна ў Чорнае і Балтыйскае моры. Пра шырокія гандлёвыя сувязі Новагародскай зямлі сведчаць знаходкі на яе тэрыторыі скарбаў з арабскімі, візантыйскімі і заходнееўрапейскімі манетамі. Узвышэнне Новагародка ў значнай ступені было абумоўлена геапалітычным становішчам – ён размяшчаўся ў пэўнай адлегласці ад асноўных маршрутаў крыжацкіх захопаў і мангола-татарскіх набегаў. Гэта спрыяла прытоку на Новагародчыну славянскага насельніцтва з больш небяспечных тэрыторый і, як следства, узнікненню і ўмацаванню гарадоў (Слоніма, Ваўкавыска, Свіслачы, Зэльвы і інш.). Новагародак стаў цэнтрам новага дзяржаваўтваральнага працэсу, у выніку якога з'явілася адна з самых буйных дзяржаў тагачаснай Еўропы – Вялікае княства Літоўскае. У 1253 годзе першы Вялікі князь, стваральнік ВКЛ, каранаваўся ў Новагародку. Вільня стала сталіцай дзяржавы толькі ў 1323 годзе, а праз дзесяць гадоў Літва

дасягнула такой моцы і росквіту, што стала, бадай што, самай магутнай еўрапейскай дзяржавай. Новагародак жа на працягу ўсяго існавання ВКЛ, то бок 550 гадоў, быў важнай адміністратыўнай адзінкай. Напачатку гэта было Новагародцкае княства, затым, з 1507 года, Новагародцкае ваяводства. (16, с. 7)

У савакупнасці ўсе гэтыя абставіны спрыялі бурнаму развіццю гандлёвых шляхоў праз Новагарадок на ўсе напрамкі свету. Гэта на ўсход – Смаленск, Масква. На захад – Гародня, Люблін, Вроцлаў, Еўропа. На поўнач – Вільня, Рыга, Стакгольм. І паўднёвы напрамак, які стаў сухапутным шляхам замест зніклага "з варагаў у грэкі" – Мозыр, Кіеў, Стамбул, Бліжні Ўсход. У сваю чаргу росквіт гандлю стаў нагодай будаўніцтва дыхтоўных, то бок дабраякасных **гасцінцаў** з развітой інфраструктурай. (11, с. 11, 12)

**Гасцінец** – гэта *вялікая праезджая дарога.* (14, с.112.)

Самае распаўсюджаннае значэнне слова гасцінец у сучаснай беларускай, расійскай ды і ва ўкраінскай мове – гэта нейкая рэч, ласункі, якія прывозяць блізкія людзі ў якасці падарунка, часцей за ўсё дзецям. У такіх выпадках гавораць, што прывезлі ці перадалі гасцінец альбо гасцінчык. Другое значэнне слова гасцінец больш ранняга часу ў беларускай, украінскай, таксама іншых еўрапейскіх мовах гэта бальшак – вялікая дарога, шырокі і ўезджаны шлях, уздоўж якога пасаджаны дрэвы (ліпа, клён ці дубы) і прароблены канавы. Гасцінцы будавалі для руху коннага транспарту, і злучалі яны вялікія гарады,

суседнія землі, дзяржавы. Ад іншых мясцовых дарог гасцінцы адрозніваліся шырынёй, "...каб два воза форманскіх размінулася...", такія патрабаванні прадпісваў Статут Вялікага княства Літоўскага ад 1566 года. (19, с. 523, 524) Акрамя таго, уздоўж гасцінцаў месціліся будынкі, прызначанныя для падарожных людзей, гэта кузні, заездныя дамы з памяшканнямі, корчмы, мытні і іншыя. Пры гасцінцах павінны былі быць цесляры, кавалі, слесары, каладзеі, бандары, рыбаловы, грабары, і ўсе гэтыя рамеснікі былі на вольнай валоцы, то бок без усялякіх павіннасцяў. (26, с. 88) Непасрэдна за стан дарожных камунікацый адказваў уласнік ці трымальнік уладання. Самі работы па ўпарадкаванню дарог клаліся на падданых уладання. Для забеспячэння добрага тэхнічнага стану і абслугоўвання мастоў і дарог шырока практыкаваўся збор маставога мыта. Гэтая сістэма дазваляла мець сродкі на дарогі ў залежнасці ад інтэнсіўнасці выкарыстання саміх дарог. (17, с. 86) Мець гасінец на сваёй зямлі вельмі клопатна, асабліва на Палессі. Масты, гаці даводзілася не толькі рамантаваць, але і будаваць занава амаль кожны год. Каб уявіць, якім быў наш край у мінулым, нават не надта даўнім, працытую 1853 год з кніжкі "Материалы для географии и статистики России... Часть I, И. Зеленский": "...при малолюдности Полесского края здесь дорог весьма мало, да и те состоят из бесконечного ряда полуразвалившихся мостов и гатей, пересекающих непроходимые и топкие болота. Трудно себе представить и описать все те затруд-

нения, которые испытывает здесь проезжающий в весеннее и осеннее время. От необозримых разливов рек и болот дороги местами совершенно покрываются водою, а местами делаются топкими, гати размываются, мосты разрушаются и нередко уносятся на далёкие расстояния, так что направление дорог узнаётся только по прогалинам в лесах или обозначается вехами. Вследствие этого на просёлочных дорогах проезд совершенно прекращается на два и даже на три месяца, а на военно- коммуникационных (гасцінцах) он сопряжён с величайшими затруднениями и даже опасностью". (35, с. 275) Дарэчы, раней узгаданы паштовы маршрут, што ад м. Петрыкава праз Пагост (маецца на ўвазе Загародскі) да ст. Лышчы, быў даўжынёю 233 км і меў 47 мастоў і 83 гаці. (35, с. 300) Тым не менш, уласнікам было вельмі выгадна, каб праз іх уладанні праходзіў гасцінец, а яшчэ лепш вялікі гандлёвы шлях. І справа не толькі ў тым, каб збіраць маставое ці іншае мыта. Справа ў тым, што па гасцінцах праязджаюць купцы, якія прыйшлі ў нашую краіну не толькі прадаць свой тавар, але і купіць на адваротнай дарозе нашыя збожжа, мёд, воск і іншыя тавары. Купцам выгадна купіць тавар менавіта пры дарозе таму, што меншыя траты за правоз тавара, ды і сам тавар танней можна купіць не ў купцоў, а ў гаспадароў тавара, напрыклад, у сялян, якія маглі прадаваць сваё збожжа па гасцінцах. Наколькі гэта выгадна як гаспадарам зямлі, так і іх падданым, відавочна. Так, ва ўставах на валокі ад 1557 года ўказана, што

з адной валокі зямлі плата аўсом – адна бочка ці 5 грошай, а за яе адвоз за 20 міль таксама 5 грошай. (26, с. 75) Грашыма аддаваць у два разы танней. Вось і выходзіць, што гасцінец быў патрэбны не толькі як добрая дарога, але і для гандлю. Добра разумеў і звяртаў на гэта ўвагу і кароль. Так, у 1557 годзе ва ўставах упраўлення каралеўскіх воласцей кароль, маючы на ўвазе продаж збожжа, патрабуе, каб тарговыя бочкі аднаго памеру памячаліся кляймом і былі ў тарговых месцах, у дварах і гумнах, у сёлах і **на ўсіх гасцінцах.** (26, с. 77)

У старажытным часе *гасцінец* – гэта дарога, шлях, па якім рухаліся падарожнікі – купцы з чужаземных краін, са сваім таварам. Дарэчы, тэрмін *гасцінец* паходзіць ад стараславянскага слова *госць*. З самых старадаўніх часоў госць – гэта вораг, які прыходзіў рабаваць, і толькі потым госць – гэта купец. У старажытныя часы ў Кіеве, таксама ў нашай дзяржаве ВКЛ, у Польскім і ў Чэшскім каралеўствах купцоў так і называлі – госці ці гасцебнікі, якія гасцілі, то бок гандлявалі ў розных краінах. А гасцінцам называлі дарогу, па якой прыязджалі госці, то бок купцы. Менавіта купцы і пракладвалі гандлёвыя шляхі, калі ніякіх абсталяваных дарог яшчэ наогул не было. Самы старажытны шлях "з варагаў у грэкі" – асноўны міжнародны гандлёвы шлях, які праз Кіеў злучаў Скандынавію, Рыгу, Полацк з Візантыяй. Упершыню аб гэтым шляху ўспамінаецца ў "Аповесці мінулых гадоў". Там апісваецца ён як водны шлях, а пэўныя часткі шляху былі абавязкова суха-

путныя, якія купцы павінны былі пераадольваць волакам з чоўнамі, нагружанымі таварам. Жыццё і дзейнасць купцоў былі звязаныя з рызыкай і небяспекай, таму ў Вялікім княстве Літоўскім асоба і маёмасць госця (тутэйшага ці іншаземнага) былі пад аховай Статута, і ўсякая крыўда ці шкода, нанесеная яму тубыльцамі (мясцовымі жыхарамі), выклікала прымяненне да вінаватых пэўных мер. Такую ж адказнасць за процівапраўныя ўчынкі і злачынствы супраць тубыльцаў Статут таксама прадугледжваў і у адносінах да госця. (19, с. 595, 596) Як дарогі, так і шляхі і гасцінцы выконвалі важную ролю ў развіцці населенных пунктаў, якія ахвотна размяшчаліся паабапал іх, і часцяком назвы гэтых сёл паходзілі ўласна ад *дарог, шляхоў* ці *гасцінцаў*. Так, у Мінскай вобласці ёсць райцэнтр **Старыя Дарогі**, а ў ім сяло **Падарэссе**. (7, с. 206, 226) У Віцебскай вобласці знаходзіцца сяло **Дарожкавічы**, а ў Ваўкавыскім раёне існуе сяло, былое мястэчка **Падароск**. (7, с. 206) На Міншчыне ёсць сёлы **Путнікі** і **Путчына**, таксама **Пуцілава** і **Пуцілкавічы** на Віцебшчыне. (7, с. 230) У Талочынскім раёне ёсць сяло **Гастынічы**, а ў Лагойскім **Гасцілавічы**. (7, с. 203) У суседняй Польшчы **Гасціцын** (48, с. 465), **Госціна** (48, с. 497), **Госцін** (48, с. 507).

Відавочна, што назвы гэтых населенных пунктаў паходзяць ад слоў *дарога, шлях (пуць), гасцінец*. Менавіта *гасцінец* стаў як прычынай утварэння, так і назваю сяла Пагост, а *шлях* – сяла Багданаўка. Падрабязней аб тым, як утвараліся назвы сёл, мястэчак і



гарадоў у нашай краіне, разгледзім у артыкуле “Айканіміка”. Там паспрабуем даведацца, што азначаюць назвы Пагост, Ботава, Чухава, Багданаўка і іншыя сёлы.





## 4. Айканіміка пра сёлы Пагосчыны

**Айканіміка** – гэта адзін з накірункаў **тапанімікі**, спецыяльнай навуковай дысцыпліны, якая даследуе паходжанне назваў геаграфічных аб'ектаў (тапонімаў), іх сэнсавае значэнне, развіццё, сучасны стан, вымаўленне і напісанне. Паходзіць само слова **тапаніміка** ад грэчаскага *топас* – мясцовасць і *анама* – імя. Айконімы (уласныя назвы населеных пунктаў: гарадоў, сёл, вёсак, пасёлкаў, хутароў, раз'ездаў) вывучае адзін з раздзелаў тапанімікі – **айканіміка** (ад грэч. *oikos* 'жыллё' і *onyma* 'імя'). Такім чынам, **аб'ектам** вывучэння айканімікі з'яўляюцца ўласныя імёны паселішчаў рознага тыпу. (54, с. 23) Паспрабуем з дапамогай айканімікі зразумець, чаму сёлы Пагост, Камень, Ботава, Чухава, Багданаўка, Новы Двор і іншыя называюцца менавіта так.

Беларускія ўласныя геаграфічныя назвы, тапонімы, сфарміраваліся на працягу стагоддзяў у самай цеснай сувязі з жыццём і культурнай дзейнасцю роднасных і няроднасных нам плямён і народаў, якія калі-небудзь насялялі наш край. У сукупнасці яны складаюць **беларускую нацыянальную айканімію.** Разам з помнікамі старадаўняга дойлідства, руінамі гарадзішчаў і замчышчаў мы атрымалі ў спадчыну ад мінулых пакаленняў і ўласныя геаграфічныя назвы – своеасаблівы летапіс сваёй зямлі. Маючы на ўвазе менавіта тапанімную спадчыну, нямецкі філолаг Вільгельм Грым пісаў: "Ёсць больш

жывыя сведчанні пра народы, чым косці, дамавіны і зброя, – гэта іх мова". Тапонімы з'яўляюцца важнай часткай нашай гістарычна-культурнай спадчыны і гэтак жа вартыя ашчаднага стаўлення і аховы, як і іншыя творы чалавечага духу і чалавечых рук. Кожны зніклы тапонім – непапраўная страта, збядненне нашага тапанімнага ландшафту. Скажоныя назвы губляюць сваё нацыянальнае аблічча, моўную спецыфіку, гістарычна-культурную і навуковую вартасць.

**Тыя тапонімы, у якіх увасоблены тыповыя рысы нацыянальнай культуры, факты або падзеі, звязаныя з гісторыяй народа, адносяцца да гістарычна-культурных помнікаў.**

Беларуская айканімія існуе нібыта на двух узроўнях. Першы гэта афіцыйны, то бок тое, як мы пішам. Другі гэта тое, як мы гаворым, прычым на сваёй спрадвечнай, роднай, матчынай мове. Прычыны гэтага дзялення, як у нашым далёкім, так і адносна нядаўнім мінулым. Яшчэ з часоў Люблінскай уніі (1569 г.) сітуацыя для беларускай мовы складвалася даволі неспрыяльна. Пазней, у 1696 г., сейм Рэчы Паспалітай скасаваў статус беларускай мовы як дзяржаўнай і такім чынам адкрыў шлях да татальнай паланізацыі. Ад гэтай пары назвы беларускіх паселішчаў сталі пісаць толькі на польскай мове ў характэрнай для яе фанетычнай і граматычнай формах. У складзе Расійскай імперыі ні дакументалісты, ні гісторыкі, ні картографы таксама не паклапаціліся пра дакладнасць перадачы беларускіх

айконімаў на рускую мову. Наадварот, амаль усе паселішчы былі перайначаны на рускамоўны лад.

У выніку неаднаразовай перадачы з адной мовы на іншую без уліку арыгінала шэраг айконімаў увайшоў у гісторыю ў чужамоўнай ці скажонай форме, з неўласцівымі для іх гукавымі, граматычнымі і словаўтваральнымі рысамі. Гэтым была нанесена шкода ўсёй айканімічнай сістэме Беларусі. У пісьмовай практыцы замацаваліся формы, многія з якіх яшчэ і сёння прызнаюцца за афіцыйныя:

*Брэст, Гро́дна, Навагру́дак, Драгі́чын, Полацк* і іншыя, якія згадваюцца ў ранніх летапісах і іншых старажытнапісьмовых дакументах у сваім першапачатковым абліччы – *Берестъ, Бересте, Городня, Новогородок, Новгородок, Дорогичин, Полтеск.* У гэтых жа формах (толькі з некаторымі гукавымі відазменамі) яны і зараз паўсюдна ўжываюцца ў мясцовых гаворках *(Бэ́рэсць, Бэ́рысць, Бе́расце, Го́радня, Дарагі́чын, Нава́гарадак, Полацак).*

У працэсе рускамоўнай апрацоўкі мноства беларускіх назваў яшчэ больш аддалілася ад свайго арыгіналу. Напрыклад, беларускія *Чарэ́мушнікі* ў рускім варыянце перайначаны на *Черёмушки, Пу́кшына – Пушкино, Во́жыкі – Ожики* і г. д. Прайшоўшы праз расійскую канцылярыю, зніклі або страцілі пэўнасць цэлыя словаўтваральныя тыпы беларускіх айконімаў. Напрыклад, спрадвечна беларускія назвы сельскіх паселішчаў на *-аў, -оў (-ёў), -еў, -ін (-ын)* зусім свядома былі заменены на звыклыя для расіян формы на *-ава, -ова (-ёва), -ева, -іна (-ына).* Такім чынам,

гаворым *Барбарóў, Брылёў, Вóсаў,* а пішам *Барбарóва, Брылёва, Вóсава.* (51, с. 8,9) Так і сёлы Пагосчыны – уласна **Чухоў, Ботоў** – сталі існаваць пад новымі назвамі ***Чухово, Ботово,*** ці па-беларуску ***Чухава, Ботава.*** Першапачатковую, сапраўдную назву гэтых сёл можна пачуць толькі ад вясковых старажылаў. На пытанне "куды ідзеш?" яны адкажуць: у Ботоў, у Чухоў.

**Чухава *(Чухоў).*** З'яўленню сяла мог паспрыяць факт з'яўлення Пагоста на беразе Навадворскага возера ў 1539 годзе. Першы ўспамін пра сяло Чухава – гэта апісанне маёнтка Пагост па прычыне ўвода габрэйкі Дворы Сімшычавай 1 чэрвеня 1645 году на тэрміновае валоданне маёнткам. (40, с. 216) У кароткім тапанімічным слоўніку Беларусі В. А. Жучкевіч сцвярджае, што: "Чухнами оскорбительно называли в XVII-XVIII веках финноязычных и балтоязычных жителей. Этноним перешёл в клички и фамилии (сравн.) "Чернели избы здесь и там, приют убогого чухонца" А.С. Пушкин. – Собр.Соч.Т.2., М., 1949., стр. 525." (39, с. 405.). Але чаму ўласна Чухоў? Калі гэта абраза, то хто і навошта ці за што даў такую назву гэтаму сялу і амаль чатырыста гадоў яно чамусьці не пераймяноўваецца, а працягвае існаваць як назва-абраза.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі захоўвае вельмі важны і каштоўны для Пагосчыны гістарычна-культурны помнік, гэта "Духоўная метрыка ўніяцкай Пагосцкай царквы за 1750-1776 гады". (55) Метрыка цудам дайшла да нашага часу, перажыўшы

такія гістарычныя падзеі, як падзел Расіяй Рэчы Паспалітай і ліквідацыю тым самым нашай дзяржавы ВКЛ, гвалтоўнае знішчэнне і забарону ўніяцтва, часовы пераход у каталіцтва, а потым забарону і яго, затым прымусовы перавод у маскоўскае праваслаўе. Акрамя таго, метрыка перажыла разам з нашымі продкамі вайну Напалеона з расійскім царом у 1812 годзе, рэвалюцыю ў 1917 годзе, першую сусветную, а затым грамадзянскую вайну і Брэсцкі мір, згодна якога мы апынуліся пад Польшчай, потым другую сусветную вайну, якая пачалася для нас з 1939 году, калі немцы разам з Савецкім Саюзам падзялілі Польшчу, і мы апынуліся ў Савецкім Саюзе. Затым зноўку былі немцы і зноўку Савецкі Саюз… А метрыка ўвесь гэты час знаходзілася ў Пагосцкай царкве да тых самых часоў, пакуль яе разам з іншымі метрыкамі царскага і польскага часоў не адвезлі ў Мінск у Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Яна, "Духоўная мерыка ўніяцкай Пагосцкай царквы за 1750-1776 годы", каштоўная для Пагосчыны тым, што з'яўляецца на сёння самым першым перапісам насельніцтва Пагоста, Каменя, Ботава, Чухава на стан 1750-1776 гадоў. У гэтую метрыку за 26 гадоў аказаліся ўпісанымі амаль усе жыхары Пагосчыны, бо на той час яны былі ўніятамі. Выключэнне складалі толькі самі Друцка-Любецкія ды некалькі каталікоў з іх двара. Невядома хто з двара быў католікам, а хто уніятам, але многія з іх упісаны ў "Духоўнай метрыцы Пагосцкай уніяцкай царквы" у якасці кумаўёў. Так, Якуб Жабовіч – эка-

ном пагосцкі (упраўляючы маёнткам), Ёзеф Галембіоўскі (бацька Лукаша Галембіоўскага), гадзіншчык Ян Вішнеўскі, мастак Ян Казлоўскі, таксама шляхта пагосцкая – Малішчэўскія, Павэлкоўскія, Пётнэкі, Быкоўскія, Маркоўскія, Трушчынскія, Бутманы, Аўгустоўскія, Васілеўскія, Сасноўскія і ўся ботаўская шляхта – Лемешэўскія, Дзянісаўскія, Гарэгляды, Савіцкія, Добвіянскія, Брылеўскія, Пратасавіцкія, Жытнікі, Леановічы.

У "Духоўнай метрыцы ўніяцкай Пагосцкай царквы ад 1750 году" зарэгістраваныя шлюбы і хрэсьбіны жыхароў Пагоста, Каменя, Ботава і Чухава амаль за 26 гадоў. (55) Калі прааналізаваць тую метрыку, то можна заўважыць, што з трыццаці двух ***прозвішчаў*** жыхароў Чухава сямнаццаць маглі быць баярскага паходжання. Так, пятнаццаць з іх мелі зарэгістраваныя гербы, а прозвішчы **Рэбковіч** і **Бак** ёсць у спісе баяр войска ВКЛ 1528 года. Вось спіс прозвішчаў жыхароў Чухава на стан з 1750 па 1776 гады, якія адпавядалі прозвішчам, што мелі гербы згодна гербоўніку шляхты ў ВКЛ (42):

1. Воўк **Wolk** herbu **Siekierz**
2. Сарока **Soroka** herbu **Trabi**
3. Саковіч **Sakowicz** herbu **Pomian**
4. Казак **Kosak** herbu **Kos**
5. Леўковіч **Lewkowicz** herbu **Gozdawa**
6. Ярашэвіч **Jaroszewicz** herbu **Prus xmo.**
7. Грэгаровіч **Hrehorowicz** herbu **Lubicz**
8. Грынь[евіч] **Hryniewicz** herbu **Przyiaciel**
9. Галаўко **Holowko** herbu **Lubicz**

10. Хоміч **Chomicz** herbu **Syrokomla**
11. Багатырэвіч **Bohatyrowicz** herbu **Boncza**
12. Завіша **Sawisza** herbu **Labedz**
13. Беляковіч **Bielikowicz** herbu **Bielikowicz**
14. Вольскі **Wolski** herbu **Lis.**
15. Хурс (Фурс) **Furs** herbu **Was**

Відавочна, што больш за 50 адсодкаў жыхароў мелі прозвішчы баярскага паходжання, а гэта значыць, што іх продкі некалі маглі быць баярамі. **Гэта не значыць, што жыхары Чухава, меўшыя гэтыя пералічаныя прозвышчы, абавязкова былі баярамі.** На жаль, няма звестак аб тым, хто і кім былі тыя першыя жыхары сяла Чухава. Але тое, што гэтыя 15 прозвішчаў з 32 жыхароў Чухава на стан 1750-1776 гадоў адпавядалі прозвішчам, гербы якіх былі зарэгістраваныя ў гербоўніку, можа сведчыць аб тым, што першыя жыхары былі баярамі. Улічваючы гэты факт, можна зрабіць дапушчэнне, што Чухава магло ўзнікнуць як баярскае пасяленне па аналогіі з сялом Дубнавічы, узнікшымі значна раней, яшчэ ў 1470 годзе. (8, с. 14-17) Улічваючы толькі само дапушчэнне пра Чухава як баярскае пасяленне, надта непраўдападобна гучыць версія пра абразлівы назоў "чухонцы" у тапанімічным слоўніку Беларусі В. А. Жучкевіча наконт вёскі Чухава і яе жыхароў. Каб разгадаць значэнне назову **Чухоў**, трэба заглянуць у слоўнікі тых народаў і плямён, якія насялялі наш край яшчэ ў ранняе сярэдневечча, ад якіх і сфарміравалася нашая мова. Мы, беларусы, – славянізіраваныя балты, а значыць, у нас, у нашай мове

павінна быць многа чаго балцкага. На жаль, акрамя летувіскага слоўніку, нам у спадчыну нічога не засталося ад тых часоў (напрыклад прускай мовы Міндоўга), але, як лічаць навукоўцы, некалі нашыя мовы таксама былі вельмі падобнымі. **Чухоў** на летувіскай мове пішацца **žtuhow**, што перакладаецца як **значок**. Слова ***чухоў (žtuhow)*** – архаічнае слова як для летувісаў, так і для нас, беларусаў. На сучаснай летувіскай мове слова ***значок*** у перакладзе будзе гучаць як ***зенкляліс (ženklelis)***.

У слоўніку Уладзіміра Даля ад 1880 года паведамляецца пра значок так: "**Значок.** Род малого знамени, которому не придаётся значенья и важности его; у жалонеров, для означенья места строя, значки, флажки" (56, с. 712). Але значок як сцяжок у жаўнераў тычыцца расійскага царскага войска XIX стагоддзя. А што азначала слова **значок** у XVI стагоддзі ў нашай дзяржаве ВКЛ?

"У пачатку XVI стагоддзя як па ўсёй Еўропе, так і ў ВКЛ пачалі з'яўляцца сцяжкі, звязаныя сваім колерам з гербам дзяржавы. Упершыню выяву бел-чырвона-белых сцяжкоў мы бачым у конніцы Вялікага княства Літоўскага, якая ўдзельнічала у бітве пад Воршай у 1514 годзе". Так пісаў М. А. Ткачоў у сваім артыкуле "Национальные символы: народ и история" у газеце "Советская Белоруссия" за 11 і 12 кастрычніка 1989 года. Конніца таго часу ў ВКЛ гэта толькі што створаны новы род войска – гусары.

У першым томе энцыклапедыі ВКЛ ад 2007 года паведамляецца, што гусары ўпершыню з'явіліся ў

Венгрыі. У 1458 годзе кароль Мацьяш Корвін загадаў для абароны ад турак сабраць адмысловае конное апалчэнне. У яго набіралі па адным жаўнеры з дваццаці двароў [па-венгерску *husz (гус)* азначае дваццаць, *ar (ар)* – падатак]. Адсюль пайшла назва апалчэнцаў – «гусары». У Польшчы гусарскія фарміраванні вядомы прыкладна з 1500 году. Соймавыя дакументы 1503 года фіксуюць стварэнне вайсковых часцей паводле "звычаю гусарскага". Праз нейкі час гусары з'явіліся і ў ВКЛ. Гэтая конніца мела высокія баявыя якасці, скарыстоўвалася пераважна ў войнах з Маскоўскай дзяржавай і Швецыяй. Першай вялікай бітвай на Беларусі, у якой удзельнічалі гусарскія харугвы, была Аршанская бітва 1514 года. (17, с. 562)

Адно з найбольш цікавых апісанняў гусарыі пакінуў французскі вайсковец, інжынер і картограф *Гіём дэ Баплан*. Ён з пачатку 1630-х да 1648 году знаходзіўся на польска-літоўскай службе, і ў 1660 годзе ім быў выдадзены успамін "Апісанне Украіны…", дзе ён апісаў тэрыторыю, звычаі, асаблівасці жыцця ўкраінцаў і таксама спосабы вядзення вайны. Там пра гусарыю ён пісаў: "Гусары на службе ў якасці ўланаў – гэта шляхціцы з вялікай маёмасцю. У іх вельмі добрыя турэцкія коні. Кожны ўлан служыць на пяці конях. Такім чынам, у харугвы з сотні ўланаў ёсць толькі 20 таварышаў, якія едуць у адзін рад, так што кожны ўзначальвае [свой] шэраг. Наступныя чатыры рады – гэта іх служкі, кожны ў сваім шэрагу. Даўжыня іх дзіды 19 футаў,

яна полая, пачынаючы ад ляза да яблыка, астатняе зроблена з трывалага дрэва. На лязо сваёй пікі яны прымацоўваюць **значкі**, заўсёды двухколерныя: **бела-чырвоныя**, сіня-зялёныя або чорна-белыя, даўжынёй у 4-5 локцяў. Гэта робіцца, мабыць, для таго, каб палохаць варожых коняў, бо калі яны [гусары], апусціўшы дзіды, нясуцца ва ўвесь кар'ер [у атаку], сцяжкі раздзімаюцца, апісваючы кругі, і наводзяць жах на непрыяцельскіх коней, шыхт якіх яны хочуць прадзерці". (57, с. 40) Калі перавесці на цяперашнія вымярэнні, то атрымаем, што дзіда была даўжынёй у 6 метраў з прымацаваным на ёй **значком** (сцяжком) памерам 4-5 метраў. А **значок** гэты на нашай архаічнай балцкай мове называўся **чухоў**, і менавіта ад яго, хутчэй за ўсё, пайшла назва дворышча, а потым сяла. А адбыцца ўсё магло так. Вялікі гетман ВКЛ Юрый Мікалаевіч Радзівіл па мянушцы Літоўскі Геркулес пажалаваў землі свае ў бабрэцкай воласці баярам сваім за службу ў яго гусарскім войску. У 1514 годзе яны, дзве сотні доблесных гусараў Радзівіла разам з усёй лёгкай конніцай ВКЛ, на чале з будучым вялікім гетманам Літоўскім разбілі значна перавышаючае колькасцю расійскае войска пад Воршай.

Тым першым гусарам, які ўваткнуў у зямлю Пагосчыны сваю шасцімятровую дзіду з **трохкутным**, прыгожа лунаючым, белым з чырвоным крыжам пасярэдзіне **сцяжком**, які называўся тады **ЧУХОЎ**, мог быць продкам цяперашняга жыхара сяла Чухава са спіску тых пятнаццаці прозвішч, маючых на

той час герб воіна, то бок баярына. Менавіта ад той гусарскай дзіды з прымацаваным да яе сцяжком і ўваткнутай у зямлю каля першага дворышча, што размясцілася ўздоўж гасцінца Бобрык – Дабраслаўка – Камень – Лунін, і пайшла назва дворышча, а потым і сяла. Праезжым людзям, што ехалі праз Камень, тлумачылі: "Пасля чухава (значка) прама – будзе Новы двор, а ў правы бок гасцінец на Вільню".

Ботава *(Ботаў).* З'яўленню сяла таксама, як і Чухава, мог паспрыяць факт з'яўлення Пагоста на беразе Навадворскага возера ў 1539 годзе. Першы ўспамін пра сяло Ботава – гэта апісанне маёнтка Пагост па прычыне ўвода габрэйкі Дворы Сімшычавай 1 чэрвеня 1645 года на часовае валоданне маёнткам. (40, с. 216) Айканімія гэтага сяла вельмі падобная да айканіміі суседскага сяла Чухава. Тутэйшыя старажылы да цяперашняй пары называюць сяло не Ботава, а **Ботаў**. У пераводзе з летувіскай мовы ***botau*** гэта лодка. Прычым для летувісаў слова ***ботаў***, то бок ***botau***, як і для нас, беларусаў, – архаічнае, невядомае па сэнсу слова. Так, лодка на сучаснай летувіскай мове пераводзіцца *velenas (велейнас).* А тое, што слова ***botau*** раней адпавядала слову ***лодка***, не ведае сёння як беларус, так і летувіс. А калі паўстае пытанне, чаму вёску назвалі Ботава, то, не задумваючыся, усе атаясамляюць назву з абуткам. Вось толькі ва ўсёй вялікай акрузе вёскі Ботава ніхто ніколі абутак гэтым словам не называў. На мясцовым дыялекце здаўна абутак называўся толькі ***чобаты*** ці ў польскі час ***гумоўцы*** (так сведчаць старажылы сёл

Пагосчыны). Прыкладам можа быць скарга асочніка Цімохі Андрыевіча на Андрэя Масеевіча, зарэгістраваная ў Гарадзенскім земскім судзе ў 1540 годзе, дзе былі ўзгаданыя "**чобаты** новыя жаночыя". (46, с. 201) І толькі потым, у другой палове XX стагоддзя, на літаратурнай беларускай мове гумавы абутак сталі называць так, як і ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі – боты. Старажытны слоўнік Беларускай мовы пераводзіць слова *ботъ, бутъ*, як *бот* і дае такое тлумачэнне *"...обуща: черевик, бот, обув."* І яшчэ з тагачасных пісімовых крыніц 1520 года "Яну возницы на двои боты 10 грошей"(66, с. 167,168.). Такім чынам у старажытнасці ў нашай дзяржаве абутак называлі: *боты, буты, чаравікі і чобаты.* Летувіскі слоўнік перакладае ўсе гэтыя чатыры словы, як batai, што гучыць, як *батай*. Але *батай*, гэта зусім не *ботаў*.

Слова ***бот*** з беларускага на летувіскій пераводіцца, як *valtis*, а слова *valtis*, тасама, як і слова ***botau*** з летувіскага на беларускі пераводзіцца, як ***лодка***. Такім чынам слова боты, як абутак да назвы нашага сяла Ботава наўрад ці мае нейкае дачыненне. Хутчэй за ўсё, сапраўдны айконім сяла – гэта старажытна-балцкае ***botau***, ад слова ***бот***, што адпавядае слову ***лодка***.

Старажытны слоўнік Беларускай мовы слову лодка, лотка дае такое тлумачэнне: *невялікае грабное судна, лодка, човен.* З тагачасных пісьмовых крыніц: "нихто сам собою не можетъ перейти, и перебыти мора, не маючы лёгкой и суптельной з деревца оуроблёной *лодки*. (37, с. 102.) Таким чынам *лодка*,

гэта драўлянае судна, напрыклад *човен*. Старажытны слоўнік Беларускай мовы паведамляе, што ***човен*** раней называлі ***чолнъ, челнъ, чолонъ***. З тагачасных пісьмовых крыніц вядома, што раней "...чолны з зубровых скур дивне шивали." (68, с. 432.)

Святар Пагосцкай царквы Якаў Марціновіч так апісваў рыбалку на Пагосцкім возеры свайго сына Пятра ў 1646 годзе: "...сын мой и з тою челядью моею, будучы чолном на озере, хотел уловити рыбку..."(40, с. 264) Ботаўскімі майстрамі хутчэй усяго і быў зроблены той драўляны ***"чолн"***, што яшчэ гадоў сто раней называлі ***бот*** ці ***ботаў***, ад якога і пайшла назва сяла.

Багданаўка. З'яўленню сяла магла быць тая ж нагода, што паспрыяла ўтварэнню як Чухава з Ботавам, так і нават Пагоста, гэта дарога, якая праходзіла ад Новагародка праз Бобрык, Дабраслаўку, затым Пагост (Чухава, Ботава), Камень і нарэшце шлях на Лунін да Мазыра і Кіева. Шлях гэты абавязкова павінен быў праходзіць праз Багданаўку (гэта адзінае высокае месца ў гэтым напрамку). Менавіта шлях і паўплываў на айконім сяла. Так, нават сёння на пытанне "куды ідзеш?" каменскія жыхары адкажуць "у Бадунуўку", а пра жыхарку з Багданаўкі скажуць "бадунуўчанка". Гэта можа азначаць, што вёска так і называлася некалі – Бадунуўка. У перакладзе з летувіскай мовы ***būdunuw (бадунуў)*** ці ***būdunuwhc (бадунуўк)*** будзе ***шлях (пуць)***, створана ад слова ***būdun (баден) – я іду***. Бадунуўка – гэта сяло, якое ляжыць на шляху. Аналагічны

населены пункт ёсць у Смаленскай вобласці недалёка ад расійска-беларускай мяжы пад назвай *Бадуны*. Смаленскае княства далучылася да ВКЛ яшчэ напачатку XIV стагоддзя ўслед за Полацкім. Смаленск разам з Полацкам і Туравам у XIII–XIV стагоддзях быў важным цэнтрам асветы на старажытных беларускіх землях. Філолагі лічаць, што тагачасным смаленскім граматам уласцівы характэрныя асаблівасці беларускай мовы. (5, с. 94-95) А ў смаленскіх сёлах нават сёння можна пачуць гэтыя *характэрныя асаблівасці*, якія робяць іх мову вельмі падобнай да мовы жыхароў Віцебшчыны. Па гэтай прычыне населены пункт *Бадуны*, што на Смаленшчыне, да сённяшніх дзён захаваў свой айконім, які мае балцкае паходжанне і азначае, што пасяленне Бадуны – гэта старажытнае пасяленне, якое размясцілася ўздоўж шляху (пуці) на Маскву.

Упершыню вёска Багданаўка ўзгадана ўласна пад назвай *Багданаўка* ў 1660 годзе. Так, у пратэстацыі [ад слова пратэст] пані Ганны Багданавай Стэткевічавай на нейкага Пігасоўскага, які для перавозу цыбулі і солі ў мястэчку Плотніца наняў 6 лістапада 1660 г. яе падданага з вёскі Багданаўка Марціна Сянковіча з «клячай», а па дарозе забіў яго сякерай і ўцёк разам з возам. (38, с. 482 адв.-483)

Жыхары сяла і ўсяго яго наваколля называлі раней і цяпер называюць Багданаўку **Бадунуўка**, але згодна кароткаму тапанімічнаму слоўніку Беларусі В. А. Жучкевіча сцвярджаецца, што назва сяла ўтварылася ад імя Багдан. (39, с. 30) З гэтым часткова

можна пагадзіцца. Так, у 1648 годзе казацка-сялянская вайна пад началам Багдана Хмяльніцкага распачалася ва Украіне, ахапіла і землі ВКЛ. Паўстанне дакацілася ў тым ліку і да Палесся, то бок да Піншчыны і Случчыны. Яно, паўстанне, у 1649 годзе было падаўлена Янушам Радзівілам, але казацкі атрад з далучаннымі да яго паўстанцамі мог некаторы час квартыравацца ў сяле Бадунуўка. Дарэчы, менавіта там, у сяле нібыта свайго маёнтка Лунін мог далучыцца да паўстанцаў Міхаіл-Уладзімір Статкевіч. Па прычыне падобнасці вымаўлення назову сяла на імя лідэра паўстанцаў Багдана казакі маглі называць сяло Багданаўкай. Пасля гэтых гучных паўстанніцкіх падзей сяло магло набыць пэўную папулярнасць, і ў дакументах яго маглі так і абазначыць: *Багданаўка*.

Назоў *Багданаўка* мог з'явіцца не ад Багдана Хмяльніцкага, а ад Багдана Статкевіча, бацькі таго ж Міхаіла-Уладзіміра Статкевіча. Гэткая версія выглядае больш праўдападобнай. Кашталян Новагародскі Багдан Статкевіч – аўтарытэтная асоба ў ВКЛ, тым больш ён быў некаторы час уласнікам сяла праз сваю другую жонку Францкевіч-Радзімінскую. Відавочна, што сяло магло атрымаць назву ў яго гонар. Але на той мове, што размаўлялі тады і размаўляюць цяпер мясцовыя жыхары Палесся, вельмі складана вымаўляецца гэтае слова-назва: **Багданаўка**. Гэтае слова не для мясцовай мовы. У слове Багданаўка нязвыклае гукаспалучэнне. Таму сяло па сённяшні дзень называюць Бадунуўка, што ў перакладзе са

старабалцкага азначае, што сяло размешчана ўздоўж пуці (сяло на шляху).

**Сташаны.** Даволі рэдкі выпадак для беларускай айканімікі прасочваецца ў гэтай назве. Амаль без змен яна, гэткая назва, дайшла да нашых дзён. **Сташанічы** – так называлася сяло у 1517 годзе. (27, с. 26-29) Назва сяла можа пахадзіць ад старажытнай заходне-балцкай мовы. Слова ***сташан***, на летувіскай мове ***stashan***, перакладаецца як ***назапашваць, збіраць (копить** – рус.)*. Але слова гэтае як для летувісаў, так і для беларусаў архаічнае, то бок сёння незразумелае. *Назапашваць*, збіраць (*копить*) перакладаецца на сучасную летувіскую мову як *sutaupyk* і гучыць *сатоўпэйк*.

Старажытны назоў Сташаны гаворыць аб тым, што з глыбокай даўніны ў гэтым сяле жылі руплівыя, заможныя гаспадары, у якіх заўсёды ўсё было. Менавіта па гэтай прычыне пра іх гаварылі, што ў тым сяле жывуць ***сташанічы***, то бок людзі запаслівыя, зборныя. Ад таго і пайшла назва сяла Сташанічы, якая з цягам часу спросцілася да назвы **Сташаны**.

**Новы Двор.** Згодна дакументаў, сяло з чатырма дворышчамі існавала ў 1440 годзе, і ўваходзіла яно ў склад маёнтка Жабчыцы. (25, с. 273-274) З гэтага факту можна зрабіць дапушчэнне, што існавала яно заўжды, ад таго першага пасялення на Пагосчыне, то бок ад мезалітычнай стаянкі, якую археолаг У.Ф. Ісаенка назваў Новы Двор-1. Як сяло ў тыя часы называлася, невядома, але ўпраўленне сялом было



нязручным па прычыне адсутнасці дарог, а мясцовасць вакол сяла была вельмі забалочана. Найбольш простым рашэннем было стварэнне новага маёнтка, то бок двара, на аснове сяла. Ён у нейкі час і быў створаны ды так і названы: Новы Двор. Для землеўласніка усё як было, так і засталося, толькі з'явіўся яшчэ адзін двор (маёнтак).

**Пагост.** Што азначае гэтае слова і чаму менавіта такую назву атрымалі сёлы, якія ёсць цяпер амаль ва ўсіх абласцях нашай Беларусі? А створаны яны былі яшчэ ў старажытныя часы ў нашай старажытнай дзяржаве Вялікім княстве Літоўскім. З той глыбокай даўніны існуюць тыя дзевяць Пагостаў у Віцебскай вобласці, Мёрскім, Аршанскім і Лёзненскім раёнах, у Мінскай вобласці, Вілейскім і Салігорскім раёнах, у Магілёўскай вобласці, Шклоўскім і Глускім раёнах, у Гомельскай вобласці, Жытнавіцкім раёне і Пагост Загародскі ў Брэсцкай вобласці, Пінскім раёне, а таксама Пагост Зарэчны былога Пінскага павету ВКЛ (цяпер пасёлак Зарэчнае Ровенскай вобласці, *на украінскай мове Зарічне*). Ва ўсе часы жыхары тых Пагостаў не вельмі клапаціліся, а хутчэй за ўсё, наогул не клапаціліся пытаннем, што азначае гэтая назва і чаму сяло (мястэчка) назвалі менавіта *Пагост*. Наадварот, жыхары Пагостаў з гонарам называлі сябе пагасчанамі. У Пагосце (Загародскім) так было ва ўсе часы. Цяпер, калі нейкаму нетутэйшаму чалавеку, значна далей ад сяла, скажаш, што ты з Пагосту, то гэта абавязкова выкліча ў лепшым выпадку ўсмешку. Чаму? Таму, што з нейкага часу назва





*пагост* стала азначаць *могілкі*. Прычым у **руска-беларускім** слоўніку слова ***погост*** з расійскай мовы на беларускую перакладаецца як ***цвінтар, могілкі*** (60, с. 157), а вось беларуска-рускі слоўнік перакладу слову пагост не дае, але слова могілкі перакладаецца на расійскую мову як кладбище, ***погост***. (61, с. 118) Слова цвінтар перакладаецца на расійскую мову адназначна: погост. (61, с. 257) Гэта гаворыць аб тым, што *кладбище* і таксама погост азначаюць у расіян *могілкі*. У нас жа, беларусаў, *Пагост* азначае толькі Погост як айконім, то бок назву сяла. Тое самае тычыцца **руска-украінскага**, а таксама **руска-польскага** слоўнікаў, у якіх слову *пагост* адпавядаюць пераклады *цвинтар* і *cmentarz (цмэнтаж) [што азначае ў абодвух выпадках* ***могілкі****]*. З украінскай і польскай моў, як і ў перакладзе з беларускай на рускую мову слова *пагост* так і будзе *погост*. Гэта можа азначаць, што беларуская, украінская і польская мовы пагосты не атаясамляюць з могілкамі. ***Погосты*** толькі ў рускай мове азначаюць ***"кладбища"***. Дарэчы, згодна "Гістарычнаму слоўніку Беларускай мовы", пра *могілкі* ў 1639 годзе пішацца кладбище (62, с. 96), а ў 1576 годзе *кладовище*. (62, с. 98) Аднак на мясцовым дыялекце *могілкі* называюць толькі словам *моглы-цы*. Пра пагосты як *могілкі* беларусы ведаюць толькі з кніжак.

Слова *кладбище* на ўкраінскую мову перакладаецца як *кладовище*, што адпавядае польскаму *кляштор*. Усе гэтыя назвы ніяк не суадносяцца са словам "пагост" у польскай, украінскай і беларускай мовах.

У сучасным тлумачальным слоўніку "Большая Советская Энциклопедия" 1998 году выдання назва *Пагост* тлумачыцца як *"первоначально центр сельской общины на северо-западе Древней Руси. Позднее центр административно-податного округа, крупное селение с церковью и кладбищем. С 18 века погостом назавают отдельно стоящую церковь с кладбищем, позднее сельское кладбище"*. С. І. Ожэгаў у "Толковом словаре русского языка" выдання 2014 года слову пагост дае такое тлумачэнне: "Сельское кладбище (в старину – церковь с прилегающим участком и с кладбищем в стороне от села)". (58, с. 794)

"Толковый словарь живого великорусского языка Владимира Даля 1882 года издания" тлумачыць слова *пагост* як "*приход* сельский; *несколько деревень* под общим управлением и одного прихода; *волость;* отдельно стоящая на церковной земле *церковь* с домами попа и притча, *с кладбищем; село,* хотя тут нет ни одной крестьянской избы, а приход раскинут деревнюшками вокруг; о таком ***погосте*** говорят *лежит деревенька на горке, а в ней хлеба ни корки, или звону много, а хлеба нет.*// Кладбище с церковью вообще…" і гэтак далей, дзе *пагост* гэта амаль у кожным выпадку *могілкі* і часцей за ўсё з царквой. Ну і нарэшце згодна "Кароткага тапанімічнага слоўніка Беларусі В. А. Жучкевіча" пра Пагост Загародскі гаворыцца: "Названия-термины, смысловое значение которых с течением времени изменялось. Первоначально погостом называлась центральная усадьба сельской общины, с X-XI вв. погосты ста-

ли административно-территориальными единицами. Поскольку с распространением христианства в погостах начали строить церкви, погостом стали называть небольшие поселения с церковью и кладбищем. Например, у А. Ф. Писемского читаем: «Погост был сплошь покрыт могилами, над которыми возвышались то белые, то чёрные кресты». В Беларуси названия Погост восходят к XI-XII вв. со значением "административные единицы с церквями". (29, с. 295) Узнікае ўражанне, што ва ўсіх вышэй пералічаных аўтарытэтных крыніцах апісваюцца нейкія іншаземныя Пагосты. Ніводнае вызначэнне назову Пагост не адпавядае ніводнаму з дзевяці беларускіх Пагостаў. Так, напрыклад, у кожным сяле, нават не ў Пагосце, ёсць могілкі. Бывае, што яны размяшчаюцца на ўскрайку сяла, як, напрыклад, у суседніх з Пагостам Борках, але гэта зусім не нагода Боркі ці нейкае іншае сяло назваць Пагостам. Царква і могілкі каля царквы былі некаторы час і ў Пагосце (Загародскім), але гэта зусім не было нагодай стварэння сяла пад назвай Пагост. Ды і наогул, напачатку ствараецца сяло, надаецца яму назва, і толькі праз некаторы час з'яўляюцца могілкі. А тое, што Пагост Загародскі ствараўся не як могілкі для нейкага сяла, відавочна, бо могілкі на ўскрайку сяла з'явіліся больш чым праз 100 гадоў пасля яго першага пісьмовага ўспаміну. Так, Пагост упамянуты ўпершыню ў 1539 годзе, а могілкі ў Пагосце з'явіліся толькі ў другой палове XVII стагоддзя. Дарэчы, гэты факт даследаваны навукоўцамі. Так

археолаг У. Ф. Ісаенка, праводзіўшы археалагічныя даследаванні часоў каменнага веку ў наваколлі Пагоста Загародскага, напачатку лічыў, што Пагост быў могілкамі нібыта вялікага старажытнага горада Камень. Гэтым ён дзяліўся з маім бацькам, які ў тыя часы быў старшынёй Загародцкага сельсавету, і некаторыя арганізацыйныя пытанні навуковых работ вырашаліся сумесна. Яны былі аднаго пакалення, і ім даваральна прыемна было гутарыць не толькі пра вайну. Бацька ў сваю чаргу пераказваў нам, сваім дзецям, пра старажытны Пагост, які ён пазнаваў са слоў навуковага супрацоўніка. Праз некаторы час пачаліся раскопкі старажытных могілак у Пагосце на Дзеддомаўскай горцы, у якіх удзельнічалі і мы, тагачасныя вучні старэйшых класаў. Кіраўніком тых раскопак была навуковая супрацоўніца з таго ж інстытута, што і У. Ф. Ісаенка. Яна нам паведаміла, што могілкі аказаліся не надта старажытнымі, а ў асноўным XVIII стагоддзя, і нязначная колькасць артэфактаў канца XVII стагоддзя. Такім чынам, ідэя пра вялікі горад Камень і Пагост як могілкі таго гораду, згодна фармулёвак аўтарытэтных расійскіх энцыклапедычных выданняў, не пацвердзілася і не ўвайшла ў ненадрукаваны нарыс пра Пагост Загародскі У. Ф. Ісаенкі. А гэты факт толькі яшчэ раз сведчыць не толькі аб тым, што Пагост быў створаны не як могілкі для нейкага сяла, а яшчэ і аб тым, што Пагост напачатку свайго існавання быў не ў тым месцы, дзе ён размяшчаецца цяпер. Нагадаю, першы ўспамін Па-

госта – 1539 год, значыць, могілкі ў сяле павінны былі з'явіцца ў другой палове XVI стагоддзя, а ніяк не ў канцы XVII.

Дык адкуль ці ад чаго пайшоў назоў, уласна, *"Пагост"* і чый ён? Аб тым, што ён не польскі, гаворыць той факт, што ў энцыклапедычным інфарматары Польшчы выдання 1986 года населенага пункту з гэткай назвай няма. (48, с. 451-588) У тэлефонным даведніку Украіны Пагостаў таксама няма. І той факт, што Пагост Зарэчны Пінскага павету, што адыйшоў Украіне ў 1939 годзе, адразу змяніў сваю назву на Зарэчнае, пераканаўча гаворыць аб тым, што назоў Пагост зусім не ўкраінскага паходжання. Пагосты як могілкі – гэта характэрна толькі для расійскіх Пагостаў, ды і "узрост" іх не болей, чым 400 гадоў. А тое, што напісана пра Пагосты ў "ПВЛ (повести временных лет)", не датычыць Пагостаў нашай будучай краіны ВКЛ. Па першае, папасці да нас у той час было наўрад ці магчыма. Нас раздзяляла мора Геродота. Па другое, згодна летапіса, у той старажытны час існаваў толькі горад Полацк. Віцебск быў заснаваны Вольгай у 974 годзе, але Вольгі ў той час ужо не было. І навогул, працуючы з тэкстамі розных летапісаў, сучасныя гісторыкі абавязкова звяраюць упамянутыя ў іх падзеі з іншымі крыніцамі, таксама з дадзенымі такіх навук, як археалогія, лінгвістыка, этналогія і г.д. Лінгвісты вывучаюць у першую чаргу гідраніміку і тапаніміку, да якой і адносіцца айканіміка. Для разгадкі назову *Пагост* разгледзім айконімы, утваральныя асновы

якіх указваюць на размяшчэнне аб'ектаў у прасторы. Іх назвы ўтвараліся ад агульных геаграфічных тэрмінаў. Такія онімы ўказваюць на размяшчэнне населеных пунктаў на мясцовасці адносна якіх-небудзь іншых аб'ектаў. Часцей за ўсё яны матывуюцца адказам на пытанні "дзе?", "за чым?", "перад чым?", "пад чым?", "каля чаго?". У якасці арыенціраў выступалі разнастайныя прыметы тапаграфіі і ландшафту мясцовасці. Значная роля пры гэтым адводзілася вялікім і малым прыродным вадаёмам: рэкам, балотам, крыніцам, ручаям. Таксама дарогам, шляхам, гасцінцам. [Усе назвы населеных пунктаў узяты з Вялікага гістарычнага атласа Беларусі. (7, с. 192-244)]

**Бор:** ***Боркі***, Барковічы, Забор'е, Заборак, Забароўе, *Забараўцы.*

**Поле:** Заполле. **Гара:** Загор'е. **Возера:** Заазер'е, Прыазёрны, Азерышча, Азярко. **Крыніца:** Закрынічча. **Пруд:** Запрудаўка, **Запруддзе. Бяроза:** Падбярэззе, Бярэзна, **Бярэсце.**

**Балота:** Забалацкае, Забалочча, Забалацце, Забалоцце.

**Рака:** Зарэчча, Междурэчча, Падрэчча, Прырэчча, **Парэчча.**

**Луг:** Залужжа, Палугасевічы, **Палужжа.**

**Лес:** Залессе, Даўгалессе, Лескавічы, Падлессе, Пералессе, **Палессе.**

Айконімы, утворэнне якіх звязана з дарогамі, шляхамі, гасцінцамі.



*Дарогі*:

**Старыя Дарогі, Падарэссе, Замосце, *Канатоп*, Гаць, Гацішча, Загацце, Роўнае, Прыхабы, Пераброддзе, Пераброды, Дарожкавічы, Задарожжа, Падарозск *(Падароззе).***

Шлях:

**Путнікі, Путчына, Пуцілава, Пуцілкавічы, Перавалока, Перасмыкі, Пераход, Пераходзічы, Перэвалка.**

Гасцінец:

У суседняй Польшчы: **Гасціцын, Гасцінін, Госціна, Госцін, Госцірадаў, Госцяноў.**

У суседняй Украине: **Гостинне.**

У нашай дзяржаве ВКЛ: **Сямігосцічы, Сямігостычы, Гастынічы, Гасцілавічы.**

Каб лепш уявіць старажытную заканамернасць, то бок прынцыповасць утварэння назваў сёл уздоўж чаго-небудзь, яшчэ раз разгледзім прыклады:

Так, сяло ўздоўж рэчкі назвалі Парэчча.

Рака *па* + рэчцы = Парэчча. (5 сёлаў)

Уса (рака) *па* + Вусе = Павуссе (1 сяло)

Ніз *па* + нізе = Паніззе. (3 сяла)

Луг *па* + лугу = Палужжа. (1 сяло)

Лес *па* + лесу = Палессе. (3 сяла)

Дарога *па* + дарозе = Падароззе = Падарозск = Падароск.

Гасцінец па + гасцінцу = Пагосце = Пагост. (9 сёлаў)

Сяло, што размясцілася ўздоўж гасцінца (дарогі), то бок па гасцінцу = Пагосце, а потым = Пагост. Сяло, што размясцілася ўздоўж дарогі, па дарозе =





Падароззе, а потым = Падарозск і нават = Падароск. Паслядоўносць павінна быць менавіта такая: *Падароззе, Падарозск, Падароск. Магло быць таксама: Палужжа, Палужаск, Палужск ці Палессе, Палесак, Палеск.*

***Пагосце.*** Менавіта такую назву маглі мець усе Пагосты ў ВКЛ напачатку свайго існавання. Па-першае, гэта адпавядае нашай беларускай айканіміі, а гэта, бадай што, самы галоўны аргумент. Акрамя таго, у пісцовай кнізе пінскага і клецкага княстваў, састаўленай пінскім старастам С. Хвальчэўскім у 1552 годзе, сяло абазначана пад назвай *Пагосце*. Пісцовая кніга выдана ў 1884 годзе ў Вільне, але тэкст не перакладаўся з польскай мовы, а гэта дае падставы для ўпэўненнасці ў тым, што выдавалася кніжка без рэдагавання тэксту, то бок без змен першапачатковага напісання кнігі. Няхай сабе ў кнізе пішацца пра Пагост Зарэчны, а не пра Пагост Загародскі. Зараз мы разглядаем айканімію назову Пагост. Дык вось, у пісцовай кнізе Хвальчэўскага ад 1552 года сяло называлася Пагосце, менавіта Sziolo **Pohosczye**. (24, с. 264) У пісцовай кнізе Лаўрына Войны ад 1561 года Пагост Зарэчны ўжо называлі **Погосто (siolo Pohostho)**. (23, с. 440, 441) Такі варыянт напісання, а хутчэй за ўсё, і вымаўлення назову *Погосто* атрымаўся ад варыянту вымаўлення ў тыя старажытныя часы слова ***гасцінец,*** як ***гастынец,*** аб чым сведчыць "Гістарычны слоўнік Беларускай мовы". (14, с. 112) У кніжцы "Ревизия пущ и переходов звериных..." пры апісанні меж пушчаў узгадваецца "...село его милости пана воеводы Троцкого *Погостьское*". (25,

с. 8) Слова ***Погосцьское*** магло ўтварыцца толькі ад назову ***Погосце***, а ад назову ***Погост*** можа ўтварыцца ***Погостское***. Назовы Погосце, Погосцьское ўласцівы толькі нашай, старабеларускай айканіміі. Назоваў з такімі канчаткамі і націскамі, а значыць, і вымаўленнем няма ў іншых мовах. Менавіта па гэтай прычыне на іншых мовах назоў ***пагосце*** ператвараецца ў пагост. Так, у Расіі з'явіліся Пагосты, а дзякуючы расійскім пісьменнікам, а асабліва паэтам назоў набыў пэўную папулярнасць, і змяніўся сам сэнс назову. Расійскія *кладбища* становяцца *погостами (слова "пагост" лепш гучыць, акрамя таго, лягчэй рыфмуецца: косці на пагосце…)*.

Пад уплывам расійскасці, таксама польскасці наша айканімія церпіць змены, а гэта аб'ектыўная неабходнасць, з якой трэба мірыцца, але абавязкова ведаць і заўсёды памятаць сваю першапачатковую айканімію, з якой пачыналася наша ***сапраўдная гісторыя***. Трэба памятаць свае вытокі і разумець, што "беларускія ўласныя геаграфічныя назвы, тапонімы сфарміраваліся на працягу стагоддзяў у самай цеснай сувязі з жыццём і культурнай дзейнасцю роднасных і народнасных нам плямён і народаў, якія калі-небудзь насялялі наш край. У сукупнасці яны складаюць **беларускую нацыянальную айканімію**". (51, с. 8) Так што айконімы Ботава, Чухава, Пагост, Брэст, Навагрудак, Мінск гэта ўжо таксама частка нашай айканімікі, нашай сучаснай беларускай айканімікі, на якую паўплывала польская і расійская рэчаіснасць.

У 1921 годзе абодва Пагоста апынуліся ў складзе міжваеннай польскай рэспублікі, і каб іх прасцей было адрозніваць, да іх назоваў былі зроблены дабаўкі *Загародскі* і *Зарэчны*. Адкуль узяліся гэтыя дабаўкі? Ва "Універсале харужага Базыля Альбрыхта Орды насельніцтву Пінскага павету аб зборы 20 ліпеня 1660 году павятовай харугвы ў вёсках Палтаранавічы і Волвіч пад камандай" Рыгора Шырмы для абароны ад маскоўскага і казацкага войскаў згадваюцца Загародскі і Зарэчаскі тракты. (38, с. 287 адв.-288)

Выходзіць, што менавіта тая самая прычына назву гэтых дарог яшчэ ў сярэднявеччы і стала галоўнай нагодай для прыняцця тых дадаткаў да абодвух Пагостаў у пачатку 20 стагоддзя.

# 5. Радзівілы і Пагост

Першае ўпамінанне пра Пагост датуецца як 12 кастрычніка 1539 года. Менавіта аб гэтым сведчыць чарговы падзел маёмасці сярод сыноў Радзівіла Мікалая Радзівілавіча па мянушцы Стары. Пагост разам з Каменем, Дубнавічамі, Лобчай і іншымі сёламі ў складзе маёнтка Бобрык дасталіся малодшаму сыну Юрыю. ( 45) Так ужо здарылася, што Пагост абавязаны не толькі сваім першым успамінам, але, хутчэй за ўсё, і сваім з'яўленнем гэтаму самаму знакамітаму, багатаму і ўплывоваму роду нашай сярэдневечнай дзяржавы – Радзівілам. З гэтай нагоды неабходна бліжэй пазнаёміцца з легендарнымі прадстаўнікамі гэтага роду ад іх прашчура Радзівіла Осцікавіча да апошняга Радзівіла, які валодаў Пагостам, Юрыя Мікалаевіча (6 пакаленне).

Род Радзівілаў не меў сабе роўных у гісторыі Вялікага княства Літоўскага па колькасці выдатнейшых палітычных, царкоўных, вайсковых і культурных дзеячоў. Яго прадстаўнікі двойчы займалі вышэйшую ў царкоўнай іерархіі пасаду віленскага каталіцкага епіскапа, а адзін з іх стаў кракаўскім архіепіскапам і кардыналам. Вышэйшую свецкую пасаду віленскага ваеводы на працягу XV-XVIII стст. займалі 13 прадстаўнікоў рода, 7 з іх былі дзяржаўнымі канцлерамі, а 6 – вялікімі гетманамі. У цэлым 38 прадстаўнікоў роду займалі пасады, якія давалі права на месца ў Вяліка-

княскай Радзе. Барбара Радзівіл у 1550 годзе стала каралевай Польшчы.

Род Радзівілаў пайшоў ад шляхецкага роду Осцікаў. Осцік (у каталіцтве Крысцін) – родапачынальнік Осцікаў, паходзіў з заможнага літоўскага баярства з-пад Вільні, вядомы з 1401 года па дакументам ВКЛ, дзе ён ставіў подпісы як стараста ушпальскі. У 1413 годзе атрымаў герб "Трубы", а ў 1418 г. атрымаў пасаду кашталяна віленскага. Валодаў шматлікімі маёнткамі ў Літве і Жамойці. Меў некалькі сыноў. Адзін з іх – Станько (Станіслаў) Осцікавіч – прадоўжыў род Осцікаў, а другі – старэйшы сын Осціка, Радзівіл, – распачаў магнацкі род Радзівілаў. (18, с. 380)

**Радзівіл Осцікавіч** (? – 1477), з 1420 г. маршалак гаспадарскі вялікага князя Вітаўта, з 1463 г. ваявода троцкі і з 1475 г. кашталян віленскі. Разам з Міхаілам і Янам Кезгайламі кіраваў ВКЛ у час адсутнасці ў дзяржаве вялікага князя. Валодаў маёнткамі ў Літве (Біржы, Кайданы, Муснікі, Шырвінты, Упнікі, Нягневічы, Харашэвічы, Бастынь). Такім чынам, Радзівіл I заклаў палітычны і маёмасны капітал магутнасці роду. Знатнае паходжанне і багацце прадвызначала бліскучую кар'еру ягоным нашчадкам. Меў дачку Ганну і сына Мікалая. (18, с. 501)

**Мікалай Радзівілавіч** па мянушцы Стары (? – 1509), намеснік смаленскі з 1481 г. У 1488 годзе кашталян троцкі і намеснік новагародскі, а з 1495 г. ваявода віленскі і канцлер ВКЛ. Кіраваў Вялікім княствам Літоўскім пры адсутнасці ў дзяржаве вялікага князя. Стварыў вялікую латыфундыю, якая заклала

падмурак магутнасці роду Радзівілаў. Валодаў Кейданамі, Біржамі, Дубінкамі і іншымі ў Літве, таксама Жупранамі, Гераненамі каля Ашмян, Нягневічамі, **воласцю Бобрык на Прыпяці**. У шлюбе з Зоф'яй Мінвід меў дачку Ганну, сыноў Мікалая, Яна, Войцэха, Юрыя. Пасля быў жанаты з Зоф'яй, дачкой князя І Заслаўскага і з Зоф'яй (Фядорай), дачкой князя І Рагацінскага. (18, с. 492-493)

**Юрый Мікалаевіч** (мянушкі **Віктар, Пераможца, Літоўскі Геркулес**; каля 1480 – 1541). Ваявода кіеўскі, гетман польны, кашталян троцкі і віленскі, адначасова маршалак надворны з 1528 г. і **вялікі гетман ВКЛ** з 1531 г. Праславіўся сваім удзелам у войнах, перамогамі ў 30 бітвах. У 1508 г. удзельнічаў у вайне з Маскоўскай дзяржавай. Разам з Канстанцінам Астрожскім разбіў татараў у бітве на Альшаніцы ў 1527 г. Камандаваў войскам ВКЛ у вайне супраць Маскоўскай дзяржавы 1534–37 гг. Разам з канцлерам ВКЛ Альбрэхтам Гаштольдам і жамойцкім старастам Янам Радзівілам (сваім пляменнікам) уваходзіў у магнацкі трыумвірат, які фактычна кіраваў ВКЛ у час адсутнасці вялікага князя. У гісторыі Радзівілаўскага дома Юрый Мікалаевіч (Літоўскі Геркулес) па праву займае першае месца, як першы з Радзівілаў, які праславіў ратнымі перамогамі свой род. Ён быў адным з багацейшых магнатаў ВКЛ. Валодаў маёнткамі пераважна ў Літве, на Беларусі меў маёнткі Свір, Міхалішкі, Жупраны, Баруны, Геранёны, Індура, Котра, Табола, Жырмуны, Дакудава, Сялец, Збляны, Уселюб, Ліпск, Вязынь, Налібакі, Ка-

мень Харэцкі. Быў жанаты з Барбарай Кішкай, пасля з Барбарай Коля, з якой меў дачок Ганну і *Барбару* (вялікая княгіня літоўская і каралева польская), сына Мікалая (18, с. 499), якому ён пакінуў не толькі багатую спадчыну (**у тым ліку і Пагост**), але і ваенныя здольнасці і рыцарскую годнасць.

**Мікалай Юр'явіч** па мянушцы **Руды** (1512 – 1584), з 1547 г. князь Свяшчэннай Рымскай імперыі "на Біржах і Дубінках". У 1549 г. атрымаў ад Жыгімонта Аўгуста правы вялікакняжацкага намесніка з рэзідэнцыяй у Вільні. Ваявода троцкі, віленскі, вялікі гетман, канцлер ВКЛ. Вызнаваў кальвінізм, пасля Мікалая Радзівіла Чорнага ўзначальваў пратэстантаў у ВКЛ. Стварыў цэнтр рэфармацыі ў Літве і адкрыў кальвінісцкую школу. Валодаў маёнткамі Біржы, Дубінкі, Шырвінты, Раканцішкі, Салечнікі, Свір, Міхалішкі, Мядзель, Жупраны, Баруны, Індру, Котру, Жырмуны, Сялец, Збляны, Дакудава, Уселюб, Ліпск, Койданава і Вязынь. Трымаў шматлікія староствы і дзяржавы (Барысаў, Ліда, Мерач, Мазыр, Ашмяны, Васілішкі і іншыя). У шлюбе з Кацярынай Івінскай меў дачку і сыноў **Мікалая** і **Крыштофа**. (18, с. 493) Лёс паспрыяў Мікалаю Юр'евічу і на дзяржаўным полі дзейнасці, і на ваенным, і ў сямейным жыцці. Паэт тагачаснай Беларусі Ян Радван у прысвечанай яму паэме "Радзівіліяда" на лацініцы пісаў:

*Ты – для Айчыны апора, Літва на ёй вечна, трывала*
*Будзе трымацца заўжды: яе моц – у задумах магутных.*

**Мікалай Мікалаевіч** (каля 1546 – 1589), дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Старэйшы сын Мікалая Рудо-

га, родны брат *Крыштафа Перуна*. Разам з братам атрымаў дамашнюю адукацыю. На чале ўласных атрадаў удзельнічаў у Інфлянцкай вайне, узяцці Полацка. Лоўчы ВКЛ, ваявода новагародскі. Вызнаваў кальвінізм. Валодаў маёнткамі ў Літве (Віжуны, Дубінкі, і інш.), Жырмуны, Ліпічна, Беліца, Дакудава, Індура, Востраў, Мядзель, трымаў Мазырскае староства, Мерацкую дзяржаву. У шлюбе з Аленай Глябовіч меў дачок **Зоф'ю, Кацярыну** і сына **Юрыя**. (18, с. 494)

**Юрый Мікалаевіч** (1578 – 1613), дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Вучыўся ў Страсбургу, Базелі. **Дзякучы падтрымцы свайго апекуна** *Крыштафа Перуна* стаў старастам мазырскім, дзяржаўцам анішкінскім. Кашталян троцкі з 1600 года, маршалак Трыбунала ВКЛ. Шчыры кальвініст, удзельнічаў у заключэнні палітычнага саюза паміж пратэстантамі і праваслаўнымі, скіраванага супраць контррэфармацыі і царкоўнай уніі.

На чале ўласных атрадаў Юрый Мікалаевіч прыняў удзел у антыкаралеўскім рокашы Зебжыдоўскага (легальнае паўстанне шляхты супраць цэнтралізацыі ўлады караля 1606-1609 гг.). Адным з кіраўнікоў рокаша быў ягоны стрыечны брат *Януш Крыштафавіч*. "Вайна чарніліц" завяршылася братазабойчым канфліктам, што прывяло да паразумення абодвух бакоў, і ў выніку адбылося прымірэнне і прабачэнне ўсіх удзельнікаў.

Юрый Мікалаевіч валодаў маёнткамі Дубінкі, Беліца, Дакудава, Ліпічава, Жырмуны, Жупраны,

Гнядзілавічы, Вольберавічы, Індура, **Лунін, Пагост** і іншымі. (18, с. 500) У шлюбе з Зоф'яй Збароўскай Юрый Радзівіл не меў дзяцей і 25.07.1612 г. запісаў усю маёмасць стрыечным братам – кашталяну віленскаму ***Янушу Крыштафавічу*** і ваяводзе віленскаму ***Крыштафу Крыштафавічу*** Радзівілам. (30, с. 338) Чаму Юрый Мікалаевіч не пакінуў ніякай маёмасці сваім родным сёстрам Зоф'і і Кацярыне? Аб гэтым у наступным артыкуле.

# 6. Пагост, Пагосчына і не толькі

## 6.1. Лунін (Лулін, Вялікі Лунін)

26 красавіка 1501 года да вялікага князя Аляксандра звярнулася ўдава Пятра Неміровіча з сынам Янам Пятровічам з тым, каб сяло Лунін Вялікі з дванаццацю сялянамі, што ў Бабрэцкай воласці, раней належаўшае яе мужу Пятру Фядковічу, перааформіць на іх сына Яна. Маёнтак Лунін дастаўся Пятру Неміровічу ад ягонага дзядзькі Мікалая Неміровіча, які ў сваю чаргу атрымаў маёнтак ад вялікага князя Жыгімонта, чый ліст на права валодання маёнткам маці Яна паказала. Аляксандр пацвердзіў ліст Жыгімонта сваім лістом на Яна Неміровіча і ягоную маці. (29, № 578, с. 78)

Вялікі князь Жыгімонт правіў у ВКЛ з 1432 па 1440 год. Такім чынам, маёнтак Лунін з дванаццацю сялянамі існаваў не пазней, чым з 1440 года.

Афіцыйным першым успамінам сяла Лунін лічыцца 1435 год. (7, с. 220)

**Выпадковыя звесткі:**

Бабрэцкая воласць існавала ў 1440 г.

Маёнтак Бобрык існаваў раней, чым у 1440 г.

Сяло Бобрык існавала значна раней, чым у 1440 г.

Афіцыйным першым успамінам сяла Бобрык лічыцца 1495 год. (7, с. 196)

**Пагост не ўзгаданы.**

## 6.2. Сошна (Шошно)

**20 сакавіка 1512 году** па загаду караля Жыгімонта былі прызначаны камісары з ліку каралеўскіх баяр пад началам дваран караля Карніла Тура і Марціна Мелешкевіча. Яны разгледзелі скаргу князя пінскага Фёдара Іванавіча Яраславіча на князя Міхаіла Іванавіча Жыжэмскага ў тым, што той у Сошна прывёз сваіх людзей, якія пачалі там жыць, зямлю абрабляць і ў рацэ рыбу лавіць, чаго раней ніколі не было. На што князь Жыжэмскі адказаў, што яшчэ ягоны дзед пры вялікіх князях Вітаўце і Жыгімонце, ягоны бацька пры каралі Андрэю Казіміру, а затым ён сам у Сошна мелі зямлю пашную, сенажаці, дрэва бортнае, ловы ў водах стаячых і цякучых, прычым палавіну, бо ён два дворышча меў. А другая палавіна заўжды была князя Фёдара Іванавіча, бо ў яго тры дворышчы ў тым жа Сошна было. На што князь пінскі папрасіў паказаць ліст. Ліста ў князя Міхаіла не было. Тады ў яго запыталі, ці ёсць у яго сведкі, якія пацвердзяць, што ягоныя бацька і дзед палову ў Сошна мелі. Міхайла сведкаў не падаў. Тады камісары запыталі ў князя Фёдара, ці ёсць у яго сведкі, якія пацвердзяць, што бацька і дзед князя Жыжэмскага ў Сошна "не мелі ні ў чым". І князь Фёдар падаў сведкаў пана ваяводы віленскага мужоў Бабрэцкай воласці, на што князь Міхайла бабрчан адставіў і казаў: яны мае суцяжцы. Гэта маглі быць людзі Юрыя Мікалаевіча Радзівіла з Парахонску, якім раней валодаў Жыжэмскі, як паведамляюць "Гарады і

вёскі Беларусі…”. (52, с. 44) Тады князь Фёдар падаў сведкаў людзей Уладыкі, – іх таксама адставіў князь Міхайла па той жа прычыне. І калі князь пінскі падаў людзей лунінецкіх, князь Жыжэмскі пагадзіўся, каб шасцёра чалавек лунінецкіх і з імі баярын князя пінскага, Івашка Полазавіч, сёмы, прысягнулі сведчыць. Баярын Полазавіч прысягнуць адмовіўся, і тады князь Міхайла сам прысягнуў. Князь пінскі Фёдар адразу саступіў князю Міхайлу ва ўсім Сошна палавіну. (27, с. 18) Далей апісваецца зямля Сашэнская, дзе узгадваюцца: Гарадзішча, Сушыцк, Астравец, Парахонск, Лунінец, Бобрык. Вядома, што ў князя Жыжэмскага Міхаіла Іванавіча быў бацька Іван Дзмітрыевіч, а дзед – Дзмітрый Глебавіч. (17, с. 630-631) Вітаўт княжыў з 1392 па 1430 гг.

**Выпадковыя звесткі:**

**Сошна існуе не пазней, чым з 1430 г.**

**20.03.1512 г.** упамінаецца Гарадзішча

**20.03.1512 г.** упамінаецца Парахонск

**20.03.1512 г.** упамінаецца Сушыцк

**Першы афіцыйны ўспамін:**

**Сошна 1500 г.** (7, с. 235)

Гарадзішча (Гродище) 1512 г. (7, с. 202)

Сушыцк (Сушицко) 1512 год. (7, с. 237)

Астравец (Островец) 1461 год. (7, с. 193)

Парахонск (Прохонск) 1512 год. (7, с. 227)

Лунінец (Лулінец) 1471 год. (7, с. 220)

Бобрык (Боброк) 1495 год. (7, с. 196)

Пагост не ўзгаданы (1512 год)

Па загаду караля Сігізмунда Аўгуста ў 1561–1566 гадах пінскім і кобрынскім старастам Лаўрынам Войнаю была складзена пісцовая кніжка, у якой пры апісанні зямель сяла Сошна ёсць такі запіс: "… урочище Комарка начинается от дороги, идущей из Сошна в Погост, и окружена с трёх сторон болотом…" (22, с. 149) Такім чынам, пры апісанні Сашэнскіх зямель выпадкова ўзгаданы Пагост.

**Выпадковыя звесткі:**

**Узгадана дарога Сошна – Пагост** (1561 – 1566 годы)

**Узгаданы сяляне, жыхары Сошна** (1561 – 1566 годы) (22, с.143)

1. Марцін, Васіль і Андрэй Антановічы.
2. Міхаіл Алешковіч.
3. Рыгор Анісімовіч.
4. Сямён і Андрэй Аначычы.
5. Кунец Грыневіч.
6. Гаўрыла і Сямён Грыцэвічы.
7. Ігнацій Ерэмеевіч.
8. Міхаіл і Навум Івановічы.
9. Манеч, Якаў, Марцін і Павел Кандратовічы.
10. Іван Тышкевіч.
11. Конан Канцэвіч.
12. Сямён Лук'яновіч.
13. Зенон Макаровіч.
14. Кузьма, Іван і Міхаіл Максімовічы.
15. Кандрат і Васіль Марціновічы.
16. Амельян і Маісей Меляховічы.
17. Іван Міхновіч.
18. Іван Піскун.

19. Іван, Ігнат, Андрэй і Рыгор Праневічы.
20. Ждан Сяневіч.
21. Радко, Павел і Васіль Фомічы.
22. Фама Хадычыч.

З матэрыялаў Пінскага земскага суда вядома, што ў 1652 годзе Багдан Рыбко і яго жонка Алена прадалі панам Есману і Пятру Гарэглядам Вылазскім сёлы Сошна і Вылазы. (63)

## 6.3. Дубнавічы

Першы пісьмовы ўспамін сяла Дубнавічы – 12 кастрычніка 1539 года. Менавіта ў гэты дзень адбыўся падзел спадчыннай маёмасці Радзівілаў на тры часткі. Сяло Дубнавічы ў складзе маёнтка Бобрык, як Парахонск, Пагост, Камень і іншыя сёлы, дасталася Юрыю Мікалаевічу, ваяводзе Віленскаму, гетману найвышшаму ВКЛ. (28)

**11 верасня 1546** года баяры з Дубнавіч Стэфаң Галаўня, Федзь Арцюшэвіч Навіцкій, Грыц Іванавіч, Федзько Маневіч, Марцін Юцэвіч, Апанас Васілевіч, Цішко Грыньковіч з пляменнікамі Матфеем, Данілам, Шчасным, Міхно і Кузьмою пажадалі паставіць у сяле Дубнавічы царкву Божую ў імя святой Пятніцы. Дагэтуль іх продкі, і бацькі, і яны самі, пераадольваючы пэўныя цяжкасці, хадзілі ў Парахонскую царкву Прачыстай Багародзіцы. Выконваючы пажаданні сваіх продкаў і ўсіх людзей дубнавіцкіх, кожны баярын фундаваў частку сваёй маёмасці на царкву святой Пятніцы "святару на пажытак". Так, напрыклад, Стэфан Галаўня даў два поля, што за Глыбокаю лазою і пад рэчкаю, сенажаць на Чэшніве, дзесяць дрэў бортных і дзьве сасны з пчоламі. Усяго баяры далі 87 дрэў бортных і 10 сосен з пчоламі. Фундавалі баяры пашныя землі, сенажаці, нівы, малыя і вялікія вастравы з палямі, пропашамі і сенажацямі. Дубнавіцкаму святару дазвалялася карыстацца ўсімі пажыткамі баяр: ловы звярыныя, рыбныя, уюнныя і інш. А к таму ў млыну сумесным, што на рацэ Бобрык, ён мае права малоць на патрэбы свае без меркі. Усё гэта было запісана ў ліст на царкву святару на вечныя часы. (8, с. 14-17)

З гэтага фундушовага запісу можна зрабіць вывад, што не меньш чым за 75 гадоў да будавання царквы ў Дубнавічах жылі баяры, нягледзячы на вастраўную, а значыць, забалочаную мясцовасць. У лісце гаворыцца аб іх бацьках і продках, якія хадзілі праз балоты, па бездарожжы ў Парахонскую царкву Прачыстай Багародзіцы. Тры пакаленні, гэта не менш, чым 75 гадоў. Значыць, Дубнавічы існавалі не пазней, чым з 1470 году. Нагадаю, што афіцыйна першы ўспамін Дубнавіч – 1539 год. (7. с, 208) Дарэчы, Парахонск павінен быць значна раней, бо царква там ужо была, калі людзі з Дубнавіч хадзілі туды. Пешы афіцыйны ўспамін Парахонска – 1512 год. (7, с. 227) Узровень вышынь сяла Дубнавічы 135-136 метраў, а Парахонска 135-146 метраў. Адлегласць паміж Дубнавічамі і Парахонскам 6 км, а паміж Дубнавічамі і Пагостам 7 км. Амаль аднолькава.

**Выпадковыя звесткі:**

**Дубнавічы існавалі ў 1470 г.**

Парахонск існаваў значна раней, чым у 1470 г.

Парахонская царква Прачыстай Багародзіцы існавала ў 1470 г.

Дубнавіцкая царква Святой Пятніцы пабудавана ў 1546 г.

**Не ўзгаданыя: Пагост, пагосцкая царква і Бакінічы.**

Першы афіцыйны ўспамін:

Дубнавічы – 1539 г. (7, с. 208)

Парахонск – 1512 г. (7, с. 227)

У 1645 годзе выпадкова ўзгаданыя **Іван Хаценіцкі** і **Івашка Лабецкі**, дваравыя баярына дубнавіцкага **Есмана Навіцкага.** (40, с. 204)

## 6.4. Сташаны (Сташанічы, Сташчаны)

Сяло Сташаны здаўна звязана з такім заможным літоўскім баярскім родам, як Завішы. Яны прынялі герб "Лебедзь" на Гарадзельскім з'ездзе 1413 года. Ян Завіша, двараніи гаспадарскі ў 1491 г., меў трох сыноў: Юрыя, Яна і Андрэя. **Юрый** быў суддзёй земскім дарагічынскім і значным землеўладальнікам, яго ўдава ў 1528 годзе ставіла ў войска 34 коннікаў. Юрый Янавіч меў чатырох сыноў: Мікалая, Яна, Альбрэхта і Крыштафа, якія ўсе чацвёра не пакінулі нашчадкаў. Брат Юрыя **Ян** у маладосці служыў Радзівілам, быў старастам любашанскім, жыжморскім і падстолім ВКЛ, памёр без нашчадкаў. (17, с. 638) Спадчына братоў Юрыя і Яна перайшла да трэцягя брата Андрэя.

**18 мая 1517** года па загаду караля Жыгімонта былі прызначаны камісары з ліку гаспадарскіх баяр, то бок дваран, якія разглядалі скаргу паноў **Завішаў Юрыя** і **Яна** на князя Пінскага Федара Іванавіча Яраславіча, які не прызнаваў меж, раней абазначаных. Усе бакі разам агледзелі межы маёмасці Завішаў з землямі пінскімі. Аказалася, што людзі Завішаў, **сташаніцкія**, у ловах пінскіх дубраўных, памі-ма старых роспашаў, новыя распахалі, якія ідуць ад **сяла Сташанічы.** Але пры разглядзе скаргі Завішы і Федар Іванавіч адзін аднаму крыўды папусцілі, і камісары паразуменне гэтае афармілі як двухбаковую згоду судовым лістом.

Дзякуючы гэтай справе адносна зямельных межаў і новараспаханых палёў мы пазналі пра сяло

Сташаны, пра гаспадароў сяла і памер зямель, якія адносіліся ў той час да сяла, а мяжа сташаніцкая пачыналася ад маёнтка паноў Завішаў, ад падгацця, да ўрочышча Зярэменскага, што за Асташкавым лесам. Затым праз даліну ўпоперак **Чэрніцкай** дарозе, якая ідзе да **Падгацця**, а ад той дарогі ў Хатомльскі лес да вялікай дарогі, якая ідзе і бяжыць да Ясельдскага мосту, а ад той дарогі да Дзярэзнага лесу (ад слова "дзераза"), а затым да Кадзіцкай стругі, што пасярод Кахоўскага лесу. І той стругаю ўверх да сенажаці Галавенчыцкай на рог вялікага лесу, затым у **Халопіна**. А ад Халопіна да Старынскага лесу і да Мядзвежага лесу, да вялікай дарогі Пінск – **Велясніца**. Па дарозе ўправа на двор Шудовіча і тою дарогаю да рэчкі Мастоўка, і рэчкаю ўніз да млынішча, затым да стокаў і да другога млынішча, а адтуль да вялікага броду і да дарогі звечнай каралеўскай. Ад той дарогі да дуба, што на ясельдскай дарозе, а адтуль проста ў балота да ракі Ясельда.

Мяжа ад сяла Сташанічы пачынаецца ад водступа, ад **Хатомля** ў машок (ад слова мох), а з машка ўпоперак дарогі, што ідзе ад **Новага Двара на Забараўцы**. Ад дарогі ў другі машок, затым вуглом упоперак дарогі, што ідзе ад **Сташаніч** да сяла **Жасны**, а адтуль упоперак дарогі, што ідзе ад Пінска да княжацкага двара Забараўцы да ловаў, а ад той дарогі да лесу і броду, а ад лесу ўпоперак дарогі **Азарыцкай**, што ідзе ад Сташаніч. Ад дарогі да далінкі, якая каля дарогі вялікай ідзе да Ясельдскага мосту ад Сташаніч.

Па той дарозе направа да ракі, у мосцішча вышэй **Стаўка** і тою ракою да млына і да запруды. Ад млына да водступу, да першай мяжы, да палёў Жаслы, **Радзілава** і **Цесны**. (27, с. 26-29)

На жаль, адсутнічаюць звесткі пра людзей, якія жылі ў той час у сяле Сташаны, але ёсць дакумент ад 1557 года, у якім узгаданы чатыры сташаніцкія селяніны:

**Пронец Максімовіч, Антон Мелешковіч, Іван і Сцяпан Каленіковічы.** (25, с. 74)

На стан 12 лютага 1646 г. сяло Сташаны належала **Яну Каралю Копцю**, і выпадкова ўзгаданы два жыхары **Грыц Антановіч** і **Хвядко Жваніковіч.** (59, с. 347)

Пры аглядзе меж зямель Завішаў былі ўзгаданы такія сёлы, як **Забараўцы, Велясніца, Хатомль, Жасна, Азарычы** (Ожарычы, Озарычаны), **Чэрнеевічы** (Чэрнічы), **Ставок, Сташаны** (Сташанічы, Сташчаны), **Новы Двор** і Падгацце, Халопін, Радзілава, Цесны. А вось пра Чухава, Ботава, Пагост і Лышча ўспаміну няма, хаця Чухава пры разглядзе такой справы маглі зачапіць, калі б сяло гэтае насамрэч было, бо дарога на Забараўцы павінна была праходзіць каля Чухава, калі не праз само сяло, як цяпер. Па той дарозе ад Чухава да Дабраслаўкі ці Лышча, то бок да былога Віленскага гасцінца, можна і сёння дабрацца, тым больш на кані.

**Выпадковыя звесткі:**

**<u>першае ўпамінанне 18 мая 1517 года:</u>**

**Сташаны, Новы Двор, Ставок, Азарычы, Велясніца, Забараўцы, Чэрнеевічы,** Хатомль, Халопін, Падгацце, Жасны, Радзілава, Цесны.

Першы афіцыйны ўспамін:

Сташаны – 1557 г. (7, с. 236), Новы Двор – 1562 г. (7, с. 225), Ставок – 1552 г. (7, с. 235), Азарычы – 1539 г. (7, с. 192), Велясніца – 1552 г. (7, с. 199), Забараўцы – 1556 г. (7, с. 208), Чэрнеевічы – 1552 г. (7, с. 242)

Пагост не ўзгаданы.

## 6.5. Новы Двор

**18 мая 1517** года па загаду караля Жыгімонта былі прызначаны камісары з ліку баяр, якія разгледзелі скаргу паноў Юрыя і Яна Завішаў на князя Пінскага Федара Іванавіча Яраславіча. Справа па зямельных межах і новараспаханых сялянамі палях вырашылася двухбаковым пагадненнем, але пры аглядзе граней, то бок межаў зямель Завішаў і Фёдара Іванавіча, была ўзгадана дарога **Новы Двор – Забараўцы.** (27, с. 28) Менавіта гэты дакумент можна лічыць пісьмовай крыніцай аб першым упамінанні Новага Двара – **18 мая 1517 г.** Афіцыйна першы ўспамін Новага Двара – 1562 г. (7, с. 225)

6 сакавіка 1524 года баярын Клецкі Федар Пятровіч Шчэпа звярнуўся да каралевы Польскай і Вялікай княгіні Літоўскай з тым, што ён мае маёмасць, "отчызну" сваёй першай жонкі Марыны Юр'еўны Анцушковіч: Гогалеў Дварэц і двор у Жабчыцах з дворышчамі да іх у дзесяці сёлах Пінскага павета, у тым ліку ў Новым Двары "полчетверта дворышча"* і дворышча ў Пінску. Дзеля таго, каб пацвердзіць "отчызну и дедицтво"** сваёй першай жонкі Мары-

---

* Полчетверта дворышча – гэта палова чатырох існуючых дворышч у Новым Двары, то бок два дворышчы з чатырох. Так княгіня Алена паясніла ў прывілеі словы "парабак самачвэрт", гэта сам, то бок адзін парабак з чатырох. Значыць, "полчвэрт" па аналогіі будзе палова з чатырох. (25, с. 223)

** отчызна и дедицтво – атрыманнае па спадчыне пераважна дзедаўскага зямельнага валодання. (43, с. 12)

ны Юр'еўны Анцушковіч, Федар Шчэпа прывёў у якасці сведкаў баяр Пінскіх і сам пры гэтым прысягнуў, што продкі ягонай жонкі выслужылі тую маёмасць у Вялікіх князёў Вітаўта і Жыгімонта, а валодалі тымі маёнткамі продкі жонкі, таксама *ягоныя продкі*, а затым *і ён сам* пры княжанні Казіміра і Аляксандра. У Федара Шчэпы ад Марыны застаўся сын Іван, і Федар прасіў у каралевы Боны, каб сына і яго самаго пакінулі пры той атчызне і дзедзіцтве. (25, с. 273-274) З гэтых строчак прывілея можна зрабіць дапушчэнне, што бацькі, а можа, нават яшчэ і дзяды Федара і Марыны былі сябрамі, а можа, сваякамі ці роднымі. Марына рана асірацела, і бацькі Федара сталі юрыдычнымі апекунамі, таму і валодалі маёмасцю Анцушковічаў да паўналецця Марыны, пасля чаго Федар і Марына ажаніліся, і Федар стаў валодаць тымі маёнткамі. Усё гэта падрабязна і пераканаўча неабходна было патлумачыць каралеве Боне.

У Вялікім княстве Літоўскім дзейнічалі судзебнікі, прывілеі Вялікіх князёў, а затым статуты, якія гарантавалі недатыкальнасць маёмасці і пераход яе да самых родных. Так, у Прывілеі Уладзіслава ад 1387 года сказана, што ад "…дачкі, унучкі, якой-небудзь сваячкі … уладанні адыходзяць да яе дзяцей, калі яны ёсць, а калі няма, то да бліжэйшых сваякоў таго, ад каго яна атрымыла гэтую маёмасць". (19, с. 427) А ў Прывілеі Аляксандра ад 1492 года у 30 артыкуле гаворыцца: *"Ад крэўных і сваякоў мы не будзем адбіраць спадчынных добраў, і іх ніхто не павінен*

*адымаць на шкоду гэтых крэўных і сваякоў, як толькі той, хто будзе самым блізкім. Ён атрымае і будзе валодаць спадчыннымі добрамі ...".* (19, с. 435)

Менавіта па гэтай прычыне Федар Шчэпа так сур'ёзна ставіўся да свайго візіту да каралевы. У выніку ўся маёмасць, належачая ягонай жонцы Марыне Юркаўне Анцушковіч была пацверджана Федару Пятровічу і ягонаму сыну Івану. (25, с.273-274) Праз чатыры гады ў Вялікім княстве Літоўскім з 1528 года пачаў стварацца попіс войска, згодна якому баярын Федар Шчэпа павінен быў ставіць у войска ўсяго 5 коней, у тым ліку ад маёмасці з Пінскага павету 3 кані. (31, с. 151, 152)

Прыкладна ў 1541 годзе Федар Шчэпа памёр, і ўся ягоная маёмасць адышла да сына Івана. (25, с. 275) Іван ажаніўся з **Філіцыяй**, і ў іх нарадзілася два сыны, аднаго з іх звалі Мікалай. У 1558 годзе Іван Шчэпа памёр, пакінуўшы тэстамент, згодна якому на жонку Філіцыю ён усклаў апякунскі абавязак. Філіцыя двойчы пасля Івана выходзіла замуж, а выкананне апекі над дзецьмі і маёнткам Івана разглядалася старастам Пінскім Пятром Мыльскім па скарзе стрыечнага брата Івана, Федара **"Олешыча"**, які прасіў, каб на яго ўсклалі апякунскі абавязак догляду маёнтка і пляменнікаў. Але староста Пінскі і каралева Бона не знайшлі парушэння правоў дзяцей і пакінулі апеку за Філіцыяй. (27, с. 70-71)

У 1559 годзе па загаду караля і вялікага князя Жыгімонта II Аўгуста ва ўсіх паветах ВКЛ павінна была быць зроблена рэгістрацыя прывілеяў і лістоў на

дворышчы і маёнткі для складання рэестра ўваходаў у пушчы. З гэтай нагоды староста Мсцібагоўскі Рыгор Валовіч запрасіў да сябе зямян, баяр і шляхту. **15 мая 1559 года** **Мікалай Шчэпа** паказаў свой прывілей старасце, які аднавіў для ўсіх яго людзей уваходы ў пушчу для кожнага сяла, а напрыканцы ўказаў, што людзі з маёнткаў Жабчыцы і **Новы Двор** павінны хадзіць у пушчу паміж людзьмі Сташаніцкімі і людзьмі з *Пагосчыны* да Каўняціна. (25, с. 103) Гэты факт можа гаворыць аб тым, што паміж Сташанамі і Пагостам ніякіх сёл на той час не існавала. А тое, што Новы Двор у 1559 годзе быў маёнткам, зафіксавана ў дакуменце на ўваходы, выдадзеным Войну Грычынавічу: "… ад маёнка зямянскага Новага Двара …". (25, с. 133) Дарэчы, па выпадковых звестках вядома, што Мікалай Іванавіч Шчэпа на стан 1563 года лічыцца земянінам павету Пінскага. (27, с. 147) Маёмасць Мікалая значна зменшылася, верагодна, не стала клецкай маёмасці, бо згодна рэестру попісу войска літоўскага 1565 году, ён ставіў паводле павіннасці 2 кані, а не 5, як ягоны дзед Федар. Напэўна, Мікалаю Іванавічу на той час была зроблена прапанова на каралеўскую службу, і з гэтай нагоды ён паставіў на ласку гаспадарскую яшчэ 2 кані. (33, л. 44аб.) У 1567 годзе Мікалай Іванавіч Шчэпа, дваранін караля, яго міласці ставіў ужо 3 кані і аднаго воіна пешага з маёнткаў Жабчычы і Новага Двара. (33, л. 735аб.)

**3-га жніўня 1608 года** Рыгорам Валадкевічам зроблена абмежаванне маёнтка Новы Двор. Мяжа

пачынаецца з усходу сонца ад ракі Бобрык на **Вязаўскае балота,** дзеліць гэтае балота на палову, другая частка якога – гэта маёмасць каралеўскага двараніна пана Внука, гаспадара сяла **Бакінічы**. З Вязаўскага балота ідзе на ўрочышча **Вязкае балота,** а з Вязкага балота міма Сіліні балотамі на Сукаваты востраў, ад таго востраў ідзе міма Бакініцкага Доўгага балота да Язвава, і там пята Бакініцкая з Навадворскай заканчваецца. Ад пяты Бакініцкай ідзе на Nice Лозы, дзе студня, а ў той студні тры дубовыя слупы, міма востраў Вавілічы, ад Вавіліцкага востраў ідзе да Вялікага лесу, у якім стаіць пята **Сашэнская** і **Гарадзішчанская**, затым мяжа ідзе да Перадзела, дзе стаіць пята **Купяціцкая**, ад Перадзела і Купяціцкай пяты ідзе на Хрэзіт лес да густых бярэзін, у якіх стаіць пята Любелянская *(сяло Любель)*. Ад пяты Любелянскай і ад Густых Бярэзін мяжа іде да **Панцілеева** (*балота*) на пагорак пад назначаныя сосны, гэта і будзе пята Кошчыцкая (*Koszczyckiey*, цяпер урочышча Кохавічы), ад якой ідзе да Голага балота. Затым мяжа ідзе ў **Мядзвежы востраў** да густога алешніку, дзе стаіць пята **Сташаніцкая**. Ад востраў балотам да Бляскавага поля, на канцы якога стаіць капец, і называецца тая пята **Каўняцінскай**. Ад капца і ад пяты Каўняцінскай мяжа **ідзе мохам** на востраў урочышча Бокалаў (*Bokolow*), на якім стаіць пята **Лышчанская**, ад каторай мяжа ідзе да вярбы (*Wierbca*) і да ракі Вісліцы, якая ўпадае ў возера Навадворскае і Пагосцкае. (8, с. 70, 71)

Пры апісанні мяжы Новага Двара ўспамінаюцца сёлы **Бакінічы**, Сошна, Гарадзішча, Купяцічы, Любель, Сташаны, Каўняцін, Лышча. А пра сяло Вяз не ўзгадана, значыць, яго на той час яшчэ не было. Узгадваюцца толькі Вязаўскае і Вязкае балоты. Ад назвы нейкага з іх было названа будучае сяло Вяз. **Для сяла Бакінічы гэта першы ўспамін (03.08.1608 г.).** Пра сяло Чухава не ўзгадваецца, хаця праз Лышчанскую пяту мяжа праходзіць.

Такая вось была мяжа маёнтка Новы Двор, і такая балоцістая мясцовасць была вакол гэтага сяла ў жніўні 1608 года. А валодаў Новым Дваром у той час земянін пінскі Рыгор Валадковіч, які купіў у вечнасць палову маёнтка ў земяніна пінскага Геліяша Шчэпы памерам 5 увалок з грунтамі пашнымі, сенажацямі поплыўнымі і балотнымі, з возерам у Новым Двары ляжачым, з вольнай лоўляй рыб невадам і ўюноў, з барамі, лясамі, дубравамі, з усялякімі грунтамі сухімі і воднымі, з рэкамі, балотамі, багнамі, з подданымі і іх службамі і павіннасцямі, з данню мядоваю, з дрэвам бортным, з ловамі звярынымі і птушынымі, з гонамі бабровымі, што з даўніх часоў да тых 5 увалок належала **Геліяшу Шчэпе**.

Другую палову маёнтка Рыгор Валадковіч таксама купіў у вечнасць у пінскага земяніна **Дадзібога Мацкевіча** практычна на тых жа ўмовах, што і у Геліяша Шчэпы. На той час, у 1646 г., Геліяш Шчэпа – зямянін павету Пінскага, слуга кашталяна Новагародскага Багдана Статкевіча і ягонай жонкі Ганны Радзімінскай, валодаўшай маёнткам Пагост на правах застаў-

ной ад першага мужа Гарайскага. (40, с. 299, 21) Верагодней усяго, Геліяш – унук Мікалая Шчэпы, а пра Дадзібога Іванавіча Мацкевіча, уладальніка другой паловы Новага Двара, вядома, што ён земскі суддзя Пінскага павету. Адзін з яго маёнткаў так сама, як і ў Анцушковічаў – Жабчыцы. Ягоны продак "Олізароўскі" – фундатар Жабчыцкай царквы. Жонка Мацкевіча Марына Долгерд. (44, с. 344-350)

У 1534 годзе Каралева Бона пацвердзіла баярыну Пінскаму Алізару Дзмітрыевічу і ягонаму брату Івану іхнюю атчызну і дзедзіцтва – маёнткі Жабчыцы і Нянкавічы, якія іх продкі выслужылі ў Вітаўта і Жыгімонта і валодалі тымі маёнткамі пры княжанні Казіміра і Аляксандра. (25, с. 65-66) У 1545 годзе Алізар падараваў маёнтак Нянкавічы свайму пляменніку Міхаілу Цэнюку, а ў 1554 годзе і Дварэц Нянкавічы. У 1558 годзе Жыгімонт Аўгуст пацвердзіў дароўныя лісты і тэстамент Алізара Дмітрыявіча і выдаў свой ліст Міхаілу Цэнюку на валоданне маёнткамі Жабчыцы і Нянкавічы. (25, с. 67-70) А ў 1565 і ў 1567 гг. Міхаіл Цэнюка з братам Астапам штогод ставілі 3 кані. У XVIII томе Актаў віленскай археаграфічнай камісіі гаворыцца аб тым, што на стан 20.02 1646 г. сяло Новы Двор належыць Дадзібогу Маскевічу. (59, с 347)

У 1651 годзе Дадзібог Янавіч Маскевіч, які прадаў сваю палову маёнтка Новы Двор Рыгору Валадковічу, у сваім тэстаменце ўзгадвае свайго продка Алізароўскага, які фундаваў зямлю з маёнтка Жабчыцы ў Жабчыцкую царкву. Алізар Дзмітрыевіч і мог быць

тым Алізароўскім, бо менавіта ў яго князь Пінскі Федар Іванавіч адняў зямлю з маёнтка Жабчыцы і аддаў яе Уладыку Пінскаму. Каралева дала загад старасту Пінскаму вярнуць зямлю. (25, с. 65, 66) Але выканаць такі загад няпроста, і староста мог даць яму замену, нейкую другую зямлю, а Алізар мог тую Жабчыцкую зямлю нібыта фундаваць царкве. У такім выпадку атрымоўваецца:

1. Дадзібог Маскевіч, які прадаў палову маёнтка Новы Двор, нашчадак Алізара, якому дасталіся ў спадчыну ад яго бацькі Дзмітрыя маёнтак з дварцом Нянкавічы і маёнтак Жабчыцы з паловай сяла Новы Двор, якія ён атрымаў у спадчыну ад дзядоў, *якія выслужылі гэтую маёмасць у Вітаўта і Жыгімонта, а затым валодалі пры Казіміры і Аляксандры.*

2. Геліяш Шчэпа, які прадаў палову маёнтка Новы Двор, нашчадак Федара Шчэпы, мужа Марыны, якой дастаўся ў спадчыну ад яе бацькі Юрка маёнтак Жабчыцы з дварцом Гогалеў з паловай сяла Новы Двор, *які атрымаў ён у спадчыну ад дзядоў, якія выслужылі гэтую маёмасць у Вітаўта і Жыгімонта, а затым валодалі пры Казіміры і Аляксандры.*

У 1528 г. Міхаіл Цянюк ад маёмасці Дзмітрыя павінен быў ставіць 3 кані.

У 1528 г. Мікалай Шчэпа ад маёмасці Юрка павінен быў ставіць 3 кані.

Напрошваецца вывад: Дзмітрый (напэўна, Дзімко) і Юрко родныя браты, якім іх бацька Анцушковіч (напэўна, сын Анцушко) пад-

**зяліў маёмасць пароўну і будучы Новы Двор у тым ліку.**

Выходзіць, што Рыгор Валадковіч купіў маёнтак Новы двор у братоў па матчынай лініі, сёмых ад таго продка Анцушковіча.

Паўстае пытанне, ці ведалі пра гэта Дадзібог і Геліяш? Мне здаецца, што не ведалі. Ні ў адным дакуменце на гэта няма нават намёку. Дадзібог у тэстаменце ўзгадаў свайго продка Алізаровіча ў сувязі з ягоным фундушам на царкву, хутчэй за ўсё, па падказцы святара, які і прысутнічаў пры рэгістрацыі тэстаменту. Святар тым самым вельмі далікатна нагадаў Дадзібогу, што акрамя продка Алізара, і ягоны бацька Іван у сваім тэстаменце пісаў пра пяць увалок зямлі, фундаваных на царкву, што так і засталося невыкананным. Дадзібог дадаў да тых пяці яшчэ ад сябе дзве ўвалокі. Святар паспрыяў тым самым таму, каб Дадзібог праз свой тэстамент даў нам станоўчую падказку для разгадкі рода Анцушковічаў, то бок пра радавод Новага Двара…

**31 студзеня 1648 года** да суддзі Пінскага Уладзіслава Пратасовіча звярнуўся Рыгор Валадковіч з лістом аб дабравольнай перадачы маёнтка на ўтрыманне манахаў заснаванага ім манастыра Грозаўскага, у якім ужо жылі манахі пад паслушаннем старэйшага ў веры старадаўняй рускай (Кіеўскай), не ў уніі будучай. Манастыр свой Грозаўскі ён просіць падчыніць пад уладу брацтва Віленскага Свята-Духаўскага манастыра. (8, с. 139-142)

У Пінскім павеце здаўна існаваў яшчэ адзін Новы Двор. Цяпер ён называецца Новы Дварэц, а ў дакументах XVI стагоддзя яго называлі "Новы Дварэц Крапотчычы", і нават у адным і тым жа дакуменце называлі яго адначасова і Новым Дваром. (25, с. 223) Каб не пераблытаць Новыя Двары, трэба вельмі ўважліва чытаць дакумент, а нават і адразу тры, як у нашым выпадку.

*Першы прывілей.* **28 кастрычніка 1504 года** ў Стаўку пабудавалі царкву Святых Якіма і Ганны, і сваім прывілеем князь Пінскі Федар Яраславіч абавязаў Новы Двор наш кожны год даваць папу Ставоцкаму дзесяціну з усяго збожжа, а калі хто не стане выконваць таго, то будзе праклёны навекі. (25, с. 221) *Другі прывілей.* У 1519 годзе князь Пінскі ўстанавіў павіннасць да млына Навадворскага ў Двары нашым Новым на дзесяты дзень дзве меркі вымелкаў на карысць той жа Ставоцкай царквы, а хто парушыць гэтае ягонае рашэнне, той апынецца перад Богам на страшным судзе. У 1545 годзе каралева Польская і Вялікая княгіня Літоўская запрасіла да сябе Уладыку Пінскага і Тураўскага Варламія і запытала, чаму даніну з млына Навадворскага ён бярэ сабе, а не аддае Ставоцкай царкве, як указана у прывілеі. І чаму з таго ж Навадворскага збожжа дзесяціну ён таксама бярэ сабе, а на Ставоцкую царкву не дае. Каралева Бона ўказала Варламію, каб усё тое, што ў прывілеях князя Федара Іванавіча напісана, папоўнена было, а надалей выконвалася. (25, с. 224)

*Трэці прывілей.* Ён быў паказаны каралеве Боне святаром Ставоцкай царквы разам з папярэднімі і са скаргай аб невыкананні папярэдніх прывілеяў. Гэта прывілей на карысць царквы Ражства Божай Прачыстай Богамацеры Новага Дварца Крапоччычы з млынам, з зямлёю пашнаю і іным. У прывелеі так і напісана "дварэц наш новы Крапоччычы". (25, с. 223) А ў копіі зверху тым часам напісана "прывілей на Новы Двор". Прывілей гэты ўдакладняў тым самым, які Новы Двор меўся на ўвазе ў папярэдніх двух прывілеях князя Пінскага. Так, у прывілеі ад 1504 года ёсць запіс "з Новага Двара нашага". У прывілеі ад 1519 года запіс "у Двары нашым Новым з млына нашага Навадворскага". Гэтыя запісы і наводзілі блытаніну з Новымі Дварамі, як два Пагосты ў Пінскім павеце. Новы Дварэц з млынам і царква ў ім, таксама Ставок са сваёю царквою – гэта справы Уладыкі Пінскага і Тураўскага, таму каралева Бона і разбірала тую скаргу папа Ставоцкага з уладыкам. А Новы Двор, што на беразе Навадворскага, а потым Пагосцкага возера, ніякага дачынення да тых спраў царкоўных не меў. Дарэчы, і млына Новы Двор мець ніяк не мог, бо пры апісанні меж Каўняцінскіх зямель у пісцовай кніжцы ад 1561 года ўзгадваецца сташаніцкая мельніца. (22, с. 315) Яе павінна было быць дастаткова як людзям сташаніцкім, так і навадворскім і нават каўняцінскім.

Што тычыцца даўніны існавання Новага Двара, то згодна вышэй пералічаных фактаў, продкі Анцушковічы атрымалі маёмасць ад Вітаўта і Жыгімонта.

Вітаўт княжыў у 1392–1430 гг., а Жыгімонт у 1432–1440 гг. Гарантавана гэта магло быць паміж 1430 і 1440 гг. У гэтыя годы, напэўна што, маёнтак Жабчыцы існаваў, але нават у 1440 годзе Новы Двор існаваць на тым месцы, дзе ён размешчаны цяпер, не мог па прычыне таго, што ў той час на тым месцы было возера. Зараз сяло Новы Двор мае вышыню над узроўнем мора 134 м, месцамі 138 м, а вада ў вадасховішчы 133 м. Тым часам узровень вышыні вады ў возеры ўвесну ў 1970 гады дасягаў 133 і больш метраў. (Узроўні вышынь мясцовасці памераны каля сяла Пагост, якія кожны год заліваліся павадкам.) Такім чынам, дастаткова падняцца вадзе на 1 метр, і амаль увесь Новы Двор апынецца пад вадою. Нагадаю, што ўзровень вады ў Піне каля Пінску ў 1850 годзе быў амаль на тры метры вышэй, чым цяпер. Тое, што ў 1440 годзе ўзровень вады ў возеры быў больш тых трох метраў, сумневу ў мясцовых жыхароў не выклікае. Яны добра памятаюць веснавыя павадкі сямідзесятых гадоў, калі ў многіх вада стаяла ля ганка, а па вуліцах хадзілі па кладках. Сташаны, напрыклад, размешчаны на вышыні 145-152 м, Жабчыцы маюць вышыню да 147 м, а гэта сведчыць аб тым, што ў тых сёлах на тых жа месцах маглі жыць людзі спрадвеку. Спрадвеку і нават ад веку каменнага, ад той самай першай на Пагосцкім узбярэжжы і адной з буйнейшых ва ўсходняй Еўропе мезалітычных стаянак, стаянкі Новы Двор-1, жылі і людзі навадворскія, але не там, дзе цяпер, а на пагорках калгасных палёў, на якіх узровень вышыні дасягае 140 метраў.

І жылі яны так, як усе раней жылі – дворышчамі, то бок хутарамі, якія і аб'ядноўваліся ў сёлы. Вось толькі ці была такая назва сяла заўсёды – невядома. Вядома толькі, што ў 1517 годзе сяло называлася Новы Двор.

Выпадковыя звесткі:

першае ўпамінанне сяла Новы Двор 18 мая 1517 г.

першае ўпамінанне сяла Новы Дварэц 28 кастрычніка 1504 г.

першае ўпамінанне сяла Ставок 28 кастрычніка 1504 г.

першае ўпамінанне сяла Бакінічы 03 жніўня 1608 г.

узгадана Вязаўскае і Вязкае балота 03.08.1608 г.

узгадана Пагосчына 15 мая 1559 года

Чухава і Ботава не ўзгаданы

Вяз не ўзгаданы

Узгаданы жыхары ў Новым Двары на стан 12 лютага 1646 г.:

войт **Цімоха Кавалевіч**, ігумен цеперскі айцец **Міхайла Кгрековіч, Занко Лашэвіч, Сушко Рыловіч, Кахно Канцэвіч.** (59, с. 347)

Першы афіцыйны ўспамін:

Новы Двор – 1562 г. (7, с. 225)

Ставок – 1552 г. (7, с. 235)

Новы Дварэц – 1554 г. (7, с. 225)

# Радавод Новага Двара

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | **Анцушковіч (Анцушко)**<br>(бацька Юрка і Дзімка) | **Новы Двор**<br>у маёнтку Жабчыцы | **1400-1440** |
| 2 | **Анцушковіч Юрко**<br>**Анцушковіч Дзімко** | **1/2 Новы Двор**<br>**1/2 Новы Двор** | **1450-1480**<br>**1450-1490** |
| 3 | **Петр Шчэпа**<br>(бацька Федара)<br>**Анцушковіч Дзмітрый** | **1/2 Новы Двор**<br><br>**1/2 Новы Двор** | **?**<br><br>**?** |
| 4 | **Марына і Федар Шчэпы**<br>**Алізар і брат Іван** | **1/2 Новы Двор**<br><br>**1/2 Новы Двор** | **1503 (?)-1524**<br><br>**?** |
| 5 | **Федар Шчэпа**<br>**Алізар** | **1/2 Новы Двор**<br>**1/2 Новы Двор** | **1524**<br>**1534** |
| 6 | **Іван Шчэпа**<br>**Міхайла Цэнюка**<br>(Пляменнік Алізара) | **1/2 Новы Двор**<br>**1/2 Новы Двор** | **1542**<br>**1558** |
| 7 | **Філіцыя**<br>(жонка Івана)<br>**Міхайла Цэнюка** | **1/2 Новы Двор**<br><br>**1/2 Новы Двор** | **1548**<br><br>**1567** |
| 8 | **Мікалай Шчэпа**<br><br><br><br>**Міхайла Ценюка** | **маёнтак Новы Двор і 1/2 сяла Новы Двор**<br><br>**1/2 сяла Новы Двор** | **1559, 1567**<br><br>**1559, 1567** |

# Радавод Новага Двара

| | | | |
|---|---|---|---|
| 9 | (сын Мікалая)<br>**Шчэпа** | **маёнтак<br>Новы Двор і<br>1/2 сяла<br>Новы Двор** | **?** |
| | **Іван Маскевіч**<br>(зяць Міхайла Цэнюка) | **1/2 сяла<br>Новы Двор** | **?** |
| 10 | **Геліяш Шчэпа** | **маёнтак<br>Новы Двор і<br>1/2 сяла<br>Новы Двор** | **?-1608** |
| | **Дадзібог Маскевіч** | **1/2 сяла<br>Новы Двор** | **?** |
| 11 | **Рыгор Валадковіч** | **маёнтак<br>Новы Двор і<br>1/2 сяла<br>Новы Двор** | **3.08.1608** |
| | **Дадзібог Маскевіч** | **1/2 маёнтка<br>Новы Двор** | **12.02.1646** |
| 12 | **Рыгор Валадковіч** | **маёнтак<br>Новы Двор** | **1646-1648** |
| 13 | **Мужчынскі<br>праваслаўны<br>манастыр “Грозавы”** | **маёнтак<br>Новы Двор** | **31.01.1648** |
| 14 | **Мужчынскі<br>базыліянскі<br>манастыр** | **маёнтак<br>Новы Двор** | **31.08.1722** |

## 6.6. Пагост (Зарэчны)

### (Пагосцє, Погосто, Пагошча, Зарэчнае)

*Пра харужага павету Пінскага,*
*войта Пінскага і Данілу з Пагоста.*

У ВКЛ права лясных уваходаў было адным з найбольш старажытных правоў не толькі сялянства, але і шляхты. Да XVI ст. яно не было рэгламентавана, і ўваходамі называўся увесь лес, куды толькі можа дайсці чалавек. *"... А лесъ намъ изъ вековъ воленъ..."*, – сведчылі мужы Караеўскай воласці ў 1530 годзе. Большасць уваходаў была рэгламентавана падчас правядзення рэвізіі пушчаў і пераходаў звярыных 1559 г., калі для кожнай вёскі і кожнага асобнага землеўласніка была дакладна акрэслена тэрыторыя ўваходаў у пушчы. (58, с. 42,43) Так, па загаду караля і вялікага князя Жыгімонта Аўгуста ў Пінскім павеце ВКЛ павінна была быць зроблена рэгістрацыя прывілеяў і лістоў на дворышчы і маёнткі для складання рэестра ўваходаў у пушчы на стан 1559 году. З гэтай нагоды староста Мсцібагоўскі Рыгор Валовіч запрасіў да сябе зямян, баяр і шляхту павету.

Харужы павету Пінскага Сямён Юхнавіч Орда **15 мая 1559** года паказаў лісты ад каралевы Боны на свае землі. Адзін прывілей на два дворышчы Якушоўскае і Бацечкоўскае **ў сяле Пагосце** ад **15 кастрычніка 1528 года.** Другі прывілей на чатыры дворышчы ў сяле Тыўронічах ад **10 красавіка 1532**

года. А дала каралева Бона тыя дворышчы яму і ягоным нашчадкам на вечныя часы, за што ён, а затым нашчадкі яго павінны ў час вайны службу ваенную служыць конна і бронна. (25, с. 81-83)

Войт Пінскі Андрэй Іванавіч Рошчына **15 мая 1559 года** таксама паказаў лісты на свае землі: на дворышча ў сяле **Пагосце на імя Казаноўскае** і палову дворышча ў сяле Сварычэвічы на імя Нераўшчына. (25, с. 325) Прывілей Івану Занковічу, цесцю войта, выдаў стараста Пінскі па загаду каралевы Боны ад **16 красавіка 1531 года,** згодна якому дворышча **ў Пагосце** пажалавана да ўласнай "атчызны" яго, а за гэта ён, а затым ягоныя нашчадкі павінны службу земскую служыць, то бок ваенную, а іншых служб ніякіх не меці.

Першы перапіс войска ВКЛ, які дайшоў да нас, мае назву "Ухвала на вялікім сойме Віленскім ад **1 мая 1528 года,** учынённая з боку абароны земскай, колькі хто з Паноў-Рад, ураднікаў і ўсіх абывацеляў ВКЛ з маёнткаў сваіх да службы ваеннай коней павінен ставіць". Там ёсць у Рэгістры Пінскіх баяр такія запісы: **"Даніла з Пагоста конь", "Сямён Ордзіч конь"** і там жа ў спіску "баяры Пінскія, што людзей не маюць", **"Іван Занковіч конь".** (31, с. 151)

Пры першым аглядзе прадстаўленных дакументаў адразу ўзнікае пытанне па датах як выданных прывілеяў, так і прыняцця самога попісу. Рашэнне па стварэнню попісу прынята на сойме **1 мая 1528** года, а прывілеі выдадены **15 кастрычніка 1528** года і **16 красавіка 1531** года, але тым не менш яны

ўвайшлі ў попіс, а вось прывілей, выдадзены 10 красавіка 1532 года, увайшоў толькі ў наступны попіс, у 1565 год. Чаму так здарылася і што гэта значыць?

Сойм – гэта саслоўна-прадстаўнічы орган ВКЛ, на якім дэмакратычным метадам прымаліся важныя рашэнні, ад абрання вялікага князя да абмяркоўвання і прыняцця кожнага пункту судзебніка ці статута дзяржавы і г. д. Амаль кожны сойм разглядаў пытанні, што тычацца паляпшэння матэрыяльнага забеспячэння войска, мер па кантролю раней прынятых норм, абавязкаў, ускладзеных на шляхетства, і іншыя. Віленскі сойм распачаўся ў красавіку 1528 года і скончыўся ў лютым 1529 года. Як заўжды, шмат пытанняў было разгледжана наконт войска. Да таго ж было ўхвалена правесці попіс войска. Іншымі словамі, на Віленскім сойме 1 мая 1528 года было прынята рашэнне па стварэнню попіса войска ВКЛ. Для таго, каб як мага дакладней выканаць гэтае рашэнне, была прадугледжана наступная абавязковая працэдура: "У кожным павеце дзяржаўца мусіў абраць двух зямян, якія павінны былі з дзякам аб'ехаць усе маёнткі, зарэгістраваць іх уладальнікаў і ўзяць пад прысягай у іх сведчанні адносна маёмасці кожнага чалавека. Дзяржаўцы разам з абранымі зямянамі і дзякамі павінны былі прадставіць рэестры попісу ваяводзе або галоўнаму старасце. Дзеля перапісу гаспадарскіх людзей, якія палягалі абкладанню грашыма і часткова вайсковай павіннасцю, былі разасланы пэўныя перапісчыкі". (34, с. 21-22) Асноўнае пры-

значэнне попісу 1528 году – гэта вызначэнне вайсковай павіннасці ў ВКЛ. Праца па складанні попісу доўжылася амаль чатыры гады. Попіс войска 1528 году гэта не перапісанае войска наяўна прыбыўшых ваяроў, як гэта рабілася ў 1565, а затым у 1567 гадах, а гэта спіс, па якім правяралі наяўнасць павінных прыбыць на аб'яўлены збор войскоўцаў. Па гэтай прычыне ўласна попіс войска ВКЛ 1528 году, у якім запісаны нейкі баярын, зямянін ці мяшчанін з якога-небудзь населенага пункту, не можа баць крыніцай першага ўспаміну гэтага населенага пункту. Напрыклад, запіс у перапісе 1528 году "Іван Занковіч конь" не адпавядае па даце прывілею, атрыманнаму ў 1531 годзе амаль на чатыры гады. Па гэтай прычыне запіс "Даніла з Пагоста конь" азначае толькі тое, што ў Пінскім павеце і нідзе болей быў Пагост, у якім нейкі Даніла меў зямлю прыватную ці дзяржаўную, і за гэта ён павінен быў несці ваенную службу. Калі менавіта быў занесены ў попіс 1528 году гэты нейкі Даніла, невядома. З іншага павету ў Пінскі павет попісу войска 1528 году ніякім чынам ніхто не змог бы быць упісаны, бо за гэта неслі адказнасць два зямяніна і дзяк з Пінскага павету, таксама уладальнік дворышча ці маёнтка і дзяржаўца гэтага павету. З якога боку ні паглядзі на гэтага Данілу – тут ну зусім не пра Пагост, які потым стаў Загародскім. Да Пагоста Загародцкага каралева Бона не мела ніякага дачынення, бо ён узнік у Новагарадоцкім павеце на тэрыторыі Бабрэцкай воласці, якая з 1495 году

была маёмасцю Радзівілаў. (18, с. 492-493) Каралева валодала з 1521 па 1556 год толькі Пінскам паветам. (27, с. 31, 32, 34)

У наступных попісах войска Літоўскага, якія праводзіліся ў 1565 і 1567 гадах ужо па факту прыбыцця войска на месца збору, Данілы больш няма, няма і Івана Занковіча, а Сямён Орда ёсць, і ставіць ён ужо па 2 кані. Справа ў тым, што акрамя атрыманага дворышча Акушоўскае ў Пагосце і яшчэ двух дворышч у сяле Лемяшэвічы і ў сяле Сушыцку, каралева Бона пажалавала Сямёну ў 1532 годзе яшчэ чатыры дворышчы ў сяле Тыўронічах. (25, с. 81-83) Уважліва чытаючы тыя прывілеі, можна зрабіць дапушчэнне, што Орда нёс ваенную службу харунжым павету Кракаўскага, менавіта гэты факт паспрыяў таму, што Бона пажалавала яму дзьве службы баярскія. Тым самым Сямёну было зроблена запрашэнне на службу харунжым павету Пінскага, і ён прыняў гэтае запрашэнне, хоць і ненадоўга. У 1565, а затым у 1567 гадах харужым Пінскім быў ужо Васіль Фёдаравіч, а Сямён Орда, як запісана ў рэестры, стаў служыць ваяводзе Кіеўскаму.

Замест Івана Занковіча ў 1565 годзе на службе ў войску быў ужо войт Пінскі Андрэй Рошчына (33, с. 311), які ў 1559 годзе перапісаў дворышча Казаноўскае ў сяле Пагост на сябе. (25, с. 325)

Так ці інакш, але з усяго сказанага вышэй мы бачым, што быў у Пінскім павеце такі Пагост, якім валодалі адначасова тры зямяніна, Іван Занковіч, Сямён Орда і Даніла. Для Івана і Сямёна тыя дво-

рышчы ў сяле Пагосце даваліся каралевай Бонай разам з землямі пашнымі і сенажацямі, з дрэвам бортным і ўваходамі ляснымі і дубраўнымі, з азёрамі і… іным у вечнасць. А павінны яны, і потым патомкі іх, з "атчызны" службаю ваеннаю служыці ў час вайны, то бок звычаем баярскім. Так яно і было. У 1528 годзе за адзін і той жа Пагост павінны былі служыць службу баярскую Іван Занковіч (цесць войта Пінскага), Сямён Орда (будучы харужы павету Пінскага) і зямянін Даніла. Пагост адзін, а дворышчы ў кожнага былі свае ў тым Пагосце.

Усе сёлы разам з дворышчамі, аб якіх ішла гаворка вышэй, знаходзяцца на поўдзень ад Пінска і Прыпяці. А той Пагост, акрамя ўсяго, стаіць на рацэ Стыр, і яго потым сталі называць Пагостам Зарэчным. У 1939 годзе Пагост Зарэчны быў перададзены ў склад УССР, дзе з 1940 года ён стаў цэнтрам раёну, і яго перайменавалі ў Зарэчнае. Гэта і стала прычынай блытаніны па яго гістарычнай спадчыне. У Пінску застаўся толькі Пагост Загародскі, і ўсё, што было звязана з Пагостам Зарэчным, беларускія даследчыкі прыпісваюць Пагосту Загародскаму. Памылкі дапускаюцца нават нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. Так, пад яе рэдакцыяй у энцыклапедыі "Гарады і вёскі Беларусі" Пагосту Загародскаму памылкова прыпісаны першы ўспамін Пагоста Зарэчнага з ягоным пагасчанінам Сямёнам Ордаю. (52, с. 442) Аб гэтай памылцы падрабязна напісаў Аляксандр Казак у сваёй кніжцы "Погост-Загородский: история местечка в записках

“тутэйшага”. (53, с. 14-16) Выклікае па меншай меры здзіўленне яго актыўная дзейнасць у наступстве па ўстанаўленні ў Пагосце Загародскім памятнага знаку з годам першага ўспаміну Пагоста Зарэчнага 1528. Дарэчы, на старонцы 16 той жа кніжкі ўказаны правільны год першага ўспаміну Пагоста Загародцкага – 1539. (53, с. 16)

Вельмі цікава ведаць, хто мог быць той “Даніла з Пагоста”, якога таксама, як і Сямёна Орду, уцягнулі ў блытаніну са спадчынай як Пагоста Загародскага, так і Пагоста Зарэчнага. У пісцовай кніжцы Хвальчэўскага на стан 1552-1555 гг. у Пінскім павеце ў сяле Пагосце дворышчам Крэглевічы валодаў падданы караля каваль Іван Чычын. (24, с. 264) Даніла мог быць Чычыным, бацькам Івана, таксама кавалём. Ва Уставах упраўлення каралеўскіх валасцей у пункце 48 гаворыцца, што “...пры гасцінцах і тых дарогах, дзе мы часцей бываем ... павінны быць кавалі...”. (26, с. 88) Пагост (Зарэчны) узнік на гасцінцы Пінск-Сарны, які злучаўся з важным гасцінцам Кіеў-Люблін, а значыць, каваль у Пагосце быў вельмі неабходны. Пацвярджэннем таму, што Даніла мог быць падданым караля, кавалём без прозвішча, проста Данілам, можа служыць пісцовая кніжка, у якой пералічаны кавалі гораду Пінску. Гэта Матфей каваль, Багдан каваль, Адам каваль, Ждан каваль. (22, с. 31, 35, 37, 39) Макара Марціновіча, дарэчы, таксама “прыпісалі” “Гарады і вёскі...” Пагосту Загародскаму, нягледзячы на тое, што ў пісцовай кнізе ч. 2 ён з дворышчам Прыбушкевічы разам з Сямё-

нам Ордаю, Андрэем Рошчыным і кавалём Чычыным знаходзіцца ў сяле Погосто Пінскага павету. (23, с 445)

На стан 1555 году ў склад Пагоста (Зарэчнага) ўваходзіла ўжо шэсць дворышч з агульным памерам зямлі 15 увалок, што прыблізна адпавядае 330 га толькі ворнай зямлі. (23, с. 441-447) Размяшчаліся гэтыя дворышчы ўздоўж рэчкі Стыр, то бок уздоўж Віленскага гасцінца, які быў галоўнай вуліцай сяла. Сённяя Зарэчча мае даўжыню каля 10 км і шырыню каля 1 км, а плошча пасёлка каля 1000 гектараў, узровень вышынь адпавядае 140-157 метраў, што гаворыць аб тым, што Беларускае мора, якое мела ўзровень 135 метраў, ні ў старажытныя часы, ні ў якія другія не магло прынесці таму сялу непрыемнасці. Дарэчы, у Пагосце Загародскім узровень вышынь 134-136 метраў, і ўся яго плошча не прывышае 24 га, а гэта адпавядае 1 увалоцы. Адзін толькі гэты факт можа гаварыць аб немажлівасці параўнання спадчын гэтых абодвух Пагостаў.

## 6.7. Пагост (Загародскі)

**12 кастрычніка 1539 года** Радзівілы падзялілі маёмасць на тры часткі. Юрыю Мікалаевічу, ваяводзе Віленскаму, гетману найвышшаму ВКЛ, дастаўся маётак Бобрык, а да яго сёлы **Пагост**, Камень, Дубнавічы, Лобча, Парахонск. (28) З энцыклапедыі ВКЛ вядома, што Бабрэцкая воласць належала Мікалаю Радзівілавічу, а ў Вялікім гістарычным Атласе Беларусі паведамляецца, што Бобрык упершыню ўзгаданы ў 1495 годзе. (7, с. 196) З пісьмовых крыніц вядома, што Бабрэцкая воласць існуе раней, чым з 1435 году, бо так датуецца першае ўпамінанне Луніна (7, с. 220), а Лунін на той час знаходзіўся ў Бабрэцкай воласці. (29, с. 78) Відавочна, што напачатку павінна з'явіцца сяло Бобрык, затым маёнтак Бобрык, а потым Бабрэцкая воласць. Напэўна што, яно так і было. Прычым Бобрык, Лунін, Дабраслаўка, Камень маглі існаваць нават ад каменнага веку, але, на жаль, не Пагост. Прычын таму шмат, і іх варта разгледзець усе, каб зразумець і пераканацца ў тым, што гэтае першае ўпамінанне аб Пагосце фактычна і будзе пачаткам заснавання сяла Пагост.

**Першая прычына** гэта тое, што возера, якое некалі ўтварылася ад рэчкі Вісліцы, затым павялічылася да мора Геродота, ператварыла зямлю будучага Пагоста ў востраў больш чым на дзесяць тысяч гадоў. Ад таго востраў да берагу было два, а некалі нават пяць кіламетраў у накірунку да могілак ці да сяла Камень. Аб гэтым сведчаць даследаванні

археолага У. Ф. Ісаенкі, які абазначыў месцы распалажэнняў старажытных паселішчаў, а гэта і быў бераг Пагосцкага возера і ракі Бобрык, якія ў тыя часы аб'ядноўваліся ў адзін вялікі вадаём памерам у мора. Потым, калі мора зменшылася да Сармацкага возера і затым ператварылася ў возера Навадворскае і нарэшце Пагосцкае, яно яшчэ доўга не падпускала людзей да востраў, які толькі ў XVI стагоддзі змог стаць сялом ці напачатку часткай сяла, то бок адным з дворышчаў сяла Пагост, нягледзячы на тое, што яшчэ больш як чатыры стагоддзі веснавыя павадкі рабілі Пагост востравам.

**Другая прычына** ў тым, што падзел маёмасці Радзівілаў, з якой распачаўся гэты артыкул, ёсць нішто іншае, як копія акту, якая была знятая з арыгіналу ў 1787 годзе. Хто і навошта зняў гэтую копію за 5 гадоў да другога падзелу Рэчы Паспалітай? Справа ў тым, што маёнткі Пагост і Лунін перайшлі да Друцка-Любецкіх у 1664 годзе выпадкова і *незаконна*. Радзівілы спрабавалі праз суды вярнуць іх і ў 1763 годзе атрымалі станоўчы для іх вырак Галоўнага Трыбуналу ВКЛ, і Караль Станіслаў Радзівіл нават быў уведзены ў валоданне маёнткамі Пагост, Лунін і паловай Парахонска. Пры гэтым ён запісам ад 30.06.1763 году перадаў Вікторыі і яе сыну Францішку Друцкім-Любецкім маёнткі Пагост і Лунін у пажыццёвае валоданне, але праз год *па палітычных матывах* дакументы аб перадачы маёнткаў Радзівілам былі скасаваныя. Справа была канчаткова скончана толькі ў 1779 годзе. Радзівілы выдалі ліст кн. Францішку і Генавефе,

нар. Алізар, Друцкім-Любецкім аб адмове ад прэтэнзій на маёнткі Пагост, Парахонск і Лунін. (30, с. 341) Тым не менш факт прызнання Галоўным Трыбуналам правоў Пагоста за Радзівіламі даваў ім надзею на станоўчы вырак у наступстве, і ў сувязі з новымі палітычнымі абставінамі, якія ўзніклі ў 1787 годзе, Радзівілы зноў вырашылі звярнуцца ў суд, дзеля чаго і зрабілі копію акту падзела спадчыннай маёмасці. **У сувязі з гэтым узнікае пытанне, чаму Радзівілы зрабілі копію менавіта з гэтага акту падзелу, датаванага 1539 годам?** Прычым загаловак копіі абазначаны так: "Акт падзелу паміж Радзівіламі добраў Ліпска, Чэрвішча, Бобрыка і **Пагоста**". Верагодней за ўсё, тут наўмысна зроблена памылка. Замест Пагоста трэба было напісаць Выганашча, бо сяло Пагост не дзялілася. Дзяліліся маёнткі Ліпск, Бобрык, Выганашча і Чэрвішча. Падзел быў зроблены на тры роўныя часткі: Ліпск з сёламі, належачымі да яго, Бобрык з сёламі, належачымі да яго, і Выганашча з сёламі, належачымі да яго, а Чэрвішча з сёламі былі падзелены як дадатак да Ліпску і Бобрыку, каб ураўняць іх з Выганашчамі. Пагост быў адным з пяці сёл, якія ўваходзілі ў маёнтак Бобрык, а паставілі ў загаловак яго толькі затым, што копію з акту рабілі дзеля таго, каб звярнуць увагу на тое, што ў акце ёсць Пагост, і паказаць у судзе, як даўно Пагост належыць Радзівілам. Інакш кажучы, акт падзелу – гэта метрыка Пагоста, першы яго дакумент. Нагадаю, што яшчэ Мікалай Радзівілавіч, які памёр у 1509 годзе, валодаў Бабрэцкай воласцю, і калі б Пагост на той час быў у

складзе Бобрыка, то Радзівілы знялі б копію менавіта з падзелу спадчыннай маёмасці таго часу. Выходзіць, што да 1539 году дакументаў на Пагост у Радзівілаў не было, значыць, не было і самаго Пагоста.

**Трэцім аргументам** таго, што Пагост узнік менавіта ў 1539 годзе, а не раней, можа быць той факт, што ў 1512 годзе пры разглядзе зямельных спрэчак паміж князем М. І. Жыжэмскім і князем Пінскім Ф. І. Яраславічам апісваецца зямля Сашэнская, дзе узгадваюцца: **Гарадзішча, Сушыцк, Астравец, Парахонск, Лунінец, Бобрык.** (27, с. 18) **Пагост пры гэтым у 1512 годзе не ўзгаданы.** Тым часам у пісцовай кніжцы ад 1561–1566 гадоў пры апісанні зямель сяла Сошна ёсць такі запіс: *"…урочище Комарка начинается от дороги, идущей из Сошна в Погост и окружена с трёх сторон болотом…"*. ( 22, с. 149) Такім чынам, пры апісанні Сашэнскіх зямель дзякуючы дарозе Сошна – Пагост **у 1561 годзе Пагост выпадкова ўзгаданы.**

Таксама ў 1517 годзе пры разглядзе маёмаснай спрэчкі паноў Завішаў і князя Пінскага Фёдара Іванавіча Яраславіча апісваліся межы зямель сяла Сташаны. Пры гэтым узгадваліся такія сёлы, як **Забараўцы, Вялясніца, Хатомль, Жасна, Азарычы, Чэрнічы ці Чэрневічы, Ставок, Сташаны і Новы Двор.** Чухава знаходзіцца значна бліжэй да Сташан і Новага Двара, чым іншыя сёлы, і абавязкова павінна было быць узгаданым, бо дарога Новы Двор – Забараўцы гэта фактычна дарога Чухава – Забараўцы. Калі ёсць сёлы, то ёсць і дарогі паміж імі. Яны, да-

рогі, і ўзгаданы, а дзякуючы дарогам узгаданы ўсе вышэй пералічаныя сёлы. Дарог паміж Чухавам і тымі сёламі на той час не было, а значыць, не было яшчэ і самога сяла Чухава. Таксама няма дарог на Ботава і Пагост, выходзіць, у 1517 годзе не было і тых сёлаў.

**Чацвёртай нагодай меркавання** таго, што Пагост узнік не раней, чым ў 1539 годзе, ёсць той факт, што ў сяле зафіксаваны першыя пахаванні толькі з другой паловы XVII стагоддзя. Дарэчы, гэты факт мэтанакіравана даследаваўся навукоўцамі. Так, археолаг У. Ф. Ісаенка, праводзіўшы археалагічныя даследаванні часоў каменнага веку ў наваколлі Пагоста Загародцкага, напачатку лічыў, што Пагост быў могілкамі нібыта вялікага старажытнага гораду Камень. Гэтым ён дзяліўся з маім бацькам, які ў тыя часы быў старшынёй Загародцкага сельсавету, і некаторыя арганізацыйныя пытанні навуковых работ імі вырашаліся сумесна. Яны былі аднаго пакалення, і ім прыемна было гутарыць на розныя тэмы. Бацька ў сваю чаргу пераказваў нам, сваім дзецям, пра старажытны Пагост, які ён пазнаваў са слоў навуковага супрацоўніка. Праз некаторы час пачаліся раскопкі старажытных могілак у Пагосце на Дзеддомаўскай горцы, у якіх удзельнічалі і мы, тагачасныя вучні старэйшых класаў. Кіраўніком тых раскопак была навуковая супрацоўніца з таго ж інстытута, што і У. Ф. Ісаенка. Яна нам паведаміла, што могілкі аказаліся не надта старажытнымі, а ў асноўным там знаходзілі артэфакты пахаванняў

XVIII стагоддзя і нязначная колькасць канца XVII стагоддзя. Такім чынам, ідэя пра нібыта вялікі горад Камень і Пагост як могілкі таго гораду, згодна фармулёвак аўтарытэтных расійскіх энцыклапедычных выданняў, не пацвердзілася і не ўвайшла ў ненадрукаваны нарыс пра Пагост Загародскі У. Ф. Ісаенкі, рукапіс якога захоўваецца ў Загародскім сельсавеце. А гэты факт сведчыць толькі аб тым, што сяло Пагост напачатку свайго існавання магло быць не ў тым месцы, дзе яно размяшчаецца цяпер. Нагадаю, першы ўспамін Пагоста гэта 1539 год, значыць, могілкі ў сяле павінны з'явіцца ў другой палове XVI стагоддзя, а ніяк не ў канцы XVII. Другога месца ў наваколлі Пагоста, дзе маглі быць могілкі больш ранейшага часу, акрамя тых, што на Дзеддомаўскай горцы і існуючых цяпер, няма. А гэта можа азначаць, што ў тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца сяло Пагост Загародскі, тагачаснае пасяленне магло пачаць сваё існаванне незадоўга да з'яўлення першых пахаванняў, тым больш не раней 1539 году.

Чарговым, пятым аргументам таму, што Пагост быў створаны ў 1539 годзе, можа быць той факт, што ў 1559 годзе пры апісанні межаў пушчаў ВКЛ возера называлася яшчэ Навадворскім. (25, с. 8) Так і павінна было быць, бо вядома, што Новы Двор гарантавана існаваў з 1440 году, і ў 1559 годзе быў ўжо маёнткам. Дарэчы, першы пісьмовы ўспамін Новага Двара як маёнтка і ёсць 1559 год (25, с. 133), а Пагост на той час быў яшчэ сялом *"его милости воеводы Троцкого"*. (25, с. 8) І толькі ў 1608 годзе, пры абмежа-

ванні маёнтка Новы Двор, возера ўжо называлася Навадворскім і Пагосцкім адначасова. (8, с. 71)

Для таго каб зразумець, як і калі магло узнікнуць сяло на тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца Пагост Загародскі, таксама якім яно магло быць у старажытнасці, ды і наогул якая структура сёлаў была ў XVI стагоддзі, трэба разгледзець некаторыя сёлы, якія апісаны ў пісцовых кнігах Пінскага старастваза перыяд з 1552 па 1566 гады. Так, усе сёлы складаліся з дворышч, то бок хутароў, якія абавязкова мелі сваю назву. У гістарычным слоўніку Беларускай мовы назоў *дворышча* тлумачыцца, як *земляробчая гаспадарка,… сядзіба, фальварак, хутар.* (14, с. 288) У кожнае сяло ўваходзіла розная колькасць дворышч. Так, у сяло Жоўкіня ўваходзіла 18 дворышч, у сяло Ласіцкае 10, а ў сяло Крывое і ў сяло Жыдча ўваходзіла па 2 дворышчы. Былі сёлы і з адным дворышчам. Так, сёлы Тупічычы, Хрысцібалота, Плешчычы, Копчычы і іншыя мелі па адным дворышчы. (23) Чаму так адбывалася? Справа ў тым, што сёлы ў сучасным выглядзе гэта месца кампактнага пражывання людзей. Суседзі жывуць з агудьным плотам. Раней было зусім інакш. Суседзі маглі жыць адзін ад аднаго праз многія кіламетры. Сяло раней выконвала функцыі збору падатка і павіннасцей сялян, як арэндатараў зямлі землеўласніка. Вельмі часта было так, што ў сяле было два, тры і болей землеўласнікаў, кожны з якіх валодаў сваім дворышчам. Так, напрыклад, у Новым Двары двумя дворышчамі валодаў Шчэпа,

а двумя другімі Маскекіч. Тым не менш, сёлы ўтвараліся напачатку шляхам аб'яднання землеўласнікам блізкіх дворышчаў, і ў наступстве стварэннем новых дворышчаў, калі гэта мажліва, як гэта было ў Пагосце (Зарэчным). Дарэчы, у тым Пагосце кожным дворышчам валодаў асобны зямянін. Дык вось, калі мы разгледзім сёлы з адным дворышчам, то заўважым, што дворышчы гэтыя, як правіла, маюць дастаткова вялікія пахатныя землі. Напрыклад, сяло Копчычы мела 15 увалок пашнай зямлі, а гэта больш за 330 гектараў. (23, с. 467) Нагадаю, што на стан таго ж 1555 году ў склад Пагоста (Зарэчнага) уваходзіла шэсць дворышчаў з агульным памерам зямлі 15 увалок, што прыблізна адпавядае тым жа 330 га ворнай зямлі. (23, с. 441-447) Сяло Плешчычы таксама мела адно дворышча з шасцю ўвалокамі зямлі, якую ўзялі ў так званую арэнду 27 сялян, што саставіла для кожнага па 5 гектараў. (23, с. 201) Сярод сёл з адным дворышчам былі і выключэнні па памерах зямлі. Так, сяло Вольвічы, што пад ракою Стыр, мела ўсяго адну ўвалоку зямлі, на якой працавалі два селяніны, а валодаў тым сялом і зямлёю святар. (23, с. 373) Таксама сяло Хрысцібалота ў Зарэчнай воласці мела адно дворышча з адной увалокай, і трымаў тое сяло і зямлю войт Хрысцібалот без платы – на войтаўстве.

Такім чынам мы бачым, што ў XVI стагоддзі, як правіла, у сёлы аб'ядноўваліся 2-3 дворышчы і болей з агульнай плошчай зямлі у 100-300 гектараў. А маленькія сёлы з адным дворышчам і малым паме-

рам зямлі існавалі як выключэнні і былі адзінай маёмасцю дробных землеўласнікаў.

У 1559 годзе пры апісанні межаў пушчы, што каля Пінску, то бок пушчы Чэрчыцкага войтаўства, ёсць такія строчкі як: *ад таго ўрочышча Чаева* ***ідзе мяжа ракою Віслаю ў возера*** *Навадворскае на* ***чатыры мілі,*** *дзержачы* ***Пінскае паправай, а*** *пана ваяводы Троцкага* ***сяла яго міласці Пагосцьскага палевай.*** (25, с.8)

У тым жа 1559 годзе Мікалаю Шчэпе былі прызначаны ўваходы ў пушчу гаспадарскую для ягоных людзей з дворышчаў маёнткаў у Жабчычах і ў Новым Двары: ***паміж людзьмі*** *пана Завіша* ***са Сташан і людзьмі з Пагосчыны*** *пана ваяводы Троцкага.* (25, с. 103)

Уважліва чытаючы гэтыя два дакументы, можна з упэўненасцю сказаць, што гаворка тут ідзе не пра маленькае сяло, а пра сяло, якое памерам адпавядае мяжы, ідучай ракою Віслаю даўжынёй у 4 мілі, а гэта 7 кіламетраў. Па правым беразе ракі размяшчалася маёмасць Пінскага павету, а па левым – сяло ***Пагосцьскае***, дзе цяпер землі сёлаў Чухава і Ботава. Значыць, Чухава і Ботава на той час і маглі быць дворышчамі таго сяла ***Пагосцьскага***. А выраз *"людзі з Пагосчыны"* сведчыць аб тым, што Пагост на той час яшчэ не быў маёнткам, але слова *Пагосчына* гучыць як нейкая тэрыторыя з мноствам пасяленняў, што можа адпавядаць сялу з некалькімі дворышчамі. Пра сяло з адным дворышчам так не скажаш. І нават дворышчаў Чухава з Ботавам, якія вельмі блізка размешчаны адно ад другога, будзе недастаткова для выраза *Пагосчына*. Тым больш што

ёсць яшчэ адно апісанне Пагоста. У тым жа рэестры апісання пушч і пераходаў звярыных ёсць яшчэ такі запіс: *…праз раку Ясельду, прымаючы Лахвенскую і Ліпскую пушчы,* ***міма Пагост і Новы Двор*** *у пушчу Пінскую,* ***у ловішчы Забаравіцкія.*** (25, с. 1) Гэта той самы запіс мяжы пушч, што мы разглядалі ў папярэднім выпадку, толькі ў адваротным напрамку. На гэты раз сяло ўзгадана пад назовам Пагост. Калі яшчэ менавіта цяпер узгадаць тую дарогу, што ўзгадана ў пісцовай кніжцы як *"… дорога, идущая из Сошна в Погост и окружена с трёх сторон болотом…"* (22, с. 149), то можна зрабіць дапушчэнне, што ў абодвух апошніх выпадках маецца на ўвазе Пагост, які мог пачынацца з таго месца, дзе зараз размешчаны Пагост Загародскі. А дапусціць такое меркаванне можна менавіта ад таго, што дарога ўзгадана *як Сошна – Пагост, а не Сошна – Новы Двор – Пагост.* Вось толькі вялікі сумнеў у тым, што гэтая дарога існавала круглагадзічна. Дарога ў акружэнні балот магла быць толькі ўмоўнаю. А Пагост, які на той час размяшчаўся ў тым месцы, дзе зараз Пагост Загародскі, мог быць толькі часткай тагачаснага сяла *Пагост*, то бок яшчэ адным дворышчам сяла *Пагосцьскага*, якое разам з дворышчамі *Чухаў* і *Ботаў* і былі тым сялом *Пагосцьскім*, якое ўваходзіла ў склад маёнтка Бобрык у 1539 годзе. З 1495 году Бабрэцкай воласцю вылодалі Радзівілы. І гэтая даволі вялікая воласць была толькі маленькай часткай маёмасці вялікага старажытнага роду, якому не было патрэбы ствараць маленькія аграрныя сёлы, якія ўскладняюць кіраванне і

натуральны збор падаткаў, што існаваў на той час. Акрамя таго, сёлы Бабрэцкай воласці ў асноўным размяшчаліся ўздоўж ракі Бобрык, і гэта не выпадкова. Асноўнымі заняткамі мужчын гэтых сёлаў маглі быць сплаў лесу і бортніцтва, а хлебапашаства магло быць не асноўным заняткам па прычыне адсутнасці дастатковай плошчы прыгодных для гэтага зямель. Тым часам у сярэдзіне XVI стагоддзя на Палессі такія землі пачалі з'яўляцца па прычыне прыроднай меліярацыі, то бок высыхання балоцістых месцаў. З'явілася нагода асвойвання тых пахатных зямель. Патрэбныя былі людзі. Радзівілы маглі прапанаваць новыя землі як сялянам, так і баярам са сваіх шматлікіх маёнткаў, напрыклад, з Літвы, дзе адбываўся рост насельніцтва, і зямель не хапала. Так на Пагосчыне пачалі з'яўляцца новыя дворышчы і нават сёлы. Хто і кім былі тыя людзі, што першымі прыйшлі і пабудавалі Чухава, Ботава, мястэчка Пагост, невядома, і аб гэтым мы ўжо, напэўна, ніколі не даведаемся, але зрабіць верагоднае дапушчэнне можліва. Так, у "Духоўнай метрыцы вуніяцкай Пагосцкай царквы за 1750-1776 гады" зарэгістраваны жыхары Чухава, Ботава, Каменя і Пагоста, якія жылі ў гэты час. (55) Тасама вядомы некаторыя жыхары гэтых сёл, якія выпадкова ўпамянуты ў скаргах у Пінскі гарадскі суд за годы арэнды маёнтка Пагост габрэямі Сімшычамі. Нехта з іх мог быць тым першым жыхаром. Таксама можна дапусціць, што на Пагосчыну прыйшлі першымі баяры, то бок вайсковыя слугі Радзівіла, і нейкі шанец

такога дапушчэння насамрэч ёсць, бо пэўная колькасць прозвішчаў у Ботаве і Пагосце, як і ў Чухаве, супадае з прозвішчамі, якія ёсць у гербоўніку ВКЛ. (42) Вось гэтыя спісы:

Пагост

1. Варановіч (Воран) **Woronowicz** herbu **Lis.**
2. Рас[іевіч] **Ras[iewicz]** herbu **w Checinfkim, &c**
3. Саковіч **Sakowicz** herbu **Pomian**
4. Янковіч **Jankowicz w Metrice Wolin: r. 1528.**
5. Багатырэвіч **Bohatyrowicz** herbu **Boncza**
6. Кучук **Kuczuk** herbu **Jaftrzebiec**
7. Казак **Kosak** herbu **Kos**
8. Каладзінскі **Kolodynfki** herbu **Kolodyn**
9. Завадцкі **Zawadzki** herbu **Lis.**
10. Ярашэвіч **Jaroszewicz** herbu **Prus xmo.**
11. Будко **Budko** herbu **Jaftrzebiec**
12. Протасовіч **Protasowicz** herbu **Drzewiza**

Ботава

1. Валадкевіч **Wolodkiewicz** herbu **Labedz**
2. Хурко **Hurco** herbu **Hurco**
3. Гурыновіч **Hurynowicz w Lidzkim &c.**
4. Беляковіч **Bielikowicz** herbu **Bielikowicz**
5. Паўловіч **Pawlowicz** herbu **Przyiaciel**
6. Паско[віч] **Paszko[wicz]** herbu **Plomienczyk**
7. Марковіч **Markowicz** herbu **Boncza**
8. Долмат **Dolmat** herbu **Rozmiar**
9. Будко **Budko** herbu **Jaftrzebiec**
10. Протасавіцкі **Protaszewicki** herbu **Drzewiza**

11. Хурс (Фурс) **Furs** herbu **Was**

**Камень**

1. Кучук **Kuczuk** herbu **Jaftrzebiec**
2. Багатырэвіч **Bohatyrowicz** herbu **Boncza**
3. Комар **Komar** herbu **Komar**
4. Петруковіч **Pietrykiewicz** herbu **Radwan**

Дарэчы, ужо потым ў Пагост Загародскі прыйшлі людзі і сталі пагасчанамі з прозвішчамі, продкі якіх таксама маглі быць прафесійнымі вайскоўцамі, то бок баярамі, гэта:

Палхоўскі **Polchowfki** herbu **Junosza**
Ціханоўскі **Ciechonowfki** herbu **Waz**
Вількоўскі **Wilkowfki** herbu **Rawicz**
Багатка **Bogatko** herbu **Pomian**
Рыльскі **Rylfki** herbu **Oftoja**
Германовіч **Hermanowicz** herbu **Junosza**
Грынько[евіч] **Hrinkiewicz w Metrice Wolin: r. 1528.**
Дрозд[овіч] **Drozdowicz** herbu **Jaftrzebiec**
Квіцінскі **Kwiecinfki** herbu **Kwiecinfki**
Раздзялоўскі **Radzilowfki** herbu **Radzilowfki**

Такім чынам, са з'яўленнем на Пагосчыне новых дворышч і затым сёл павялічыліся збожжавыя падаткі, і эканамічна невыгадна было звозіць іх на вялікія адлегласці да маёнтка Бобрык. Неабходна была рэарганізацыя. Так Пагост стаў маёнткам. Адбылося гэта паміж 1559 і 1612 гадамі. Менавіта 25.07.1612 года ўпершыню Пагост узгаданы як маёнтак. (30, с. 338) Двор гэтага маёнтка, верагодней усяго, знаходзіўся

каля дворышча Ботаў, аб чым можа сведчыць копія з экздувізарскага плану ўрочышча Свірнішча маёнтка Пагост, зробленая ў 1818 годзе (45), на якім абазначаны Пагост з мястэчкам і палацам, таксама *вёска Ботоў, урочышча Свірнішча і Стары Двор.*

Гістарачны слоўнік беларускай мовы дае такое тлумачэнне назову *Стары: "які існуе з даўніх часоў, захаваўся ад далёкага мінулага"*.(65, с. 354), *а назову Двор: "панскі, скарбовы, шляхецкі маёнтак"*. (14, с. 294) Відавочна, што назоў Свірнішча паходзіць ад назову *свіран*, якому Гістарычны слоўнік дае такое тлумачэнне: *"гумно на молоченье збожа, свирон на сыпанья збожа (1589 г.)"*. (64, с. 125)

Такім чынам Стары Двор са Свірнішчамі гэта двор маёнтка Пагост, які захаваўся з далёкага мінулага, са свірнам, гумном, хлявамі і іншымі памяшканнямі. Палац з'явіўся на беразе возера некалькі пазней, а будавацца ён мог адначасова з мястэчкам.

Энцыклапедыя ВКЛ паняццю мястэчка дае такое тлумачэнне: *"мястэчка (ад агульнаславянскага "места" горад), у ВКЛ у 15–18 стагоддзях драбнейшы населены пункт гарадскога тыпу, малы горад, эканамічны ўплыў якога абмяжоўваўся невялікімі сельскагаспадарчымі раёнамі, … цэнтрам якіх ён звычайна з'яўляўся. Мястэчкі ўзніклі ў 15 стагоддзі з распаўсюджваннем таварна-грашовых адносін для стварэння шчыльнай сеткі таргоў і максімальнага ўцягвання ў рыначны абарот сельскага насельніцтва. Яны размяшчаліся … на важнейшых камунікацыйных шляхах, па берагах рэк і азёр. Забудова мела рэгулярны, пляцавы характар. Насель-*

*ніцтва папаўнялася за кошт жыхароў вёсак, ператвораных у мястэчка, уцекачоў і перасяленцаў з іншых маёнткаў і гарадоў. Асновай дзейнасці жыхароў мястэчак з'яўляліся акрамя сельскай гаспадаркі абслугоўванне гандлю і камунікацыйных шляхоў, феадальных двароў, трыманне корчмаў, рамесніцкая праца на заказ. Пры мястэчках існавалі прадпрыемствы прамысловага характару (млыны, крупадзёркі, цагельні, вапнавыя печы, рудні.)".* (18, с. 334, 335) Да 1588 года ў Вялікім княстве Літоўскім патрабаваўся дазвол вялікага князя для таго, каб заснаваць новае прыватнае мястэчка. (18, с. 334) З 1541 году па 1584 год Бабрэцкай воласцю, а значыць, і Пагостам валодаў ваявода троцкі Мікалай Радзівіл (Руды), а ў 1550 годзе ягоная родная сястра Барбара пабралася шлюбам з вялікім князям ВКЛ і каралём Польшчы. Дазвол на заснаванне мястэчка быў атрыманы, але ёсць падставы меркаваць, што каралю, а асабліва ягонай маці каралеве Боне, якая валодала Пінскім паветам, гэта быў вельмі не выгадны праект, бо мястэчка Пагост у перспектыве ператварала мясцовую дарогу Бобрык – Пагост – Лунін у абсталяваляваны гасцінец, які выключаў маёнтак Пінск з існуючага стратэгічнага гандлёвага шляху ***Вільна – Пінск – Мазыр – Кіеў.*** Новы накірунак станавіўся намнога карацейшы, так, замест ягонай часткі *Дабраслаўка – Лагішын – Пінск – Лунін шлях павінен быў праходзіць праз Дабраслаўку – Чухава – Пагост – Камень – Багданаўку – Лунін,* што амаль на 50 кіламетраў менш, а гэта на той час адпавядала двум дням у дарозе. (Праз Па-

гост даўжыня дарогі ад Дабраслаўкі да Луніна складала 40 км, а праз Пінск 90 км.) Відавочна, што эканомія двух дзён на дарогу рабіла шлях праз Пагост больш прывабны, і ў выніку дзяржаўны, то бок каралеўскі, маёнтак Пінск павінен быў пры гэтым панесці эканамічныя страты.

Для новага маёнтка Пагост, двор якога размяшчаўся каля Ботава, патрэбна было будаваць палац. А самае лепшае месца для гэтага і было тое месца на ўзгорку, што на беразе Пагосцкага возера. Заставалася ўмацаваць дарогу, якая ішла ад Ботава праз будучае мястэчка да Каменя, пабудаваць сам палац з паркавай зонай, фальварак, на што адведзена была палова тэрыторыі будучага мястэчка, таксама знайсці рамеснікаў (прадпрымальнікаў), якія пабудуць сабе хаты і стануць мяшчанамі мястэчка Пагост. (45)

У 1643 годзе пінскія габрэі Сімшычы арэндавалі на 4 гады маёнтак Пагост. У XXVIII томе Актаў Віленскай камісіі ёсць апісанне маёмасці маёнтка, гэта: *двор Пагост з фальваркамі, быдлам, мястэчкам Пагост і сёламі да іх належачымі, Камень, Ботава, Чухава, Плоскіна, Дальняя Лука, Церабень, Дубнавічы, Лобча і фальварак Хмельнікі.* (40, с. 216) Менавіта Стары Двор са Свірнішчамі і іншымі памяшканнямі, якія абазначаны на копіі плана ад 1818 году, і ёсць той першы двор, то бок маёнтак Пагост, які часова арэндавалі габрэі Сімшычы. Доказам таму можа быць скарга ў Пінскі гарадскі суд арэндатаршы Дворы Сімшыч на мясцовага святара, у якой гаворыцца: *"чэляднік наш, на імя Сімха Іцковіч, жыд, ішоў з двара Пагосцкага да Дварца, міма двара*

*святара дарогаю дабравольнаю"*. Паміж *Дварцом*, што стаяў на беразе возера, і *двaром Пагосцкім* быў двор (хата) святара, які стаяў на *дарозе дабравольнай*. Дзе была хата святара, невядома (можа, недалёка ад царквы, што стаяла на Дзеддомаўскай горцы), а вось *Пагосцкій двор* мог на той час быць тым *Старым Дваром*, ад якога можна было трапіць у Дварэц толькі па *дабравольнай дарозе*. Гістарычны слоўнік Беларускай мовы старажытнае слова *"дабравольны"* трактуе як *"вольны, адкрыты, даступны для ўсіх"*. (43, с. 135, 136) Такім чынам, Сімха Іцковіч ішоў у Дварэц з двара Пагосцкага па дарозе, міма цяперашняй хлебапякарні, міма цяперашніх могілак, затым міма могілак тагачасных, што на Дзеддомаўскай горцы, і праз фальварак да Дварца. Вось толькі *двор Пагосцкі* ў 1646 годзе *Старым Дваром* яшчэ не называлі.

Дарэчы, "дзякуючы" скандальным паводзінам сям'і пінскіх габрэяў Сімшычаў, тагачасных арэндатараў маёнтка Пагост, у судовых скаргах пагашчан на арэндатараў і ў скаргах саміх арэндатараў ёсць шмат апісанняў як мясцовасці, так і маёмасці, таксама выпадкова ўзгадваюцца тагачасныя жыхары Пагоста, Ботава, Чухава, Каменя і іншых сёл.

Так, у 1645 годзе баярын з Дубнавіч **Есман Навіцкі** падаў скаргу ў суд на арэндатара маёнтка Пагост, Пінскага габрэя Лейзера Сімшыча, які стрэліў з пташынай ручніцы ў жывот ягонаму сыну **Давіду Навіцкаму**, затым паграбіў яго. Пры гэтым былі дворныя баярына **Іван Хаценіцкі** і **Івашка Лабецкі**. (40, с. 204)

Якаў Сімшыч у 1646 годзе так моцна ударыў палкаю ў левы бок мяшчаніна пагосцкага **Астапа Шкляра**, які ад гэтага праз некаторы час памёр. У сувязі з беспрычынным забойствам мяшчаніна было шмат скаргаў і разбіральніцтваў, у якіх узгаданы: **войт Пагосцкі Хрыс Яўтуховіч, войт Ботаўскі Якуб Піліповіч, зямяне тамашнія Марцін Лебядзеўскі, Пётр Зміеўскі і Охей Скатковіч, таксама мяшчане Пагосцкія Андрэй Варановіч** (з 1750 году прозвішча пачало мяняцца на Воран), **Сушко Масковіч, Іван Ханевіч, Васко Патрубовіч.** (40, с. 227, 230, 231)

У 1646 годзе **Якаў Марціновіч, прэзбітар Пагосцкай царквы святога Мікалая**, падаў скаргу ў Пінскі гарадскі суд на габрэя, арэндатара Пагосцкага Якуба Сімшыча. У скарзе святар адзначыў, што згодна фундушу, асабіста яму выдадзенаму, ён мае вольнасць па лоўлі рыбы ў возеры для свайго ўжывання, акрамя таго, царква мае ўласныя землі ва ўрочышчы пад назвай "Лука каля Дубка" (потым гэтае ўрочышча назавецца Свірнішчамі). Менавіта ў гэтым месцы і збіраўся лавіць рыбу **сын прэзбітэра Пётр Марціновіч** з дзякам **Іванам Акалотавічам** і з дамавою чэляддзю **Стаськом Харковічам** і **Яськом Мікіцічам**, за што Якуб Сімшыч з другімі габрэямі збіў і паграбіў іх. Гэтымі процівапраўнымі дзеяннямі арэндатар маёнтка Пагост, пінскі габрэй Якуб Сімшыч, не толькі учыніў знявагу духоўнага стану святара Якава Марціновіча, але і наогул зняважыў царкву Божую. (40, с. 264)

Хутчэй за ўсё, у адказ на гэткія дзеянні арэндатараў святар разам з сынам і са сваёй чэляддзю, а таксама з памочнікамі, мяшчанамі пагосцкімі, сярод якіх былі **Андрэй Жуковіч, Стасік Янковіч** са сваім братам **Міско Паўловічам** і іншыя, пабілі Якуба, патармасілі ягоную маці Двору, ганілі іх і папярэдзілі, што яны ў хуткім часе голымі адсюль пойдуць. (40, с. 262, 263)

У 1646 годзе слуга Багдана Статкевіча і Ганны Радзімінскай, былы ўладар паловы маёнтка Новы Двор Геліяш Шчэпа, звярнуўся ў Пінскі гарадскі суд са скаргай на арэндатаршу Пагоста Двору Сімшыч. Ён абвінаваціў яе, таксама яе сына Якуба і брата яе Мардухая ў тым, што яны прымушалі **півавара Якава Паўловіча** з Ботава даць ім у пазыку грошай. А калі ён ім адмовіў у пазыцы, то яны пачалі яго біць і мардаваць, тым самым гвалтам хацелі ў яго дамагчыся грошай, а затым напалову жывога ўсклалі на воз і адвезлі да ягонага дому ў сяло Ботава. Возны Пінскі генерал Есман Навіцкі ў прысутнасці двух шляхцічаў і **войта Івана Наварыча з Ботава** апрасіў півавара Якава Паўловіча ў ягоным доме, які пацвердзіў, што ўсё тое, што Геліяш Шчэпа ў скарзе напісаў пра дамаганне пазыкі грошай, гвалт і збіццё яго габрэямі Сімшычамі, праўда. У хуткім часе пасля гэтага Якаў Паўловіч памёр. (40, с. 298-300)

Такім чынам, за чатыры гады кіравання маёнткам Пагост пінскія габрэі Сімшычы зрабілі ўсё, каб сапсаваць адносіны амаль з усімі жыхарамі маёнт-

ка. Так, яны беспрычынна зняважылі мясцовага святара тым, што збілі і паграбілі ягонага сына з дзякам і дамавою чэляддзю. Таксама стрэлам з ружжа быў паранены, а затым паграблены сын баярына з Дубнавіч. За спазненне на паляванне быў збіты кіям мяшчанін з Пагоста, ад чаго ён хутка памёр. Таксама беспрычынна быў да смерці збіты і змардаваны півавар з Ботава. Надоўга запомнілі ся габрэі Сімшычы жыхарам не толькі маёнтка Пагост, але і Луніна. Наўрад ці ў бяспецы адчувалі сябе на арэндаванай тэрыторыі пасля гэткіх дзеянняў не толькі габрэі Сімшычы, але і іншыя габрэі, што некалі бывалі ў іх. За гэтыя чатыры гады арэнды было напісана ў Пінскі гарадскі суд каля 20 скаргаў, і менавіта "дзякуючы" тым звесткам, нават самым выпадковым і на першы погляд зусім нязначным, можна многае і вельмі важнае пазнаць пра старажытны Пагост, пагастчан і іх суседзей.

У 1671 годзе апекуны сыноў Мікалая Друцкага-Любецкага з мэтай пакрыцця даўгоў перадалі архімандрыту слуцкаму Феадосію Васілевічу ў дзевяцігадовую арэнду маёнтак Пагост з фальваркамі Пагост, Церабень, Хмяльнік, Пласкінь, з вёскамі Камень, Лобча, Дубнавічы, Парахонск, Ботава, Чухава, Дабраслаўка, Пласкінь, Ліпнікі, Церабень. (30, с. 341-342) У 1678 годзе Феадосій Васілевіч раптоўна памёр. За 7 гадоў арэнды маёнткам як з боку арэдатара на каго-небудзь, так і на самаго арэндатара не было ніводнай скаргі.

Тыя ж апекуны ў 1678 г. гвалтоўна адабралі гэтыя землі ў роднай сястры Ф. Васілевіча Лізаветы, наста-

яцельніцы Віленскага Свята-Духава манастыра. (30, с. 342) Гэткая раптоўнасць звязана, хутчэй за ўсё, з рабаваннем рухомай і іншай маёмасці нябожчыка. Аб гэтым сведчыць старэйшая Віленскага кляштару паненак закону Базыліянскага Лізавета, якая дала паўнамоцтвы свайму родзічу памежнаму суддзі Лядзінскаму на права вяртання пакрадзенай маёмасці памерлага брата. (8, с. 220-222)

За ўвесь час існавання Пагоста ім валодалі два рода нашай краіны Вялікага княства Літоўскага. Заснавалі Пагост Радзівілы. Гэта быў самы знакаміты, самы багаты і ўплывовы род нашай сярэднявечнай дзяржавы, які стаяў у вытоках станаўлення і развіцця ВКЛ. З 1664 году Пагост перайшоў да Друцка-Любецкіх. Гэты род у канцы XVI – XVII стагодзях належаў да шэрагу сярэднезаможнай шляхты. Падмуркам будучага ўзвышэння роду сталі маёнткі Пагост і Лунін, якія выпадкова атрымаў князь Мікалай Іванавіч Друцкі-Любецкі, ужо будучы жанатым на Крысціне Статкевіч. Але менавіта наяўнасць маёнткаў Пагост і Лунін паспрыяла таму, што ягоны род змог істотна павялічыць яго ўласнае значэнне, што стала асновай для паспяховай кар'еры сыноў Сымона, Багдана і наогул усіх яго патомкаў у будучым. (30, с. 343)

## Радавод Пагоста

Падзел маёмасці Радзівілаў адбыўся **12 кастрычніка 1539 года.** (28) Пагостам стаў валодаць **Юрый Мікалаевіч Радзівіл,** вялікі гетман ВКЛ. Праз два гады ён памёр, і Пагост у складзе маёнтка Бобрыка перайшоў да ягонага сына **Мікалая Юр'евіча**, князя Свяшчэннай Рымскай імперыі, ваяводы троцкага, вялікага гетмана Літоўскага, канцлера ВКЛ. У 1584 годзе Пагост перайшоў да ягонага старэйшага сына **Мікалая Мікалаевіча**, ваяводы Новагародскага, старасты мазырскага. Ён меў дачок Зоф'ю, Кацярыну і сына Юрыя.

У 1589 годзе валодаць Пагостам стаў **Юрый Мікалаевіч**, які рана страціў бацьку, але дзякуючы падтрымцы свайго апекуна, малодшага брата бацькі Крыштафа Мікалаевіча, ваяводы віленскага і гетмана найвышшага, вучыўся ў Страсбургу, Базелі, падарожнічаў па Германіі, Швейцарыі. Быў старастам мазырскім, дзяржаўцам анішкінскім, кашталянам троцкім, а з 1600 года маршалакам Трыбуналу ВКЛ. Шчыры кальвініст, удзельнічаў у заключэнні палітычнага саюза паміж пратэстантамі і праваслаўнымі, скіраванага супраць контррэфармацыі і царкоўнай уніі.

На чале ўласных атрадаў Юрый Мікалаевіч прыняў удзел у антыкаралеўскім рокашы Зебжыдоўскага (легальнае паўстанне шляхты супраць цэнтралізацыі ўлады караля 1606-1609 гг.). Адным з кіраўнікоў рокаша быў ягоны стрыечны брат *Януш Крыштафавіч.* "Вайна чарніліц" завяршылася братазабой-

чым канфліктам, што прывяло да паразумення абодвух бакоў, і ў выніку адбылося прымірэнне і прабачэнне ўсіх удзельнікаў.

Юрый Мікалаевіч валодаў маёнткамі Дубінкі, Беліца, Дакудава, Ліпічава, Жырмуны, Жупраны, Гнядзілавічы, Вольберавічы, Індура, **Пагост, Лунін, Бобрык, Хатынічы** і іншымі. (18, с. 500) У шлюбе з Зоф'яй Збароўскай Юрый Радзівіл не меў дзяцей і 25.07.1612 г. запісаў усю маёмасць сынам свайго былога апекуна, стрыечным братам – кашталяну віленскаму *Янушу Крыштафавічу* і ваяводзе віленскаму *Крыштафу Крыштафавічу* Радзівілам. Тэстаментам ад 11.02.1613 г. Юрый пакінуў сваім сёстрам Зоф'і (муж – маршалак ВКЛ Крыштаф Дарагастайскі) і Кацярыне (муж – стараста ўшпольскі Пётр Гарайскі) па 10 тыс. зл. (30, с. 338)

Чаму Юрый Мікалаевіч не пакінуў ніякай маёмасці сваім родным сёстрам Зоф'і і Кацярыне, невядома, але гэтаму маглі паспрыяць непрыстойныя паводзіны Зоф'і, звязаныя з пералюбам.

Так, па доўгу палітычнай і вайсковай службы Крыштаф Дарагастайскі, другі муж Зоф'і, часта адсутнічаў. Яна гэта выкарыстала для сустрэч са слугою мужа Станіславам Тымінскім. Усё распачалося ў 1607 годзе. Спачатку гэтыя адносіны ўтойваліся, а потым сталі яўна дэманстравацца. Сустрэчы адбываліся ў маёнтку Шэрышова ў пакоі Тымінскага, а потым у пакоі служанкі Паўлавай. За зводніцтва ёй пагражала смяротнае пакаранне, таму яна ўсё падрабязна рассказала Дарагастайскаму.

Пакрыўджаны муж паскардзіўся Юрыю Радзівілу, што Зоф'я забылася пра шлюб, славу і гонар старажытнага дома. У першым парыве ён напісаў, што за гэтае злачынства трэба "горлам караць", і адначасова пачаў збіраць доказы здрады. (47, с. 15) За пералюб згодна статуту 1588 года жанчыне і яе палюбоўніку пагражала смяротнае пакаранне. (19, с. 597)

Для Юрыя і яго стрыечных братоў Януша і Крыштафа Радзівілаў склалася непрыемная сітуацыя. Зоф'я напісала братам напоўнены жалем ліст, пранікнёны пакаяннем, што яна да канца жыцця будзе аплакваць свае дзеянні. Апраўдваючыся перад братамі, яна паведаміла ім, што К. Дарагастайскі стаў няздольным выконваць шлюбныя абавязкі, а яна хацела мець нашчадка і таму здрадзіла мужу. Дарэчы, Дарагастайскі сам пісаў у лісце, што "купідон не раскрывае яму вароты перад старасцю". А гэтага было дастаткова для таго, каб ініцыіраваць развод з боку жонкі, бо імпатэнцыя мужа была для гэтага дастатковай прычынай.

Браты прыклалі ўсе намаганні, каб справа не дайшла да разводу, і шлюб захаваўся. Адбыўся судовы працэс над Тымінскім у Луцку ў 1607 г., судзілі яго не за здраду, а за замах на шляхецкую маёмасць. Станіслаў пагадзіўся з вынесеным прысудам, бо на гэта была папярэдняя дамоўленасць з К. Дарагастайскім. Смяротнае пакаранне замянілі на высылку з Рэчы Паспалітай на 6 год і штраф у 10 000 злотых. Як бачым, для разводу была вельмі сур'ёзная прычына. Справа разглядалася ў судзе. Аднак ні Дарагастай-

скі, ні Радзівілы не маглі дазволіць, каб выкрылася сапраўдная прычына. Такая ганебная справа не павінна была прагучаць у афіцыйных структурах і заплямiць гісторыю роду. (47, с. 15)

Падобны выпадак адбыўся са стрыечным братам Юрыя – Янушам Радзівілам. (Менавіта яму і ягонаму брату Крыштафу Юрый адпісаў усю сваю маёмасць). Януш быў жанаты з Зоф'яй, дачкой Юрыя Алелькавіча. Яна была апошняй прадстаўніцай гэтага роду і ўладальніцай вялікай спадчыны Алелькавічаў. Пра шлюб Януша і Зоф'і Радзівілы пачалі клапаціцца яшчэ ў 1594 годзе, калі ёй было 9 гадоў, а яму – 15. Змовіны былі актыкаваны ў Ваўкавыскім гарадцкім судзе ў 1596 годзе, заключэнне гэтага шлюбу каштавала вялікіх намаганняў. Аднак ён закончыўся расчараваннем. Валер'ян Трэпка так апісаў выкрыццё здрады Зоф'і. Ян Асмульскі адпрасіўся ў Я. Радзівіла паехаць да бацькі, а сам паехаў у Слуцк да яго жонкі. Януш накіраваўся туды таксама. Зоф'я доўга не хацела яго пускаць, а калі ён увайшоў, то Асмульскага ўжо не было. Падчашы ВКЛ пагражаў утапіць каханка жонкі. Калі ўсё выкрылася, то Асмульскі ўцёк у Львоў. Але і там яго Радзівіл знайшоў. Яго асудзілі за крадзеж упрыгожванняў жонкі. Аднак, як і ў папярэднім выпадку, да разводу не дайшло. (47, с. 16)

Гэтыя негатыўныя ўчынкі блізкіх жанчын узрушылі духоўны стан Юрыя, тым самым сапсавалі і ўскладнілі адносіны брата да сясцёр. Менавіта па гэтай прычыне ён пакінуў такі тэстамент.

Але сясцёр гэта не задаволіла, і яны распачалі працэс супраць Януша і Крыштафа, у выніку якога Зоф'я Дарагастайская і яе муж атрымалі дадаткова 50 тыс. зл., а Кацярына Гарайская і яе сям'я – маёнткі **Пагост, Лунін, Бобрык і Хатынічы** ў Новагародцкім ваяводстве і Пінскім павеце, што было замацавана запісам на карысць сыноў Кацярыны – Пятра і Крыштафа Гарайскіх ад 07.03.1614 г. (30, с. 338-339)

Пасля смерці маці сыны Гарайскія падзялілі маёмасць. Пагостам і Лунінам стаў валодаць Пётр, які неўзабаве ажаніўся з Ганнай, дачкой лідскага земскага суддзі Юрыя Францкевіча-Радзімскага. У 1633 годзе разам з жонкай Пётр купіў у брата Крыштафа фальварак Парахонск за 30 тысяч злотых, а праз тры гады заставіў жонцы за 30 тысяч злотых маёнткі Пагост і Лунін. (30, с. 339) Прыблізна ў 1642 годзе Ганна Францкевіч-Радзімінская другі раз бярэ шлюб з удаўцом Багданам Вільгельмавічам Статкевічам, падкаморыем мсціслаўскім. Першая жонка Статкевіча, Алена, дачка князя Саламярэцкага, разам з братам Багданам, як і сам бацька, былі настойлівыя прывержанцы праваслаў'я. Статкевіч з Аленай вырашылі будаваць жаночы манастыр недалёка ад свайго баркулабаўскага замка. (18, с. 538, 630) У 1641 годзе будаўніцтва было распачата. Князёўна ў хуткім часе памерла, але Багдан здзяйсняе сумесна дадзены зарок, цяпер ужо з другой жонкай, з Ганнай. Для гэтага яны ў 1643 годзе здаюць у арэнду маенткі Пагост і Лунін на чатыры гады пінскаму габрэю Лайзеру Сімшычу за чатыры тысячы польскіх

злотых. У 1648 годзе паненскі манастыр быу пабудаваны. За год да таго арэнда маёнткаў Пагост і Лунін была скончана, а ў 1649 годзе Багдан і Ганна ажанілі сваіх дзяцей ад першых шлюбаў паміж сабою. Кацярына Гарайская (унучка Кацярыны Гарайскай-Радзівілавай) дароўным запісам перадала ў Аршанскім земскім судзе мужу Міхаілу-Уладзіміру Статкевічу спадчынныя па бацьку маёнткі Пагост, Лунін, Парахонск, а ён, у сваю чаргу, запісаў ёй 60 тыс. зл. на ўласных маёнтках Баркулабава і Буйнічы Аршанскага павету. Напачатку ў іх складвалася ўсё добра, а скончылася трагічна для ўсіх. Міхаіл-Уладзімір, сын кашталяна навагрудцкага Багдана Статкевіча, унук князя Саламярэцкага, амаль адразу пасля шлюбнай цэрэмоніі стаў удзельнікам паўстання Багдана Хмяльніцкага на баку казакоў. Паўстанне было падаўлена ў тым жа 1649 годзе Янушам Радзівілам, а частка маёнткаў (у тым ліку Пагост) была секвестравана, то бок пазбаўлена дзяржаўных сродкаў на кампенсацыю панесеных страт ад казакаў. Сучаснік Міхаіла-Уладзіміра Альберт Віюк-Каяловіч занатаваў, што Статкевіч перад смерцю стаў манахам. Не змог перажыць такой трагедыі бацька Багдан, ды і жонка Кацярына. А дачка Кацярыны і Міхаіла-Уладзіміра, таксама Кацярына, памерла сіратою ў падлеткавым узросце, у 1663 годзе. Такім чынам, на ёй канчаткова перарвалася лінія нашчадкаў Пятра і Кацярыны, народжаных князёўнай Гарайскай (Радзівілавай).

Ганна Францкевіч-Радзімская дароўным запісам ад 27.01.1664 г. (актыкаваным 11.06.1664 г. ужо без

яе, памерла яна ў Пагосце) фактычна адмовілася ад сваіх правоў на маёнткі на карысць дачкі Крысціны Статкевіч і зяця Мікалая Іванавіча Друцка-Любецкага, перадаўшы ім застаўныя ад Пятра Гарайскага на маёнткі Пагост, Лунін і палову маёнтка Любавічы ад Багдана Статкевіча. (30, с. 339-340)

Князь Багуслаў Радзівіл заявіў аб намеры вярнуць Лунін і Пагост. Багуслаў – сын *Януша*, стрыечнага брата Юрыя, які тэстаментам адпісаў гэтыя маёнткі *Янушу і Крыштафу*. На стан 1664 году ад роду Крыштафа Радзівіла засталася толькі ягоная ўнучка Ганна Марыя, стрыечная пляменніца Багуслава, з якой ён і пабраўся шлюбам. (18, с. 487) Тым самым Багуслаў у судзе прадстаўляў маёмасныя прэтэнзіі як патомак братоў *Януша і Крыштафа.* Заява ў суд матывавалася тым, што не засталося ніводнага прамога нашчадка Кацярыны Гарайскай (Радзівіл), роднай сястры Юрыя Радзівіла, тэстамент якога ёю быў станоўча аспрэчаны ў судзе. Апрача таго, Багуслаў Радзівіл не прызнаваў сапраўднасці запісу Кацярыны Гарайскай свайму мужу Статкевічу маёнткаў Лунін і Пагост. Такім чынам, Багуслаў быў адзіным нашчадкам Радзівілаў сваёй галіны, і толькі ён меў законныя правы на атрыманне ў спадчыну тых маёнткаў.

Крысціна Статкевіч і Мікалай Друцка-Любецкія пачалі сваё сумеснае жыццё з судовых працэсаў. Справа была скончана толькі ў 1668 годзе на карысць Друцка-Любецкіх. Пакуль скончана. Для Крысціны і Мікалая скочана. Радзівілы адновяць барацьбу за некалі свае маёнткі Пагост, Лунін і

Парахонск у 1754 годзе. Канчатковае рашэнне на карысць Друцка-Любецкіх будзе прынята толькі ў 1779 годзе. Вось толькі пажыць яшчэ маладым (абодвум яшчэ задоўга да сарака), а ўжо даволі заможным Крысціне і Мікалаю не давялося. Памерлі яны амаль адразу пасля выраку Пінскага земскага суда ад 02.06.1668 г. Ну, а апекунамі сыноў Мікалая і Крысціны амаль адразу пасля завяршэння судзебных працэсаў маёнткі Лунін, а затым Пагост ужо у 1671 годзе, пасля смерці Крысціны і Мікалая, былі застаўлены архімандрыту слуцкаму Феадосію Васілевічу на 9 гадоў.

Але праз 7 гадоў пасля смерці Феадосія апекуны гвалтоўна забралі гэтыя землі ў сястры Ф. Васілевіча Лізаветы, настаяцельніцы Віленскага Свята-Духаўскага Базыльянскага манастыра паненак. (30, с.340-342)

На жаль, Мікалаю і Крысціне так і не давялося пажыць у Пагосце, а шлюбу магла паспрыяць наяўнасць маёнткаў у адным толькі Аршанскім павеце, гэта Відзенічы Друцкіх-Любецкіх і Любавічы Статкевічаў.

Друцкія-Любецкія належалі да сярэднезаможнай шляхты да шлюбу Мікалая з Крысцінай. Нечаканая смерць дачкі, зяця, унучкі, абодвух мужоў, а затым і самой Ганны Францкевіч-Радзімскай зрабіла князя Мікалая Друцка-Любецкага заможным, але ненадоўга. Неўзабаве не стала і яго самога з жонкай. Узнікае ўражанне, што ўслед за Пагостам нібыта хадзіла смерць. Напаткала яна і арэндатараў, – пінскага га-

брэя Сімшыча і архімандрыта Феадосія Васілевіча. (А можа, насамрэч, яе нехта настойліва зазываў?)

Надалей Пагостам валодалі толькі Друцка-Любецкія. Напачатку сын Мікалая і Крысціны Сымон-Даменік, каралеўскі палкоўнік, падстолі і стольнік уладзімірскі, затым стольнік оўруцкі, кашталян мінскі.

# Радавод Пагоста

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1** | **Юрый Радзівіл (Пераможца, ён жа Геркулес)**<br>Вялікі гетман літоўскі (памёр у 1541 г.) | **12.10.1539 г.** | Пагост належыць маёнтку Бобрык Новагародскі павет |
| **2** | **Мікалай Радзівіл (Руды)**<br>ваявода троцкі, вялікі гетман літоўскі | **1541 г.** | Пагост Новагародскі павет |
| **3** | **Мікалай Радзівіл (Руды)**<br>ваявода троцкі, вялікі гетман літоўскі | **1559 г.** | Пагост Новагародскі павет |
| **4** | **Мікалай Радзівіл (Руды)** | **1567 г.** | маёнткі Пагост, Бобрык |
| **5** | **Мікалай Мікалаевіч**<br>лоўчы літоўскі, ваявода новагародскі | **1584 г.** | таксама, Пагост у Пінскім павеце |
| **6** | **Радзівіл Юрый Мікалаевіч**<br>кашталян троцкі, унук рудага | **1589-1613 г.** | маенткі Пагост, Лунін, Бобрык, Хатынічы |
| **7** | **Януш і Крыштаф Крыштафавічы Радзівілы**<br>стрыечныя браты Юрыя Мікалаевіча | **1613 г.** | маенткі Пагост, Лунін, Бобрык, Хатынічы |

# Радавод Пагоста

| | | | |
|---|---|---|---|
| 8 | **Петр і Крыштаф Гарайскіе (Радзівілы)**<br>пляменнікі Юрыя Мікалаевіча Радзівіла, дзеці... | **1614 г.** | маенткі Пагост, Лунін, Бобрык і Хатынічы |
| 9 | **Петр Гарайскі і Ганна Францкевіч-Радзімінская** | **1633 г.** | маенткі Пагост, Лунін і Парахонск |
| 10 | **Ганна Францкевіч-Радзімінская** | **1636 г.** | маенткі Пагост і Лунін |
| 11 | **Ганна Францкевіч-Радзімская і Багдан Вільгельмавіч Статкевіч** | **1642 г.** | маенткі Пагост, Лунін, Парахонск, Любавічы |
| 12 | **Арэнда пінскаму габрэю Лейзеру Сімшычу** | **1643-1647 г.** | маенткі Пагост, Лунін |
| 13 | **Кацярына Пятроўна Гарайская (Радзівіл) і Міхаіл-Уладзімір Багданавіч Статкевіч** | **1649 г.** | маенткі Пагост, Лунін, Парахонск, Баркалабава і Буйнічы |
| 14 | **Кацярына Міхайлаўна-Уладзіміраўна Статкевіч (Радзівіл)** | **1663 г.** | маентак Пагост і інш. |
| 15 | **Ганна Францкевіч Радзімінская** | **1664 г.** | маентак Пагост і інш. |

# Радавод Пагоста

| | | | |
|---|---|---|---|
| **16** | **Мікалай і Крысціна Друцка-Любецкія** | **1664 г.** | маёнткі Пагост, Лунін, Парахонск, Любавічы, Відзенічы. |
| **17** | **Арэнда архімандрыту слуцкаму Феадосію Васілевічу** | **1671-1678 г.** | маентак Пагост |
| **18** | **Сымон-Даменік і Францішка (Копець) Др.-Люб.** стольнік уладзімірскі, кашталян мінскі | **1690 г.** | маентак Пагост і інш. |
| **19** | **Юзаф і Дарота (Асалінская) Др.-Люб.** | **1725 г.** | маентак Пагост і інш. |
| **20** | **Францішак і Генафена (Алізар) Др.-Люб.** суддзя земскі, харужы, маршалак, кашталян мінскі, князь | **1755 г.** | маенткі Пагост і інш. |
| **21** | **Ануфры Друцка-Любецкі** маршалак Пінскага павета, стацкі радца | **1806 г.** | маентак Пагост, в.Данілаука, Бакінічы |
| **22** | **Францішак-Ксаверы (Ксаверы) і Марыя Др.-Люб.** міністр фінансаў Каралеўства Польшчы, сапраўдны таемны радца Расейскай імперыі. | **1818 г.** | маёнтак Пагост (з в. Камень і в. Боркі) першае ўпамінанне вескі Боркі |

# Радавод Пагоста

| | | | |
|---|---|---|---|
| **23** | **Марыя Юзафаўна (Сцыпіён-дэль-Камп) Др.-Люб.** | **1856 г.** | маёнтак Пагост і вёскі |
| **24** | **Аляксандр-Медард-Ксаверы-Францішак і Марыя-Філіцыя (Шэмет) Друцка-Любецкія** | **невядома.** | маёнтак Пагост і вескі |
| **25** | **Уладзіслаў-Францішак-Ксаверы-Антоні-Мар`ян і Марыя-Ігана (Замойская) Др.-Люб.** | **1868 г.** | маёнтак Пагост Загародскі з лесапільным заводам і інш. маёнткі |
| **26** | **Марыя-Ігана Замойская** | **1913 г.** | тое самае |
| **27** | **Яніна-Ядзвіга-Станіслава-Марыя-Людвіка-Юзэфа**<br>унучка Ксаверыя і Марыі, апошняя ўладальніца Пагоста, Каменя і Борак | **да 1939 г.** | |
| **28** | **Пагост стаў дзяржаўнай маёмасцю** | **з 1939 г.** | |

# 7. Наша родная мова

На якой мове размаўлялі нашыя продкі, ліцвіны Вялікага княства Літоўскага? На якой мове размаўляюць цяпер беларусы віцебшчыны, магілёўшчыны, гомельшчыны, міншчыны, а таксама жыхары Палесся, ды і наогул усе заходнія беларусы? На гэтыя пытанні вельмі шмат чаго можна пачуць у адказ ці знайсці ў кніжках. І амаль усе адказы будуць супярэчлівыя. Дык што ж гэта за мова такая ці, можа, нават не адна, на якой мы размаўляем цяпер і некалі размаўлялі нашыя продкі?

У кніжцы Уладзіміра Арлова "Краіна Беларусь" на стар. 167 ёсць такія словы (пачатак цытаты). Падкрэсліваючы значнасць дзяржаўнай беларускай мовы, у прадмове да Статута Леў Сапега з гонарам адзначаў: "А еслі катораму народу ўстыд праў сваіх не ўмеці, пагатоў нам, каторыя не обчым якім языком, але сваім уласным правы спісаныя маем і кождага часу, чаго нам патрэба ку адпору ўсякае крыўды, ведаці можам" (канец цытаты). (2, с. 167) Прачытаўшы ўпершыню прадмову Сапегі, я не ўсе словы зразумеў. Трэба прачытаць некалькі разоў, каб аб'яднаць усё напісанае ў адну думку адразу. Але тое, што ў тэксце ёсць словы нашыя, беларускія, сумневу не вызывае. Надалей я прачытаў вельмі шмат кніг часу ВКЛ, гэта выданні "Археографической комиссией для обозрения архивов Западного края России", якая была створана ў 1837 годзе. Матэрыялы (метрыкі), якія засталіся пасля ліквідацыі нашай

краіны ВКЛ, аб'ядноўваліся камісіяй па тэмах і выдаваліся асобнымі тамамі. Дык вось, тамоў было выдадзена шмат як на старапольскай, так і на старабеларускай мове, адаптаванай да цяперашняй нашай. Кніжкі гэтыя з цяжкасцю, але чытаць і разумець можна. Уражвае тое, што большасць слоў там на першы погляд рускамоўныя. Паўстае пытанне, чаму гэтую тагачасную мову называюць старабеларускай і дзяржаўнай? Адказ на гэта ў кніжцы "Забытая Беларусь" дае Вадзім Дзеружынскі. Ён называе памылковай пазіцыю тых даследчыкаў, якія лічаць "старабеларускай" мову Статутаў ВКЛ, складзеных у XVI стагоддзі. Гэтая мова была перанята ад Кіева для вядзення дакументацыі ў ВКЛ і была "канцэлярскай", пісьмовай мовай, але ніяк не тагачаснай гаворкай. Кіеў у сваю чаргу ўзяў гэтую мову з царкоўнаславянскай, ад Кірыла і Мефодзія, перакладчыкаў Бібліі. Нашыя продкі-сяляне ніколі не размаўлялі на царкоўнаславянскай мове, якой карысталіся толькі на ўзроўні дзяржаўнай мовы, у якую ў працэсе карыстання трапіла даволі многа слоў з нашага абіхода. Менавіта гэтак жа сяляне-палякі (ляхі і мазуры) ніколі не размаўлялі на царкоўналацінскай мове, каторую выкарыстоўвалі толькі для напісання дакументаў таго часу. Мова Бібліі ў тыя часы лічылася свяшчэннай і адзіна магчымай для карыстання пры напісанні. З гэтым нельга не пагадзіцца, але не ўсе метрыкі, дакументы часу ВКЛ пісаліся "канцэлярскай" пісьмовай "старабеларускай" мовай. Усё залежала ад таго, хто пісаў той дакумент. Напры-

клад "аўтарамі напісання" актаў аб копных судах (59) былі і простыя людзі, якія запісвалі ў журналы скаргі менавіта на той мове, на якой размаўлялі. У некаторых важных дакументах таго часу, нават у караля (вялікага князя) ёсць словы, якімі карыстаюцца па сённяшні жыхары сёл Пагосчыны (Камень, Боркі, Чухаў, Ботаў і інш.). Напрыклад: …**і тэж** (26), **сокіра** (64, с. 191), **чому** (68, с. 435), **небэзпэчность** (69, с. 381), **чобаты** (46, с. 201), **вышнёвый** (67, с. 381) і іншыя.

Праз некаторы час я звярнуў увагу на т. н. слоўнікі ў канцы амаль кожнага тома Актаў Віленскай камісіі. Там ёсць пераклад, ці тлумачэнні, некаторых тагачасных, ды і цяпер незнаёмых нам слоў. І гэтыя слоўнікі вельмі патрэбныя былі не толькі на час выдання кніжак, але нават цяпер, у наш час, калі многія словы ўжо забыліся, бо на працягу многіх пакаленняў не ўжываліся, а друкаваліся тыя кніжкі напрыканцы XIX стагоддзя. Але ў тых слоўніках ёсць пераклад і тлумачэнне такіх слоў, што вызывае вялікае здзіўленне, і паўстае пытанне, ці не жарт гэта? Прывяду прыклад неабходнага, на мой погляд, пераклада слоў (1), і пераклада вельмі знаёмых слоў (2), наяўнасць якога выклікала ў мяне здзіўленне (выбарка зроблена так, як у арыгінале – на русском языке) :

1.

**Аркабуз** – ружьё, **ачкольвек** – хотя, **агнусек** – крестик, **ачесь** – хотя, **барбер** – цирульник, **борць** – улей, **братанич** –племянник, **бурсник** – сотова-

рищ, **восполок** – сообща, вместе, **втручанье** – вмешательство, **дядько** – дядя, **горло** – то же, что голова, жизнь, **дядкович** – двоюродный брат, **дякло** – подать хлебом, сеном, **жадный** – ни один, **кляча** – лошадь, **комисар** – пограничный судья от короля, **кушнер** – скорняк, **острога** – шпора, **пак** – снова, опять, **посполитый** – общий, **потуль** – до сих пор, **потужник** – товарищ, **похвалиться** – угрожать, **сагайдак** – калчан для стрел, **пята** – угол, образуемый границами земли, **ручница** – ружьё, **чимбур** – верёвка, **тастамент** – духовное завещание, **уфала** – постановление, **цинш** – арендная плата, **плюта** – ненастье, **лонский** – прошлогодний, **лиозный человек** – бродяга, **чекан** – оружие (молоток), **позитив** – малый переносной орган (употреблялся в униатских церквях).

2.

**Аж** – даже, **баламутство** – враньё, **бачить** – видеть, **бервенье** – брёвна, **блокитный** – голубой, **борона** – земледельческое орудие, **боты** – сапоги, быдло – скот, **важить** – весить, **вартовать** – наблюдать, **вдячно** – с благодарностию, **веселье** – свадьба, **винен** – должен, **вышки** – чердак, **ганить** – осуждать, **ганок** – крыльцо, **гвалт** – насилие, **гоман** – крик, **громницы** – праздник Сретения Господня, **гумно** – строение для молотьбы и хранения хлеба, **гурба** – куча, **друкарня** – типография, **дежка** – кадка, **жито** – рожь, **заорати** – вспахать, **зброя** – доспех, **вооружение**, зведомо – известно, **згода** – согласие, **злочинец** – преступник, **клуня** – молотиль-

ный сарай, **купалье** – канун Иванова дня 23 июня, **колнер** – воротник, **кликать** – кричать, **опошний** – последний, **коваль** – кузнец, **коледа** – подояния духовным лицам в праздник Рождества Христова, **коляды** – сочельник перед Рождеством Христовым, **кошик** – корзина, **лазня** – баня, **ланцужок** – цепочка, **кухар** – повар, **лихтар** – подсвечник, **летошний** – пршлогодний, **млын** – мельница, **насенье** – семя, **невестка** – жена сына, **нетубылец** – не местный, **обачить** – увидеть, **орать** – пахать, **отказ** – ответ, **папер** – бумага, **пёс** – собака, **пильновать** – сторожить, **плот** – забор, **провизия** – запас продовольственных припасов, **подстригач** – цирульник, **позычить** – занять, **полепшить** – улучшить, **попадья** – жена священника, **поп** – священник, **посаг** – приданное, **пуга** – кнут, **пытанье** – вопрос, **поплечник** – сосед, **потужники** – товарищи, **пуня** – сарай для сена, **рахунок** – счёт, **роля** – пашня, **ручник** – полотенце, **свариться** – ссориться, **свирен** – амбар, **свято** – праздник, **себровать** – иметь что нибудь общее, **скарб** – казна, **скриня** – сундук, **сорочка** – рубашка, **страва** – кушанье, **страта** – потеря, **стреха** – крыша, **студня** – колодзезь, **сукня** – платье, **счастный** – счастливый, **секира** – топор, **сеножать** – сенокос, **сябр** – товариш, **твар** – лицо, **торг** – базар, **толока** – помощь, **троха** – немного, **тын** – забор, **уживать** – пользоваться, **умова** – условие, **филя** – минута, **хоругвь** – отряд войска, **хиба** – разве, **хороба** – болезнь, **хоромы** – дом, **фурман** – извозчик, **футро** – мех, **хустка** – платок, **частовать** – угощать,

**черга** – очередь, **шибеница** – виселица, **шкодник** – человек, причинивший убытки, **шурин** – муж сестры, **яриво** – яровой хлеб.*

Як вы разумееце, гэта далёка не ўсе словы, а толькі некаторыя з чатырох тамоў. Але іх дастаткова, каб зразумець, па-першае, што амаль усе гэтыя словы з нашай сучаснай беларускай мовы. Адрозніваюцца яны нязначна і толькі тым, што нібыта нехта напісаў іх рускім шрыфтом на расійскі манер, і гэты нехта вельмі рускамоўны чалавек, то бок зусім не ведаючы беларускай мовы. Але гэта нішто іншае, як пранікненне слоў з нашай мовы, на якой размаўлялі нашыя продкі, у мову канцылярскую, дзяржаўную на той час, то бок царкоўнаславянскую, у якой гэтых слоў не хапала для апісання нейкай з'явы ці думкі.

Ну а па-другое, можна таксама зразумець тое, што калі ў тагачаснай Расіі выдаваліся кніжкі з літоўскімі метрыкамі на літоўскай = беларускай мове, і ў канцы амаль кожнага тома друкаваліся слоўнікі з перакладам такіх слоў, то гэта камусьці было вельмі патрэбна. І патрэбна, канечне, не нам, ліцвінам = беларусам, як тады, так і цяпер, а менавіта расійскім чытачам. І становіцца зразумелым тое, што расіяне зўсім не ліцвіны = беларусы, а мы, ліцвіны

*Акты, издаваемые виленскою Археографическою комиссиею, том 11, стр. 57-69, том 13, стр. 475-480, том 17, стр. 514-559, том 18, стр. 573-577.

= беларусы, зусім не рускія = расіяне. Зразумелым становіцца, чаму ў першыя гады расійскай улады, пасля ўвядзення рэкруччыны, з нашых людзей фарміравалі асобныя войскі, і ў кожнага афіцэра быў перакладчык. Нехта ж павінен быў перакладаць гэтыя простыя беларускія словы афіцэру.

Таксама зразумелым становіцца, чаму нашыя людзі, асабліва сяляне, не хацелі пераходзіць у расійскую праваслаўную царкву, у якую іх, насамрэч, заганялі сілаю. Святары з Расіі не разумелі нашай мовы, а нашыя сяляне не разумелі мовы расійскай біблііі. Прыхажанам вельмі важна разумець літургію, а споведзь святару гэта важнейшы рытуал у царкве. Навошта спавядацца такому святару, які не разумее, аб чым ты гаворыш? Таму нашыя продкі напачатку сталі з забароненага ўніяцтва пераходзіць у непрывычны для іх каталіцызм, а не ў расійскае праваслаўе. У касцёле святары разумелі сялянскую, то бок ліцвінскую мову. Для нашага селяніна ўніяцкая царква нічым, акрамя роднай мовы, не адрознівалася ад РПЦ. І калі ў РПЦ сталі служыць нашыя святары, людзі пачалі вяртацца ў праваслаўе. Прыкладам таму можа служыць змена веравызнання маіх продкаў, ды і продкаў многіх пагасчан. Так, мой прашчур Мацей, ягоная жонка Ганна, іхныя дзеці Іван і Агаф'я, таксама жонка Івана, народжаная Еўдакія Саковіч, муж Агаф'і Міхайла Пабітоўскі, як і ўсе, больш за 200 сем'яў пагасчан на стан 1750-1776 гг., былі ўсе ўніятамі. З 1795 г. па 1862 г. нікога з маіх продкаў у метрыках РПЦ не знойдзена, а гэта

можа значыць, што Янковічы ўвесь гэты час былі каталікамі. А гэта тры пакаленні. Аб гэтым сведчыць факт рэгістрацыі шлюбу Янковіча Язэпа ў РПЦ, дзе ён адзначаны як *рымска-каталіцкага спавядання*. І толькі праз год, у 1863 годзе, калі ў яго нарадзіўся сын Філіп, Язэп быў ужо па царкоўнай рэгістрацыі запісаны *праваслаўным*.

На прасторах інтэрнету на розных сайтах вядуцца спрэчкі аб тым, на якой мове размаўлялі ліцвіны, і якая мова ў ВКЛ была дзяржаўная. Удзельнікі спрэчак – літувісы, расіяне і беларусы. Праглядваючы іх спрэчкі, так і хочацца сказаць, каб яны зазірнулі хоць бы ў адзін том Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі, напрыклад, у XVII, і напрыканцы яго праглядзели "указатель предметов и некоторых старинных слов", а затым параўналі гэтыя словы з беларуска-рускім слоўнікам. Упэўнены, што пасля гэтага спрачацца не будзе аб чым. На першый погляд, у тэкстах кніжкі вельмі шмат нібыта рускамоўных слоў. Тады навошта слоўнік?

У сувязі з гэтым успамінаецца адзін выпадак, які адбыўся з адным маім добра знаёмым расіянінам з Расіі. Ён гадоў ужо дзесяць ці пятнаццаць, як ажаніўся на нашай дзяўчыне, купіў добрую хату і жыве каля Брэста. Дык вось, мы неяк доўга размаўлялі з ім пра розныя рэчы (нам заўсёды прыемна абмяркоўваць усё, што адбываецца вакол нас), і я, тым часам, выразіў сваё спачуванне аб тым, што з беларускага тэлебачання і радыё амаль знікла нашая родная мова. Я ніяк не чакаў ад яго зусім про-

цілеглага погляда на гэты конт. Ён мне сказаў, што вельмі ўзрадаваўся, калі гэта адбылося, бо, як ён прызнаўся, абсалютна нічога не разумее ні па-беларуску, ні па-ўкраінску, ні па-польску. Жыве амаль пятнаццаць год у Беларусі з жонкай беларускай, мае дачку напалову беларуску і дагэтуль зусім не разумее такую простую нашую мову, якая, на наш погляд, вельмі падобная на рускую, украінскую і польскую. Аказваецца, усе гэтыя мовы для расіяніна чужыя. Мы ж, беларусы, нават пачуўшы ўпершыню ў жыцці ўкраінца ці паляка, можам зразумець адзін аднаго. І руская мова для нас зусім не чужая. Абсалютная большасць беларусаў карыстаюцца ёй намнога больш, чым сваёй, беларускай. Значыць, насамрэч, мы, беларусы, украінцы, палякі – абсалютна розныя народы з расіянамі.

Тое, што ўсходнія вобласці Беларусі размаўляюць амаль на чыстай літаратурнай сучаснай мове, мне супярэчыць ніхто не стане. Дастаткова заехаць у Віцебск, Магілёў ці Гомель, і ўжо на вакзале, а тым больш у трамваі альбо аўтобусе прыходзіць паразуменне таго, што ты апынуўся ў прыгожай, прыемнай, пяшчотнай, роднай Беларусі. Там усюды пануе наша беларускасць. Усюды і ва ўсім. Першае, што прыемна ўражвае, гэта прыгожая беларуская мова. З усіх канцоў прыемна льецца пяшчотная гаворка ад ветлівых, гучных, як у сяле, людзей. Вельмі прыемна нешта запытаць у іх і сачыць за тым, як яны адразу, быццам даўно чакалі твайго пытання, адрываюцца ад сваіх тэм і падрабязна, зычліва, дапаўняя

адзін аднаго, вытлумачываюць намнога больш таго, аб чым ты запытаў. Толькі дзеля гэтага трэба хоць некалі ездзіць у гэтыя рэгіёны.

Ну а што ж з нашай заходняй гаворкай, на Брэстчыне, Піншчыне і, дарэчы, Пагосчыне? Каб адказаць, якая мова тут пануе, трэба правесці маленькае даследаванне. У 2016 годзе, каб праверыць, ці наш прадзед Філіп на фатаздымку, зробленым палякамі ў 1937 годзе, нам з братам Мікалаем прыйшлося апрасіць каля дзесяці барэцкіх старажылаў. Я гэта рабіў з уключанай фотакамерай, таму даслоўна прывяду некаторыя фразы, вымаўленыя імі так, як я пачуў:

*Ходзітэ ў хату. Коб жэ я бачыла. Гэто ж не Андрый?* Пожды, *то можэ хіба дзід гэто? Надзя мусыць з трыццаць другого.* Хазяін быў харошы. *Штыры дзіўкі було. Мы як выбралыса на хутора, то вон мусыць скоро помэр ужэ. Гэбы ёго хата.* От і *зараз хата гэта стоіць. Навэць і була школа ў ёго хаці. Школа ў сэлі була. Коб жэ я бачыла. Тэпэр грушы стояць* обіі. *Жывэ ў Смаленску.*

А цяпер я зусім нязначна падправіў толькі падкрэсленыя буквы, і глядзіце, што адбылося: *Хадзіце ў хату. Каб жа я бачыла. Гэта ж не Андрэй? То можа хіба дзед гэта? Надзя мусіць з трыццаць другога. Чатыры дзеўкі было. Мы як выбраліся на хутары, то ён мусіць памёр ужо. Як бы яго хата. От і зараз хата гэта стаіць. Нават і была школа ў яго хаце. Школа ў сяле была. Каб жа я бачыла. Цяпер грушы стаяць… Жыве ў Смаленску.* … (…**пожды** = подожди,

**гэбы** = гэ+бы (гэ = ага, па-руску = да). **Гэбы** = як быццам, па-руску вроде да. **Обіі** = обе па-руску, **обіі** = абедзьве, хазяін = гаспадар, харошы = добрый.)

Я так мяркую, што ў аснове тут нашая літаратурная беларуская мова. Акрамя нашых беларускіх слоў, тут ёсць рускамоўныя, і ўсё гэта акцэнтавана нібыта на украінскі лад.

Аднойчы я быў сведкам такога цікавага выпадка. Да мяне ў кватэру завіталі калегі, дырэктар фабрыкі з Роўна і галоўны інжэнер брэсцкага камбінату. У мяне за сталом яны пазнаёміліся. Брэсцкі мой сябар вырашыў паразмаўляць з украінскім калегай на сваім сельскім дыялекце, якім бліскуча валодаў. Але мой сябар з Роўна не зразумеў яго, ну зусім. Для мяне і майго брэсцкага калегі было вялікім адкрыццём, што наша сельская мова зусім не ўкраінская, як мы лічылі. Мой брэсцкі сябар толькі разгублена вымавіў, што ў памежным Ратна размаўляюць гэтак жа, і ён быў упэўнены, што іх сялянская гаворка і ёсць украінская. А вельмі многія лічаць так і зараз, называючы яе "*хахольскай*".

Мова барэцкіх жыхароў – нішто іншае, як наша беларуская мова. Акрамя таго, гэта менавіта тая мова, на якой здаўна размаўлялі пагасчане, бо барэцкія людзі амаль ўсе прыйшлі з Пагоста напачатку дзевятнаццатага стагоддзя. Калі сказаць больш дакладна, то амаль палова сямей пагасчан, адзначаных у рэвізкіх казках 1811 года, апынуліся ў Борках, згодна рэвізкім казкам 1834 году. Менавіта тыя пагасчане і пабудавалі Боркі, якія напачатку былі Паго-

стам у тым жа 1811 годзе. Дарэчы, самая старэйшая жыхарка Борак, а яна з 1923 года, распавяла нам гісторыю стварэння Борак, якую яна памятае ад сваіх дзядоў. У Мікалаеўскую вайну, то бок Напалеонаўскую, раз'юшаны за нешта пагосцкі пан вывез некалькі пагосцкіх сямей у лес, а дакладней у Чырвоны бор са словамі: "Вось тут і жывіце". Адсюль і пайшла назва сяла *Боркі*. Дарэчы, у нашым сельсавеце захоўваецца архіў, у якім сяло ў 1947 годзе так і называлася *Чырвоныя Боркі*. Так што мова, быт, традыцыі, ды амаль усё боркаўскае гэта насамрэч старажытнае пагосцкае. Ну а 200 гадоў для мовы зусім не многа, каб застацца нязменнай. Баркаўчане захавалі мову такой, на якой размаўлялі нашыя продкі пагастчане, можа, нават з пачатку ўзнікнення Пагоста. Не толькі яны, а і жыхары Каменя, Ботава, Чухава і ўсіх сёл нашага Пагосцкага, ды і Пінскага края і ўсёй нашай заходняй часткі Беларусі размаўляюць менавіта на нашай ліцвінскай = беларускай мове, якая вельмі мала, аказваецца, адрозніваецца ад мовы ўсходняй часткі Беларусі. Трэба толькі ўважліва разглядзець і зразумець, што заходнія і усходнія гаворкі гэта ўсё наша мова.

У сувязі з гэтым не магу не ўспомніць і не распавесці пра сваіх бацькоў.

Мой бацька, Янковіч Аляксандр Мікалаевіч, нарадзіўся ў Борках, у заможнага селяніна. Карані яго ў Пагосце. Ён восьмы ад Мацея. Яго родная мова барэцкая. Ён закончыў чатыры класы польскай школы ў Пагосце да 1939 года. Школа размяшчала-

ся на той час у будынку, што на ўзгорку каля царквы. Пасля вайны там доўгі час была чайная, а потым рыбная крама. Пасля фронту бацька працаваў у камсамоле, затым быў партыйным работнікам і старшынёй сельскага савету ў Пагосце. Ён атрымаў сярэднюю адукацыю ў вячэрняй школе яшчэ ў Лагішыне, пачаўшы навучацца там з восьмага класу.

Мая маці, Сільвановіч Марыя Васільеўна, нарадзілася ў сяле Вялікі Поўсвіж, што каля Лепеля Віцебскай вобласці. Бацька ў яе быў старшынёй калгаса, а затым сакратаром сельскага савета. Маці скончыла пасля вайны Лепельскае педвучылішча і была накіравана на працу ў Лагішын. Усё сваё жыццё маці працавала настаўніцай пачатковай школы. Яна выкладала ўсе прадметы з першага па чацвёрты клас толькі на беларускай мове. Мне пашанцавала, яна была маёй першай настаўніцай. Ну, а цяпер аб тым, што я хацеў распавесці.

Мой бацька заходні беларус са сваім веданнем мовы сялянскай, то бок "хахляцкай", і з вячэрняй сярэдняй адукацыяй, прычым з правалам паміж трэцім і восьмым класамі. А жонка была ў яго больш адукаваная. Мая маці, як і ўсе настаўнікі таго часу, улетку складала гадавыя планы па выкладанню кожнага прадмету, а затым кожны дзень пісала планы на вядзенне кожнага ўрока, нават спеваў і фізкультуры. Яна ні аднаго разу не ішла на працу без плану, у якім распісваліся ўсе урокі згодна перспектыўнага гадавога плану. Гэтыя кажнадзённыя планы яна пісала ў самым канцы дня, калі ўсе ра-

боты пароблены, мы, дзеці, ужо спалі і нічым ёй не заміналі. Мог не спаць толькі бацька і калі-нікалі выпадкова я. У кожнага быў свой пакой, але на тое яна і сялянская хата, каб было ўсё чутна, калі хочаш і нават калі не хочаш. Маці часта звярталася да бацькі з пытаннем, як тое ці іншае рускамоўнае слова будзе гучаць на беларускай мове. І што ўражвала мяне, бацька заўжды знаходзіў патрэбнае слова па-беларуску. Гэта ўражвае мяне да цяперашняга часу, тым больш, што я ніколі не чуў, каб ён хоць калі-небудзь размаўляў па-беларуску. Дарэчы, я ніколі не чуў, каб ён размаўляў па-барэцку. Да нас прыходзілі розныя людзі з сёлаў, часта прыходзілі сваякі і родныя. Яны гутарылі на розныя тэмы пры розных абставінах, прычым субяседнікі заўжды на сялянскай мове, а бацька з імі толькі на сучаснай пагосцкай, а яна больш руская і ніяк не беларуская. Да іх гутаркі далучалася мая маці, прычым размова праходзіла з боку маці гэтак жа, на пагосцкай мове, а мову барэцкую = сялянскую яна разумела надзвычайна. Гэтакі феномен майго бацькі як "перакладчыка", а маці як "паліглота" тлумачыцца вельмі проста. Абсалютна ўсе гаворкі, якімі карысталіся калісьці і карыстаюцца цяпер жыхары розных куткоў Беларусі – усё гэта нашая беларуская мова.

На заканчэнне тэмы пра нашую мову хочацца падзяліцца яшчэ адной прыкметай адметнасці, тым самым жывучасці нашай беларускай мовы. Я маю на ўвазе мову памежных тэрыторый усіх нашых суседніх дзяржаў. Амаль ва ўсім свеце жыхары памежных

тэрыторый разумеюць адзін аднаго, бывае, што іх мова можа быць адна агульная, нібыта складацца з абедзьвух моў, а часцей мова адной краіны дамінуе настолькі, што становіцца асноўнай у памежжы. На нашых памежных тэрыторыях такога ўплыву на нашу мову амаль нідзе няма (за выключэннем гродненска-польскага памежжа), і я мяркую, вось чаму. З самага пачатку ўтварэння нашай дзяржавы ВКЛ да яе мелі вялікія тэрытарыяльныя дамаганні як Масковія = Расія, так і каралеўства Польскае. Не стану зараз пераказваць гісторыю ўсіх нашых узаемаадносін на працягу больш чым пяцісот год, у выніку якіх на землях старажытнай Літвы (гістарычнай Беларусі) размяшчаецца цяпер не толькі Беларусь, але і Літува, Латвія, Беластокскае і Люблінскае ваяводствы Польшчы, Пскоўская, Цвярская, Смаленская і Бранская вобласці Расіі, а таксама Украінская частка Палесся. А гэта значыць, што ў гэтых рэгіёнах жылі, ды і цяпер, магчыма, жывуць яшчэ продкі той нашай Літвы, якія некалі размаўлялі на нашай мове. Яны дагэтуль калі цалкам не выкарыстоўваюць яе, то прыкметны характэрны адбітак у іх гаворцы застаўся.

Так, у выпадку, апісаным вышэй, зразумела, чаму памежжа Украіны, то бок жыхары г. Ратна, размаўляе на нашай сялянскай мове, якую не разумеюць у г. Роўна.

У часы "перестройки" амаль кожнаму з нас давялося пабываць у Польшчы на базарах і ўпэўніцца, што ў іх памежжы гаворка нашая, сялянская, якую палякі з Варшавы наўрад ці разумеюць наогул.

Ну, а наконт расійскага памежжа, то беларускасці там, бадай, не менш, чым у нашых усходніх рэгіёнах, асабліва на смаленшчыне, дзе мне давялося бываць. Я, будучы студэнтам, гуляў на вяселлі ў адным сяле, да якога на цягніку з Віцебску мы ехалі гадзіны тры. Гаворка ў тым сяле нічым не адрознівалася ад гаворкі сёл віцебшчыны, у якіх мне таксама даводзілася бываць улетку на працягу чатырох гадоў па нагодзе студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

Пранікнення суседніх моў у нашую беларускую мову ў памежных тэрыторыях не адбылося, а наадварот нашая мова распаўсюдзілася і жыве ў памежных тэрыторыях нашых суседзей. Другая справа, што беларуская мова знікае ў нашай дзяржаве адусюль: з тэлебачання і радыё, са школ і ўсіх іншых навучальных устаноў міністэрства адукацыі, з усіх дзяржаўных структур і ўвогуле з нашага жыцця. Гісторыя паўтараецца. У XVII-XVIII стагоддзях сярод нашай шляхты панавала *пальшчызна*, цяпер распаўсюдзіўся *русізм*. Справа дайшла вельмі далёка, і нашай мове пагражае поўнае знікненне. Чаму гэта адбывалася раней і адбываецца цяпер? Прычын тут шмат, гэта і палітычны і эканамічны фактары, але ёсць яшчэ моцны складнік гэтай з'явы – нашая грамадзянская пазіцыя. У нас, беларусаў, не прачнулася па-сапраўднаму любоў да нашай краіны, да нашай гісторыі, да нашай роднай мовы, якая лічылася некалі самай мяккай і прыгожай сярод еўрапейскіх моў. Не прачнулася яшчэ ў нас наша беларускасць. Але паразуменне ўжо ідзе. Цікавасць да гісторыі ўжо

пануе ў грамадскасці. Моладзь паціху і патрохі спрабуе размаўляць па-беларуску – значыць, не ўсё згублена. На жаль, на тых людзей, у якіх з'яўляецца жаданне размаўляць на беларускай мове, грамадства глядзяць вельмі падазрона, з асцярогай. Але яны, "беларускамоўныя", насуперак усяму, нібыта бунтаўшчыкі, з'яўляюцца ў нашым асяроддзі. Але, на вялікі жаль, мясцовая палесская гаворка, самая старажытная нашая гаворка, не менш прыгожая, чым літаратурная беларуская мова, існуе толькі ў нашых сёлах. На ёй размаўляюць у асноўным толькі старэйшыя пакаленні, значыць, яна можа хутка знікнуць. Вельмі саромеецца яе наша моладзь, значыць, нешта не так робіцца ў нашай краіне. А некалі нават газеты выходзілі на гэтай палесскай мове.

# Літаратура


1. В.Ф. Исаенко. Неолит Припятского Полесья. Минск "Наука и техника" 1976.
2. Ілюстраваная гісторыя "Краіна Беларусь", тэкст Уладзіміра Арлова, Браціслава, "KALLIGRAM", 2012.
3. Гісторыя Беларусі, т. 1., старажытная Беларусь, Мінск, "Современная школа" "Экоперспектива" 2007.
4. Голубеў В.Ф., Кітурка Г.Ф., Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст., Санкт-Пецярбург "Неўскі прастор" 2014.
5. Тарас А.Е. Краткий курс истории Беларуси. IX-XXI вв., Мінск: Харвест, 2014.
6. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т.1. Каменны і бронзавы вякі / Э.М. Зайкоўскі, У.Ф. Ісаенка, А.Г.Калечыц – Мінск "Беларуская навука" 1997.
7. Вялікі гістарычны атлас Беларусі, том 1, Мінск, "Белкартаграфія" 2009.
8. Акты издаваемые Виленскою археографическою комиссиею., т.XI, акты главного литовского трибунала, Вильна, типография А.Г. Сыркина, 1880.
9. Геродот, История в девяти книгах, книга IV, Мельпомена, Ленинград, «Наука», 1972.
10. Таулай Д.А. Старажытныя дарогі Беларускага Палесся, Мінск, "Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту", 2001.
11. Сардаров А.С. Путетворение: история и культура белорусских дорог, Минск «Беларуская навука», 2009.

12. Жучкевич В.А. Дороги и водные пути Белоруссии, Минск, издательство БГУ им. В.И. Ленина, 1977.

13. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 1., Мінск "Навука і тэхніка" 1982

14. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 7 , Мінск " Навука і Тэхніка" 1986.

15. Верціхоўская В.У., Верціхоўская М.І. Школьны тлумачальны слоўнік, Мінск, "УніверсалПрэс", 2006.

16. Каваленя А.А. Навагрудчына ў гістарычна-культурнай спадчыне Еўропы ( да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы), Мінск " Рыфтур" 2010.

17. ВКЛ энцыклапедыя, т. 1, Мінск, "Беларуска энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", 2007.

18. ВКЛ энцыклапедыя, т. 2, Мінск, "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", 2007.

19. ВКЛ энцыклапедыя, т. 3 дадатак, Мінск, "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", 2010.

20. М.В. Довнар-Запольский. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель. Минск «Харвест» 2015.

21. Сайт Дзяніса Бабаева, https://news.tut.by/culture/548880.html, Беларускае мора.

22. Писцовая книга бывшего Пинского старостваставленная по повелению короля Сигизмунда Августа в 1561-1566 годах, часть 1., Вильна, 1874.

23. Писцовая книга бывшего Пинского старостваставленная по повелению короля Сигизмунда Августа в 1561-1566 годах, часть 2., Вильна, 1874.

24. Писцовая книга Пинскаго и Клецкаго княжеств, составленная Пинским Старостою Станисла-

вом Хвальчевским в 1552-1555 г., Вильна., Типография А. Г. Сыркина, 1884.

25. Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великим княжестве Литовском с присовокуплением грамот и привилегий на входы в пущи и на земли. Вильна., 1867.

26. Акты, относящиеся к истории Западной России. Том III 1544-1587. , Санктпетербург «типография Эдуарда Праца» 1848.

27. А. Грушевский. Пинское Полесье. Исторические очерки. Пинские акты XV-XVI вв., Киев., Типография Императорского Университета св.Владимира., Н. Т. Корчак- Новицкого, 1901.

28. Акт падзелу спадчыннай маёмасці Радзівіламі. НГАБ = Ф. 1733. Воп. 1. Спр. 62. Арк. 209-210 аб

29. Акты Литовской метрики. Т. 1. Варшава, 1897.

30. Глінскі Я.С. Князі Друцка-Любецкія ў канцы XVI-XVII ст. : радавод, маёмаснае становішча, грамадска-палітычная дзейнасць. Архіварыус: Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў. Вып. 14. Мінск НІАБ 2016.

31. Перапіс войска ВКЛ 1528 года, Метрыка ВКЛ, кніга 523, Кніга публічных спраў1, Мінск “ Беларуская навука” 2003.

32. Дакумент аб правах на валоданне маёнткамі Пагост, Лунін, Бобрык, Пінскага павета // НГАБ. – Ф. 694. – Воп.4. – Спр. 2091. – 55 арк.

33. Литовская метрика, отдел первый., Часть третья, Книги Публичных Дел., Переписи войска Литовского., Петроград, 1915, Библиотека «Руниаерс».

34. Дзьячук Р.С., Ваеннае заканадаўства ВКЛ XVI – першай паловы XVII стст.., Беларускі дзяржаўны універсітэт гістарычны факультэт, дыпломная работа, Мінск 2015.

35. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Минская губерния. Часть I., И. Зеленский., Санктпетербург., 1864.

36. Карта определения высоты местности и профиля высот с учётом крывизны земли.,Сайт радиолюбителей Алтайского края, http://www.vhfdx.ru/altitude_map.html

37. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 17., Мінск "Навука і тэхніка" 1998.

38. Рэестр спраў Пінскага гродскага суда за 1660 г. НГАБ = Фонд № 1733- Вопіс № 1- Справа № 1- 534 адв. Арк.

39. В.А. Жучкевич. Краткий топонимический словарь Белоруссии. Издательство БГУ им. В .И. Ленина. 1974.

40. Акты издаваемые Виленскою коммиссиею для разбора древних актов, том XXVIII, акты о евреях, Вильна, « Русский почин», 1901.

41. М. А. Ткачёв. Национальные символы: народ и история. Газета «Советская Белоруссия», 11 и 12 октября 1989 г.

42. Zbior nazwisk Szlahty z Opisem Herbow wlasnych Familiom … w Wielkim Xiestwie Lituwskim. Lublin 1805 "J.C.K. Mci u XX Trinitarzow"

43. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 8., Мінск "Навука і тэхніка" 1987

44. Археографический сборник документов относящихся к истории северо-западной руси издаваемый при управлении виленского учебного округа, т. 6, Вильна 1889 г.

45. Справа аб спрэчцы паміж кн. А. Друцкім-Любецкім і прычтам Пагосцка-Загародскай царквы аб праве валодання ўрочышчам Свірнішча ў маёнтку Пагост Пінскага павета. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 147. – Воп. 3. – Спр. 11390. –Арк. 488 об.

46. Акты издаваемые Виленскою коммиссиею для разбора древних актов, том XVII, акты гродненского земского суда, Вильна, типография А.Г. Сыркина 1891

47. Н.Сліж. Практыка разводаў у ВКЛ у 16-18 стст. Гістарычны альманах. Том 15. Гародня, 2009.

48. Polska, Informator Enciklopedyczny, Panstwowe Wydawnictwo Naukowe, Warszawa 1986.

49. Мапа арабскага географа Аль-Ідрысі ад 1154 году на сайце: Weltkarte des Idrisi vom Jahr 1154 n. Ch., Charta Rogerian

50. Сайт Дзяніса Бабаева, https://news.tut.by/culture/548880.html, Беларускае мора.

51. Дзяржаўны камітэт па маёмасці РБ Рэспубліканская тапанімічная камісія пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Назвы населенных пунктаў Рэспублікі Беларусь. Брэсцкая Вобласць. Мінск, 2009.

52. Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя.Т3, кн. 2. Брэсцкая вобласць.Мінск: БелЭн, 2007.

53. Александр Казак. Погост-Загородский: история местечка в записках «тутэйшага». Витебская областная типография 2015.

54. Міністэрства адукацыі РБ. "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны". Анамастыка Гомельшчыны: назва роднага краю ў тапонімах. Гомель ГДУ імя Ф.Скарыны 2012.

55. Духоўная метрыка вуніяцкай Пагосцкай царквы ад 1750 г. НГАБ = 136-13 -1429 -130 арк.

56. В. Даль. Толковый словарь живаго Великоруского языка. Т.1. С. Петербург 1880.

57. Воспоминания инженера ББоплана. Описание Украины. © Copyright Инженер Боплан (genry@svitonline.com) Размещён 19. 12. 2010. РАН ИС, ФАА РГАДА, НАНУ ИУА и ИВ им. М. С. Грушевского.

58. С.И. Ожегов. Толковый словарь русского языка. 27-е издание, исправленное. Москва, АСТ Мир и образование, 2014.

59. Акты издаваемые Виленскою коммиссиею для разбора древних актов, том XVIII, акты о копных судах, Вильна, типография А.Г. Сыркина 1891.


60. Большой русско-белорусский словарь. П.Д. Купрись, Д.М. Яндальцев. Минск. Харвест, 2015.

61. Вялікі беларуска-рускі слоўнік. П.Д. Купрысь, Д.М. Яндальцаў. Мінск. Харвест, 2015.


62. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 15., Мінск "Беларуская навука " 1966.

63. Матэрыялы Пінскага земскага суда НГАБ = 1777-1 -1 арк. 89-93.

64. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 31., Мінск “Навука і тэхніка” 2011.
65. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 32., Мінск “Навука і тэхніка” 2012.
66. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 2., Мінск “Навука і тэхніка” 1983.
67. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 35., Мінск “Навука і тэхніка” 2015.
68. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 36., Мінск “Навука і тэхніка” 2015
69. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вып. 19., Мінск “Навука і тэхніка” 2000




Мора Герадота (возера Termi) на мапе Аль – Ідрысі.





Рэканструкцыя Беларускага мора мезалітычнага часу.


Фрагмент батальнай карціны «Бітва пад Воршай», на якім выразна відаць бел-чырвона-белыя сцягі нашых рыцараў. Мастак з кола Лукаса Кранаха Старэйшага. 1524–1530 гг.




Бітва пад Воршай 1514 г.



Значок (сцяжок), на старабалцкай мове Чухоў.




Стары Двор. Двор маёнтка Пагост.



Юрый Мікалаевіч Радзівіл (1480 – 1541)



Мікалай Юр'явіч Радзівіл (1512 – 1584)

*Навукова-папулярнае выданне*

**Янковіч** Валерый

# Гісторыя Пагоста

Адказны за выпуск *Алена Пацей*
Карэктар *Наталля Харытонава*

Падпісана да друку 20.07.2018. Фармат 60×84/16.
Папера афстеная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 10,93. Ул.-выд. арк. 6,68.
Наклад 30 асоб. Замова 14802.

12+

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Колорград».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных
выданняў № 1/471 ад 28.07.2015.

Зав. Веласіпедны, 5-904, 220033, Мінск.
www.сегмент.бел

Валерый Янковіч



# Гісторыя Пагоста




ISBN 978-985-596-141-4